Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 22 (4517) 12 чэрвеня 2009 г.

У нумары:

Інтэрнет падпіску не заменіць

Развагі адказнай асобы на актуальную тэму.

Стар. 5

Шэсць прычын не любіць крытыкаў

Дык якая ж задача крытыка: аналіз твора ці яго рэклама?

Стар. 6

Каб не здаралася канфузаў...

Агляд майскіх нумароў часопісаў «Полымя», «Нёман» і «Маладосць».

Стар. 7

Часцінка вялікай гармоніі

Сакрэт нясвіжскай музычнай дынастыі.

Стар. 10

Якуб Колас і дзейнасць ССП БССР

Пясняр надзвычай востра рэагаваў на ўсе праявы пасляваеннага жыцця краіны.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

У Карэліцкім раёне сёмы раз ладзілася свята мастацтваў "Мірскі замак". Яго імпрэзы ўзбагацілі палітру фестывальнага руху, што разгортваецца ў нашых невялікіх гарадах і гістарычных мястэчках па ініцыятыве Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Міхаіла Фінберга. Свята "Мірскі замак-2009" праводзілася пры падтрымцы Міністэрства культуры краіны, Карэліцкага райвыканкама пад старшынствам Віктара Шайбака і Мірскага гарпасялковага савета, які ўзначальвае Іван Пятрушка. Сінтэз класічных мастацтваў — музыкі, жывапісу, дойлідства — і сучаснай навукі напаўняюць атмасферу гэтага фэсту высокай эстэтыкай, надаюць яму інтэлектуальную глыбіню і асветніцка-выхаваўчы сэнс.

Мір і Любоў

Асляпляльна-жоўтыя пад яркім сонцам рапсавыя палі; атласная зеляніна яшчэ павясновому свежай лістоты; чарада ладных дамкоў на мірскіх вуліцах, атуленых кучавымі аблокамі белага бэзу. І ўжо не "сівыя муры" пабітага часам легендарнага замка, а ўрачыстыя і велічныя, абноўленыя сцены ды вежы гэтага унікальнага помніка не толькі беларускай, але і еўрапейскай, і сусветнай гісторыі... Вось самыя першыя згадкі пра сёлетнюю вандроўку ў Мір. Аднак, за той вялікі, як вечнасць, перадапошні майскі дзень ураджанняў назбіралася багата: яскравых і розных — такіх, што хопіць не на адзін аповед. Таму рыхтуецца ў "ЛіМе" асобная публікацыя паводле Мірскіх навуковых чытанняў, якія праходзілі пад кіраўніцтвам прафесара Вольгі Дадзіёмавай і тэма якіх — "Музычная культура Беларусі: знаходкі і адкрыцці" — аб'яднала даклады вядомых беларускіх вучоных і маладых музыказнаўцаў. Рыхтуецца для нашых чытачоў і рэпартаж-"экскурсія" з Мірскага замка. Сёння ж — гаворка пра тры адметныя падзеі фестывалю.

Пасля заканчэння канцэрта ксёндз Аляксандр, пробашч Мікалаеўскага касцёла, шчырымі прачулымі словамі падзякаваў гасцям за цудоўную музыку, выказаў спадзяванне, што іх выступленні ў касцёле зробяцца традыцыяй. І дадаў: "Дзякуючы гэтай пранікнёнай музыцы мы ўсе адчулі сябе шчаслівымі, але і зразумелі, як у штодзённым жыцці нам усім бракуе Любові...".

Паводле добрай традыцыі, распачаўся ён вернісажам у мясцовым Доме культуры. Выстаўка "Маёй радзіме прысвячаецца" складалася з работ лепшых студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, спадкаемцаў традыцый айчыннай школы манументальна-дэкаратыўнай творчасці: гэта тонкія псіхалагічныя партрэты "Мама" і "За піяніна", прадстаўленыя Віктарам Данільчыкам; спакуслі-ва-жывы "Бурштынавы мёд" Алесі Скорабагатай; утульныя і адухоўленыя пейзажы Антона Вырвы... Апроч жывапісу, экспанаваліся работы Ксеніі Ціханавай, выкананыя ў тэхніцы падвойнага ткацтва.

Успрыманню твораў маладых майстроў выяўленчага мастацтва спрыяла ювелірна-вытанчанае гранне Ансамбля кларнетыстаў пад кіраўніцтвам Генадзя Забары.

Дарэчы, камерныя калектывы, што працуюць у структуры Нацыянальнага канцэртнага аркестра, выступілі ў Мірскай Барысаглебскай царквой (Каложай) — музыка Мячыслава Карловіча. Пра Брэсцкую крэпасць пэўным чынам нагадвала творчасць Анатоля Багатырова, Мікалая Аладава, Яўгена Глебава, Генрыха Вагнера ды іншых беларускіх кампазітараў, якія звярталіся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Вобраз Белавежскай пушчы неад'емны ад гучання самых розных мелодый, што суправаджалі яе 600-гадовую гісторыю, — ад паляўнічых сігналаў, узноўленых сучаснымі аранжыроўшчыкамі і выканаўцамі, да партытур XXI стагоддзя. А возера Нарач музыканты прадставілі творамі Міхала Клеафаса Агінскага ды Напалеона Орды, якія захапляліся гэтым дыяментам беларускай зямлі.

Лічба "сем" была на сёлетнім свяце мастацтваў у Міры сапраўды магічнай. Яно праходзіла сёмы раз і прадставіла найцікавую як у эстэтычным, так і ў асветніцкім сэнсе музыку сямі цудаў Беларусі. Удзельнічала ў ім сем калектываў Нацыянальнага канцэртнага аркестра: знаныя ансамблі кларнетыстаў, флейтыстаў, трубачоў, салістаў на драўляных духавых інструментах, Струнны квартэт, Камерны аркестр, а таксама Біг-бэнд, які разам са спевакамі-салістамі падрыхтаваў пад кіраўніцтвам М. Фінберга канцэрт "Мелодыі натхнення" (праграма, складзеная з лепшых песень, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Году роднай зямлі, прагучала ў Карэлічах).

Цудам стаўся і канцэрт-апафеоз "Голас мірскіх муроў". Упершыню за ўсю пасляваенную гісторыю Міра ў мясцовым Мікалаеўскім касцёле — помніку архітэктуры XVI—XVII стагоддзяў, дзе некалькі гадоў таму пачалася і яшчэ працягваецца рэстаўрацыя, — загучала музыка! Гэта быў канцэрт Камернага аркестра пад кіраўніцтвам Валерыя Сарокі. У праграме, якую вяла і каменціравала доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, гучала старадаўняя беларуская музыка і заходнееўрапейская класіка высокадухоўнага зместу. Шматлікія наведнікі касцёла, сярод якіх былі і мясцовыя парафіяне, і турысты, кожны нумар віталі шчодрымі авацыямі, выклікалі на "біс". А гучанне музыкі ў гэтых старажытных сценах не проста ўраўнавала — да слёз кранала выключнай прыгажосцю, узнёсласцю, багаццем абертонаў. Часам здавалася, што гэта не струнныя інструменты граюць, а спявае касцельны хор ды малітоўна гучыць велічны голас аргана...

♫

Старшыня Карэліцкага райвыканкама Віктар Шайбак паабяцаў развіваць канцэпцыю гэтага цудоўнага свята і ў наступным годзе фестываль "Мірскі замак" правесці ўжо ў новым фармаце, каб прадставіць мастацтва заслужанага калектыву Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі, яго цудоўныя творчыя магчымасці найлепшым чынам і як мага шырэй. Кіраўнік раёна зацікаўлены ў культурным развіцці сваіх землякоў. Бо, на яго думку, толькі духоўна багатыя людзі будуць плённа працаваць і ўмацоўваць эканоміку і рабіць прыгожым жыццё на роднай зямлі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

***На здымках:** замак у мястэчку Мір; Камерны аркестр пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі В. Сарокі ў мірскім Мікалаеўскім касцёле.*

Фота Віктара Кавалёва

Пункцірам

● 10 чэрвеня ў Маскве ў Цэнтральным музеі Вялікай Айчыннай вайны адбылася навуковая канферэнцыя "65-я гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: гісторыя і сучаснасць". У канферэнцыі прынялі ўдзел ветэраны Другой сусветнай вайны, курсанты Вышэйшых ваенных навучальных установаў расійскай сталіцы, выкладчыкі. Арганізатарамі мерапрыемства выступіла аб'яднанне "Беларусы Масквы".

● Свет пабачыў другі том даследавання журналіста Сяргея Шапрана "Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця *ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах*". Кніга ўвабрала ў сябе матэрыялы за перыяд 1970 — 2003 жыцця пісьменніка. У гэты том увайшлі невядомыя дакументы, рукапісы, ліставанне Васіля Уладзіміравіча з Алесем Адамовічам, Валянцінам Аскоцкім, Віктарам Астаф'евым, Аляксандрам Твардоўскім і іншымі. Пры падрыхтоўцы выдання былі выкарыстаны фонды больш як дваццаці музеяў і архіваў.

● 30 мая ў Іркуцку ў рамках Дня прыбайкальскіх беларусаў прайшоў VI Абласны фестываль-конкурс "Гучы, гоман беларускі". Удзел у фестывалі ўзялі калектывы Іркуцкай вобласці, якія выконваюць творы на беларускую тэматыку. Мерапрыемства было прымеркавана да чарговай гадавіны стварэння грамадскай арганізацыі "Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага".

● Горад Пружаны стаў старэйшым на 32 гады. Звесткі пра больш ранняе згадванне горада ў летапісах знайшоў гісторык з Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта Генадзь Семянчук. Да гэтага Пружаны "датаваліся" 1433 годам, а ў "Тэўтонскіх летапісах" даследчык адшукаў пазнаку 1401 года: там гаворыцца пра пераход праз населены пункт германскага войска падчас паходу на русінаў.

● У Полацку з'явіўся помнік князю Андрэю, старэйшаму сыну Альгерда. Помнік пастаўлены ў двары ля скрыжавання вуліц Ніжне-Пакроўскай і Энгельса. Андрэй быў апошнім полацкім князем. Загінуў ён у 1399 годзе ў бітве з татарамі на Ворскле. Гэта ўжо трэцяя асоба княжацкага роду, каму пастаўлены помнік у горадзе. Папярэдне ўвекавечылі памяць пра Усяслава Брачыслававіча і Прадславу Святаславаўну (Еўфрасінню Полацкую).

● У мінскім кінатэатры "Перамога" працуе выстава "Маладая прэс-фатаграфія Беларусі". Восем беларускіх фотарэпарцёраў выставілі перад гледачамі па восем здымкаў. На іх — святкаванне Купалля, свята Вадохрышча, краявіды, партрэты. Праект стаў вынікам працы фоташколы "5W". Выстава пабывала ўжо за мяжой. Ініцыятар "Маладой прэс-фатаграфіі Беларусі" Андрэй Лянкевіч спадзяецца, што такая выстава будзе рэгулярнай. Мэта гэтага мерапрыемства паказаць, што ў нашай краіне існуюць свае фотарэпарцёры.

● Фальклорны песенны ансамбль "Лянок" талінскага беларускага таварыства "Лёс" выступіў на XI свяце песні і танца "Славянскі вянок" у Эстоніі. Артысты прынялі ўдзел у шэсці па вуліцах старога горада і ў гала-канцэрце свята, які адбыўся ў самай вялікай зале эстонскай сталіцы — Гархоле. Усяго ў "Славянскім вянку" ўдзельнічала больш як 200 творчых калектываў з Латвіі, Расіі, Украіны, Фінляндыі, Эстоніі.

Падрыхтаваў
Павел РАДЫНА

Вандроўка ў чароўны свет

Кругагляд

Пры канцы мая гасцінна расчыніў дзверы Нацыянальны выставачны цэнтр "БелЭКСПА" для акцыі "Падорым дзецям свята", прысвечанай Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Арганізатарамі яе выступілі Беларускі дзіцячы фонд, Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама і выставачны цэнтр.

Акцыя ладзілася на працягу чатырох дзён. На другі ж дзень падарожжа ў краіну дзяцінства адбылася сустрэча школьнікаў з беларускімі пісьменнікамі. Першым дзятву павітаў пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" і старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі і павіншаваў з надыходзячымі доўгачаканымі летнімі канікуламі.

Сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў запрасіў навучэнцаў зрабіць падарожжа ў беларускую літаратуру, у прыватнасці, у літаратуру для дзяцей. Міхась Паўлавіч задаваў пытанні на веданне прозвішчаў айчынных пісьменнікаў, назваў выдавецтваў, газет і часопісаў. Школьнікі вельмі актыўна адказвалі, называлі Якуба Коласа, Янку Купалу, Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Максіма Багдановіча... І за адказы атрымлівалі ад Міхася Пазнякова прызы. Да слова, юнацтва змагло азнаёміцца з дзейнасцю РВУ "Літаратура і Мастацтва", прадстаўленага стэндам з кнігамі, якія ў ім выйшлі, у тым ліку і дзіцячымі.

Потым адбылося выступленне галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" Раісы Баравіковай, якая загадвала загадкі, распавяла пра казкі са сваёй кнігі "Казкі з гербарыя"; Ніна Галіноўская з душэўнай цеплынёй чытала свае вершы. Пісьменнікі Валянцін Лукша, Мікола Чарняўскі і Павел Саковіч таксама чыталі вершы, скорагаворкі, жартоўныя чатырохрадкоўі. Да іх са сваімі вершамі далучыўся намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Вясёлка" Уладзімір Мазго. Адзін са старэйшых творцаў Уладзімір Мацвеенка распавёў пра некаторыя эпізоды са свайго дзяцінства, пра цяжкае жыццё ў Мінску падчас нямецкай акупацыі і пасля яго вызвалення. Усе пісьменнікі заклікалі дзяцей слухацца настаўнікаў, добра вучыцца, паважаць родную мову і размаўляць на ёй і як мага больш чытаць.

Выступленні беларускіх літаратараў арганічна чаргаваліся з музычнымі і танцавальнымі нумарамі. Так, захапляльна і яскрава выступілі артыстка Маладзёжнага тэатра эстрады, спявачка Улялюм, выхавальнікі Цэнтра пазашкольнай работы Савецкага раёна горада Мінска: фальклорны ансамбль "Жарт" (мастацкі кіраўнік — Ларыса Гайдук), якія таньчылі і выканалі каларытныя беларускія народныя песні; Павел Бярэзін падарыў песню "Ліманадны дожджык". Сваімі выступленнямі парадавалі прысутных харэаграфічны ансамбль "Свавольніцы" (мастацкі кіраўнік — Святлана Кавалёва), выхаванцы клуба бальнага танца "Танга", а самая маленькая ўдзельніца канцэрта Паліна Шапавалава выканала песню "Мама"...

Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Маскоўскага раёна сталіцы "Ранак" прадставілі дуэт "Бэбі-Шлягер", мастацкі гімнастычны калектыў "Калейдаскоп"...

Але гэта яшчэ не ўсё: прысутныя мелі магчымасць здзейсніць унікальнае падарожжа — у незвычайны свет фарбаў. Па перыметры пляцоўкі месцілася адмысловая выстаўка. На ёй былі прадстаўлены работы выхаванцаў Ветрынскай школы-інтэрната Алесі Захар'евай, Вячаслава Абалонскага, Алены Шлюпкінай, прадстаўнікоў народнай выяўленчай студыі "Каляровы аловак", якая дзейнічае на базе Цэнтра мастацкай творчасці Фрунзенскага раёна Мінска, творы выхаванцаў сямейнага дзіцячага дома Сянцовых, інваліда-калясачніцы Наталлі Астанінай з Ліды, гуртка "Беларускі сувенір" (аплікацыя і пляценне з саломкі і бісеру). Прыцягвала ўвагу экспазіцыя творчых работ навучэнцаў СШ № 41 горада Мінска, якія заваявалі больш як сто дыпломаў і грамат на разнастайных рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках і конкурсах.

З персанальнай выстаўкай выступіла Ліза Кудзіна. Дзяўчынка вучыцца, выкарыстоўвае розныя інструменты, спрабуе і адкрывае для сябе новыя тэхнікі. Таму яе работы рознымі, часам па-дзіцячы наіўныя, але цікавыя і, можа, гэта першы яе крок да вялікага выяўленчага мастацтва.

Дэманстравалася асобная экспазіцыя работ народных студый дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Залатыя ўзоры" (кіраўнік — Аліна Кажанец) і выяўленчага мастацтва "Майстэрня мастацтваў" (кіраўнік — Вольга Ляхоўская).

Як ужо зазначалася, на працягу чатырох дзён для дзятвы быў наладжаны вялікі фэст з разнастайнымі сустрэчамі, з канцэртна-гульнявымі праграмамі, выступленнямі прадстаўнікоў іншых раёнаў Мінска, артыстаў беларускай эстрады, дзяцей-сірот і інвалідаў.

Бясспрэчна, свята атрымалася, прыняло навучэнцаў у краіну мастацтва, спеваў, кніг, душэўнасці і духоўнасці. Бо духоўнасць вечная, і вечнае тое, што засноўваецца на нацыянальнай глебе.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Толькі факт

Берлін—Баранавічы

Адбылася прэзентацыя кнігі "Найлепшыя прывітанні з Мінска" нямецкага пісьменніка, гісторыка, перакладчыка, тэатральнага драматурга і рэжысёра Паўля Коля, які нарадзіўся ў Германіі ў 1936 годзе і жыве ў Берліне.

Выйшла кніга ў мінскім выдавецтве "Медисонт". Пераклад ажыццявілі энтузіясты з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта — выкладчык С. Паўлавіцкі з удзелам студэнтаў, агульную рэдакцыю зрабіў загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства гэтай жа ўстановы, кандыдат гістарычных навук Сяргей Новікаў. Кніга атрымалася цікавай, змястоўнай і шматпланавай, тут і Кёльн, і Мінск, каханне нямецкага журналіста да яўрэйкі, звярыная існасць фашызму, трагедыя яўрэйскага мінскага гета і лагера смерці Трасцянец.

Вёў прэзентацыю рамана ў Баранавіцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Валянціна Таўлая педагог і вучоны Сяргей Новікаў. Відавочна, баранавіцкая аўдыторыя была зачаравана самім Паўлем Колем.

Адзначым, што раман "Найлепшыя прывітанні з Мінска" — не першая спроба пяра выдатнага немца-антыфашыста Паўля Коля, што ўрыўкі з яго твораў уключаны ў школьныя падручнікі Германіі. Застаецца дадаць, што прэзентацыю рамана арганізаваў Інстытут Гётэ ў Мінску.

Міхась МАЛІНОЎСКІ

Прысвячэнне класіку

"Сын Зямлі" — пад такой назвай у сталічным Доме дружбы прайшоў літаратурна-музычны вечар, прысвечаны жыццю і творчасці класіка малдаўскай літаратуры паэта Багдана Істру, які ўсё жыццё і творчасць прысвяціў свайму народу. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Рэспубліцы Беларусь Іван Філімон падрыхтаваў для гасцей вечара кароткі біяграфічны нарыс паводле жыцця і творчасці паэта. А беларускі паэт Уладзімір Скарынкін, які з'яўляецца яшчэ і старшынёй таварыства "Беларусь — Малдова" нагадаў, што ў беларусаў і малдаван вельмі падобны лёс. Трэба сказаць, што намаганнямі Уладзіміра Скарынкіна і многіх іншых паэтаў у свой час выйшла двухтомная анталогія малдаўскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову. Паэт Віктар Шніп чытаў вершы малдаўскай паэзіі ў перакладзе на родную мову. Але больш за ўсё гучалі вершы самога Багдана Істру.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Калекцыйна-сувенірная выстаўка

Вектар

Жыхар Віцебска Рамазан Махмудаў перадаў частку сваёй калекцыі зброі для экспазіцыі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, і цяпер тут працуе выстаўка "Халодная і агнястрэльная зброя".

Прадстаўлена каля трохсот экспанатаў. Асаблівае месца займае арыгінальная халодная зброя ручной работы славутых кубачынскіх майстроў Дагестана — землякоў Рамазана Махмудава. Яшчэ ў VII ст. вырабы кубачынскіх майстроў былі шырока вядомыя ў Закаўказзі і на Блізкім Усходзе. Зробленыя імі мячы і кінжалы, кальчугі ("кубачы"), высока цаніліся ў многіх краінах. У XVIII — XIX стст. тамтэйшыя майстры таксама праславіліся мастацкай апрацоўкай металу — ад зброі і вайсковых даспехаў да ўпрыгожванняў і прадметаў побыту. Асаблівасць кубачынскай гравіроўкі — уся паверхня вырабаў пакрываецца арнаментам, які выконваецца ў тэхніцы чарнення і залачэння. У кубачы існуюць цэлыя дынастыі гравёраў, манціроўшчыкаў і філіграншчыкаў, іх рамяство перадаецца з пакалення ў пакаленне, і кожная сям'я становіцца своеасаблівай школай майстроў.

У экспазіцыю ўвайшлі і легендарныя мячы: экскалібур, мячы вікінгаў Зігфрыда і Эрыка Рыжага, імператара Карла Вялікага. Шырока прадстаўлены мадэлі самурайскай зброі. Сярод экспанатаў — казацкія шашкі, дагестанскія шаблі, ятаганы і кінжалы.

Вераніка Сасноўская, загадчык інфармацыйна-выставачнага аддзела, знаёміць з экспазіцыяй і папярэджвае, што выстаўка — калекцыйна-сувенірная: частка экспанатаў калекцыйная, а частка — сувенірная: "Напрыклад, кінжал Рамзэса Другога — гэта аўтарская інтэрпрэтацыя ў стылі фэнтэзі, уяўленне сучаснага мастака. Рамазан Махмудаў падарожнічаў па розных краінах і набываў гэтыя рэчы".

Сапраўдная зброя прадстаўлена толькі ў "кубачынскім" раздзеле. Агнястрэльная ж, у асноўным, прадстаўлена копіямі і мадэлямі.

Ідрак МІРЗАЛІ-ЗАДЭ

Саюзная дзяржава ганаруе творцаў

Навідавоку

Пры канцы мая ў Мінску Экспертны савет назваў намінантаў прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва 2009 — 2010 гадоў. Статус прэміі досыць высокі. Узнагарода ўручаецца раз на два гады, яна эквівалентная 1 250 мінімальным заработным платам Расійскай Федэрацыі. Ужо на прамежкавым, трэцім этапе ў сталіцы нашай дзяржавы ўсім намінантам ад беларускага боку былі ўручаны Дыпломы. Праз нейкі час такая ж працэдура адбудзецца і ў Маскве.

"Яркія, моцныя работы", — так ахарактарызаваў сустаршыня Экспертнага савета і старшыня цяперашняга пасяджэння Уладзімір Рылатка праекты, якія намінуюцца на прэмію. І работы гэтыя прадстаўляюць выдатныя, знаныя асобы.

Сёлета на прэмію вылучаюцца раманы "Вам — задание" і «Сыновья» Мікалая Чаргінца — чалавека цікавага лёсу, празаіка, публіцыста, старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, яркі майстар айчыннай мастацкай школы прадстаўляе аўтарскую серыю "Палітра майго часу".

Трэці унікальны і супольны праект — помнікі класіку беларускай літаратуры Янку Купалу ў горадзе Маскве і вялікаму рускаму паэту Аляксандру Пушкіну ў горадзе Мінску, аўтарамі якіх з'яўляецца творчы калектыў у складзе: архітэктар Юрый Грыгор'еў, скульптары — бацька і сын Льва і Сяргей Гумілеўскія, і скульптары Юрый Арэхаў (вылучаны пасмяротна) і Рыгор Арэхаў.

Чацвёрты праект прадстаўляюць расіяне — гэта цыкл жывапісных палотнаў "Родная земля", аўтарамі якіх з'яўляюцца народныя мастакі СССР Аляксей і Сяргей Ткачовы.

Прэмій усяго тры, таму спаборніцтва чакаецца сур'ёзнае.

"Экспертны савет у досыць складаных умовах, таму што кагосьці трэба будзе выключыць са спісу. Але мы маем магчымасць пераканацца, наколькі багатыя нашы краіны таленавітымі людзьмі", — падкрэсліў Барыс Клюеў, народны артыст Расіі, член Экспертнага савета. Названы савет дзейнічае пры Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы. У яго склад уваходзяць знаныя дзеячы літаратуры і мастацтва, прадстаўнікі творчых саюзаў і дзяржаўных устаноў Беларусі і Расіі. Сустаршынямі з'яўляюцца першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Рылатка і намеснік міністра культуры Расійскай Федэрацыі Андрэй Бусыгін.

Паводле Уладзіміра Рылаткі, крытэрыяў, па якіх вызначаюцца лаўрэаты, тры. Па-першае, гэта павінны быць сапраўды высокамастацкія творы, якія ўпрыгожваюць культуру народаў Саюзнай дзяржавы і сусветную. Па-другое, асобы, якія вылучаюцца намінантамі, і іх работы павінны мець грамадскае прызнанне. І трэцяе — улічваецца ўнёсак намінантаў ва ўмацаванне адносінаў братэрства, дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі.

Мінскі этап у прыняцці рашэння аб прэміях — трэці. На першым этапе вылучаліся кандыдаты і пералік твораў, адабраных на прысуджэнне прэміі. (Творы, якія вылучаюцца на суісканне прэміі, разглядаюцца калегіямі міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі. Затым іх спіс друкуецца ў сродках масавай інфармацыі. З улікам вынікаў грамадскага абмеркавання і прымаецца рашэнне аб рэкамендацыі твораў на прысуджэнне ўзнагароды.)

Чацвёрты этап адбудзецца восенню ў Маскве — тайным галасаваннем будзе прынята рашэнне аб лаўрэатах. Пасля гэтага на Вышэйшым дзяржаўным савеце кандыдатуры будуць зацверджаны. Узнагароды намінанты атрымаюць на наступным "Славянскім базары ў Віцебску".

А сёлета падчас "Славянскага базару" ў Віцебску мяркуецца выставіць работы ў мастацкім музеі для знаёмства з імі грамадскасці. Што да пісьменніка Мікалая Чаргінца, то плануецца ў адным з кінатэатраў паказаць фільмы, створаныя паводле яго твораў, і зрабіць выстаўку кніг.

Лаўрэатамі прэміі Саюзнай дзяржавы ў розныя гады былі драматург Аляксей Дударaў, пісьменнік Іван Шамякін, расійскі літаратар Станіслаў Куняеў, артысты Уладзімір Гасцюхін, Расціслаў Янкоўскі, Аляксандр Калягін, Аляксей Пятрэнка, маэстра Міхаіл Фінберг, кампазітар Аляксандра Пахмутава, мастакі Міхаіл Савіцкі, Валянцін Сідараў, рэжысёр-пастаноўшчык Сяргей Арцыбашаў.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: намінанты прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва 2009 — 2010 гг.

Фота аўтара

У Беларусі — новы Міністр культуры. На гэтую пасаду прызначаны Павел Латушка, які на працягу шасці гадоў, да лістапада 2008-га, быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом нашай дзяржавы ў Рэспубліцы Польшча. Нарадзіўся П. Латушка ў 1973 годзе ў Мінску. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1995) і завочна — Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт. Валодае англійскай і польскай мовамі. Яго дыпламатычная кар'ера пачыналася з пасады віцэ-консула (затым — генеральнага консула) Беларусі ў Беластоку. У свой час П. Латушка выконваў абавязкі прэс-сакратара Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС, працаваў у дагаворна-прававым упраўленні гэтага міністэрства.

Былы Міністр культуры Уладзімір Матвейчук прызначаны памочнікам Прэзідэнта Беларусі.

С. Б.

У межах мерапрыемстваў, наладжаных Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, адбылася сустрэча балгарскіх пісьменнікаў Найдана Вылчава, Алены Алекавай з супрацоўнікамі РВУ "Літаратура і Мастацтва". Балгарскія калегі падзяліліся літаратурнымі навінамі, прыгадалі свае ранейшыя беларускія візіты. Асноўная гаворка вялася пра стан кнігавыдавецкай справы на сучасным этапе ў Беларусі і Балгарыі, пра рэдакцыйныя планы і кірункі працы літаратурна-мастацкіх выданняў, што ўваходзяць у РВУ, а таксама — перспектывы аднаўлення перакладчыцкай школы, якая некалі ажыццяўляла плённую сувязь паміж беларускай і балгарскай літаратурамі.

Ул. інф.

"Ветрагон" — новая кніга пісьменніцы Ганны Атрошчанкі. У зборніку змешчаны апавяданні, замалёўкі, абразкі і карацелькі. Творы вылучаюцца займальнасцю, адлюстроўваюць вялікую любоў аўтара да роднай зямлі і людзей. Як і ў папярэдніх кнігах, пісьменніца шырока выкарыстоўвае народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі, мова яе герояў сакавітая, запамінальная. Кніга выйшла нядаўна ў адкрытым акцыянерным таварыстве "Палесдрук" (г. Гомель).

Міхась КАВАЛЁЎ

"Чаша слёз" — так назвалі фантан у памяць пра воінаў, якія загінулі ў баях на афганскай зямлі: на ім значацца дзесяць прозвішчаў жыхароў Бярозаўскага раёна. Адкрыты ён у старым парку горада Бярозы побач з будоўляй храма і мемарыялам. Аналагаў такому фантану няма ў Брэсцкай вобласці. Распрацавалі праектна-кашгарысную дакументацыю і пабудавалі яго ўласнымі сіламі спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Ён падобны да кветкі з чатырма буйнымі пялёсткамі. У цэнтры і з бакоў усталяваны вялікая і малая чашы з падсветкай. Вышыня фантана пяць метраў, дыяметр — каля дваццаці.

Іван АСКІРКА

Міжнародны дзіцячы тэлевізійны конкурс песні "Еўрабачанне-2010" адбудзецца ў Мінску. Вызначана і дакладная дата шоу: 20 лістапада наступнага года. На яго правядзенне прэтэндавалі многія краіны — удзельніцы Еўрапейскага вяшчальнага саюза, у які ўваходзіць і Белтэлерадыёкампанія. На аснове іх прэзентацый наглядальны савет ЕВС зрабіў выбар на карысць Беларусі, якая прадставіла дэталізаваны план знаходжання замежных дэлегацый, праграму адпачынку юных удзельнікаў "Еўрабачання-2010".

Я. КАРЛІМА

З нагоды

Першага чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, у сталічным Цэнтральным дзіцячым парку імя Максіма Горкага ладзіліся шматлікія святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да гэтай даты. Працавалі разнастайныя атракцыёны, прадавалі сувеніры і цацкі, супермаркет для дзяцей "Буслік" наладзіў свята з клоунамі, фокуснікамі, усялякімі конкурсамі і канцэртнай праграмай. Для самых маленькіх дзейнічаў пракат электрамабіляў, а ўсе жадаючыя маглі здзейсніць рачную прагулку на славутым "Аўтусціне"...

Свята дзяцінства

Не засталіся ў баку і айчынныя дзіцячыя пісьменнікі. Для іх таксама быў адведзены ў парку куточак побач з помнікам Максіму Горкаму. Арганізатарамі гэтай дзеі выступілі Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк (ЦСДБ) горада Мінска і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва". Так, ЦСДБ прадставіла стэнды з улёткамі, метадычнымі працамі і іншымі матэрыяламі сталічных дзіцячых бібліятэк №№ 5, 6, 7, 8, 11, 15, 17... Таксама экспанаваліся дзіцячыя кнігі ды іншыя выданні, якія пабачылі свет у РВУ "Літаратура і Мастацтва". З дзятвой і іх бацькамі гутарылі творцы Мікола Чарняўскі, Уладзімір Мацвеенка, Ніна Галіноўская, Міхась Пазнякоў, Анатоль Зэкаў, Уладзімір Мазго, Валерый Кастручын... Ніякай спецыяльнай праграмы выступленняў не было, пісьменнікі адказвалі на адвольныя пытанні, знаёмілі з тым ці іншым выданнем, раілі, што лепей набыць для чытання дзятве. Таксама ладзіліся віктарыны і конкурсы, уручаліся прызы.

А цяпер крышку гісторыі гэтага свята. Міжнародны дзень абароны дзяцей быў заснаваны ў лістападзе 1949 года рашэннем сесіі Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын. А першае святкаванне адбылося праз год. Гэты дзень — дзень мабілізацыі сусветнай грамадскай думкі на барацьбу ў абарону дзяцей ад пагрозы вайны, за захаванне іх здароўя, за ажыццяўленне выхавання і адукацыі на дэмакратычнай аснове. Так, гэты дзень — не толькі святкаванне, але і напамін дарослым пра неабходнасць прытрымлівання і павагі правоў дзіцяці як неабходнай умовы для фарміравання гуманнага, справядлівага і шчаснага грамадства.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

Заўтра, 13 чэрвеня, адбудзецца X Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2009". Ён прысвячаецца 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Слухаць і спяваць сваё!

Анонс

Заснаванае ў 1993 годзе наша роднае, а таму асабліва папулярнае сярод беларусаў свята мае нямала добрых традыцый, на якіх грунтуецца і праграма сёлетняга фэсту. Аднак сцэнарый яго правядзення гэтым разам істотна адрозны ад папярэдніх: усе шматлікія і стракатыя фестывальныя імпрэзы адбудуцца на працягу толькі аднаго дня. Што ж дзень наступны абяцае? Рэспубліканскі конкурс маладых выканаўцаў беларускай песні, абодва туры якога (першы — выступленне ў суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга, затым спевы пад фанаграму "мінус 1") пройдуць у Палацы культуры г. Маладзечна. Візіты нашых паэтаў ды кампазітараў-песеннікаў у Купалавы мясціны (Вязынка, Радашковічы), творчыя сустрэчы ў працоўных калектывах, з навучэнцамі. Канцэрты лепшых выканаўцаў-аматараў на адкрытых пляцоўках. "Горад майстроў", выстаўка-продаж твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вялікі вечаровы гала-канцэрт на Цэнтральнай плошчы — з узнагароджаннем пераможцаў конкурсу, з музычнымі прэм'ерамі, з выступленнямі паэтаў... Песні І. Любана, Ю. Семянякі, І. Паліводы, У. Будніка, А. Елісеенкава, А. Атрашкевіч ды іншых аўтараў прагучаць гэтым разам у выкананні не толькі сталічных артыстаў, а і прадстаўнікоў усіх абласцей краіны. Маладзечна рыхтуецца прыняць больш як 600 удзельнікаў свята.

Лана ІВАНОВА

Фота Віктара Кавалёва

Ва ўсе часы ў ГДУ імя Ф. Скарыны, як і раней у педінстытуце імя В. Чкалава, жыў творчы дух і творчае натхненне. Вось чаму ў нашых сценах за 80 гадоў выпрацаваліся сапраўднага еўрапейскага ўзроўню навуковыя і культурныя традыцыі. Поруч з матэматычнымі і фізічнымі школамі добра вядомай стала і гомельская школа ў беларускай літаратуры.

Мы з гонарам сцвярджаем, што якраз са сценаў спачатку Гомельскага педінстытута, а пасля і універсітэта выйшлі сапраўдныя таленты, што ўтварылі аснову беларускай — разам з тым і шматнацыянальнай савецкай — традыцыі трагічнай ваеннай лірыкі.

Сапраўднымі бестселерамі станавіліся раманы Івана Шамякіна, якія чыталі па ўсім СССР і ў Еўропе. І для многіх чытачоў у далёкай Кіргізіі ці Прыбалтыцы яны былі сапраўднай школай жыцця.

Шмат песняў было напісана на словы Кастуся Кірэенкі, Паўлюка Пранузы (паэтаў-воінаў, якія прайшлі баявы шлях ад Гомеля да Берліна), Таісы Мельчанкі.

У свой час нашы выпускнікі, «рванаўшы» ў сталіцу, зрабілі, па сутнасці, пераварот у літаратуры 1980-х гадоў.

Пра значнасць традыцый прыгажосці ў нашай ВНУ сведчыць і той факт, што нават акадэмік Іван Фёдаравіч Харламаў пісаў вершы, а паэтамі ў нас становяцца не толькі філолагі, але і эканамісты, фізкультурнікі, матэматыкі. Відаць, аўра ў нас такая.

Аляксандр Рагачоў,
рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны, доктар хімічных навук, прафесар

Гомельская школа нацыянальнай літаратуры

З чаго складаецца імідж навучальнай установы, яе ўспрыманне ў навуковым і культурным свеце, нарэшце, вядомасць і слава? Са старажытных сценаў, што перажылі стагоддзі і былі сведкамі векавой эвалюцыі чалавецтва? З таямнічых скляпенняў бібліятэк і кніжных сховішчаў, дзе спачываюць фаліянты ў пергаментна-драўляных вокладках? З пустыннa-гулкіх аўдыторый, што памятаюць рэха крокаў шматлікіх пакаленняў вандроўнікаў у краіну ведаў? Ці, наадварот, з ультрасучасных карпусоў са шкла і бетону, начыненых найноўшай электронікай, лазерамі і камп'ютэрамі? А можа, славу універсітэта складваюць сівыя (і не вельмі) акадэмікі і прафесары (у мантыях і без іх), пра якіх так любяць апавядаць вясёлыя гісторыі і анекдоты? Хто яго ведае! Відаць, і з першага, і з другога, і з трэцяга. Але хутчэй за ўсё сапраўдную славу alma-mater прыносяць яе выпускнікі. Так, наўрад ці вылучаўся чым-небудзь сярод сярэднявечных універсітэтаў той, што знаходзіўся ў італійскім горадзе Падуя. Але менавіта ён стаў сусветна вядомым, бо тут вучыліся тыя, хто спыніў сонца і закруціў зямлю (Г. Галілей), а потым разам адправіў іх у сусветны кругабег (М. Капернік), хто нёс сонца маладзіковае асветы людзям паспалітым (Ф. Скарына). Вось чаму іх імёны з пашанай згадваюць і ў самой Італіі, і ў Польшчы, і ў Беларусі — а гэта значыць і ва ўсім свеце.

Па-сапраўднаму пра вышэйшую навучальную ўстанову пачынаюць гаварыць толькі тады, калі ў ёй складваюцца пэўныя традыцыі і навуковыя школы. Калі ж гаворка заходзіць пра галоўную ВНУ Палесся, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны, то ў першую чаргу згадваюцца прызнаная ва ўсім свеце школа фізічнай хіміі пад кіраўніцтвам рэктара універсітэта прафесара А. Рагачова ці славутая алгебраічная школа на чале з членам-карэспандэнтам НАН Беларусі прафесарам Л. Шамятковым. Таму зразумела, чаму нашы фізікі і матэматыкі частыя госці ў найбольш прэстыжных універсітэтах Старога і Новага Свету, а іхнія працы сталі адметнай візітоўкай нашых поспехаў і дасягненняў.

Разам з тым, традыцыйнае саперніцтва фізікаў і лірыкаў, сутнасць якога больш паэтычна і не менш дакладна ўвасоблена ў класічнай прыпавесці пра васількі і жыта, у сценах ГДУ імя Ф.Скарыны вырашаецца не менш дакладна і паэтычна — васількі ў жыце, хлеб і песня, краса і спажытак...

Ці не таму значныя поспехі маюць і нашы лірыкі, што дазваляе павесці гаворку пра сапраўдную гомельскую школу ў нацыянальнай літаратуры. (Маецца на ўвазе творчая дзейнасць толькі непасрэдна звязаных з універсітэтам мастакоў слова, вось чаму мы не будзем гаварыць пра "авангард" беларускай прозы — славутых Івана Мележа, Івана Навуменку, а таксама не менш слынных Андрэя Макаёнка, Анатоля Грачанікава,

Новы ўзлёт творчай актыўнасці студэнцтва прыпадае якраз на той час, калі на базе педінстытута ствараўся універсітэт. З гэтага часу частымі гасцямі ў ГДУ імя Ф. Скарыны сталі пісьменнікі, у тым ліку і народныя, паўнаводна бруілася "Крынічка" — літаратурнае аб'яднанне пры кафедры беларускай літаратуры, якой пачаў кіраваць паэт у душы прафесар Мікола Грынчык. Шмат карыснага для гэтай вялікай справы зрабіла шматтыражка "Гомельскі універсітэт", творчы калектыў якой здолеў паяднаць вакол сябе цікавую таленавітую моладзь.

Віктара Казько, якія, на жаль, не былі нашымі студэнтамі.

Зараджэнне універсітэцкай школы прыгожага пісьменства практычна супадае са станаўленнем нашай alma-mater.

Ля іх вытокаў стаялі маладыя паэты Леанід Гаўрылаў, Мікола Сурначоў, чые светлыя ўваходзіны ў краіну паэзіі абарвала вайна. Яны назаўсёды засталіся ў нашай памяці і беларускай паэзіі зусім маладымі, як і іх юнацкія творы.

Вайна стала вызначальнай і ў паэзіі Кастуся Кірэенкі. Тонкі лірык на пачатку свайго творчага шляху, які зайздросціў летняму дажджу, што мае права вольна дакрануцца да рукі каханай, першы свой паэтычны зборнік цалкам прысвячае гераічным будням воіна. Для паэта галоўным становіцца не ўвасабленне прыгажосці краявідаў роднага Палесся, а ўслаўленне подзвігу радавога салдата, які абараняе родны край і сваё светлае заўтра.

Толькі ў апошнія гады жыцця ўжо будучы прызнаным майстрам, лаўрэатам Дзяржаўных прэмій, Кастусь Кірэенка на новым этапе звяртаецца да асэнсавання класічных праблем быцця, рэзка мяняючы змест сваіх твораў.

Своеасаблівым сімвалам долі паэтаў-франтавікоў стаў лёс Паўлюка Пранузы. Выпускныя інстытуцкія экзамены ён здаваў пад гул нямецкіх самалётаў. Атрымаўшы дыплом настаўніка ў першыя дні вайны, пайшоў не вучыць дзяцей, а іх бараніць. Малады артылерыст-зенітчык усе чатыры гады вайны быў на пярэднім краі. За ўсіх сваіх палеглых сяброў дайшоў да Берліна і распісаўся на рэйхстагу. А пасля вайны ўсё аддаваў дзецям — да выхаду на пенсію працаваў настаўнікам. І быў Паэтам. Цудоўнае ўвасабленне памкненняў гераічнага і летуценнага пакалення!

Па-сапраўднаму Паўлюк Прануза далучыўся да паэзіі ў час вучобы ў ВНУ, калі сустрэўся са сваімі аднадумцамі М. Сурначовым, Л. Гаўрылавым, К. Кірэенкам...

У суровых выпрабаваннях і пакутах вайны ліра паэта пасталела. Паэтычныя творы, што нараджаліся ў баях і пасля іх, выразна мянялі сваё гучанне. Але засталося галоўнае — спасціжэнне праўды жыцця.

Студэнтам універсітэта пасля таго, як сціхлі грымоты, навалы, стаў Іван Пятровіч Шамякін, Якраз у гэты час студэнт-завочнік Гомельскага педінстытута, днём вучыў дзетак, а вечарамі ў халаднаватай хаціне пачынаў пісаць свае першыя раманы. Праўда, праз некаторы час ён пераедзе ў Мінск, але першыя ўрокі творчасці спазнае ўсё ж такі ў сценах нашай alma-mater. Таму ўсё жыццё ён заставаўся надзейным сябрам калектыву універсітэта. У архіве кафедры беларускай літаратуры беражліва захоўваюцца шматлікія фотаздымкі «літаратурных дэсантаў» на чале з І. Шамякіным, што ці не кожны год прыязджалі ў ГДУ.

Першае пасляваеннае пакаленне, у адрозненне ад папярэднікаў, было больш схільным да прозы. Хаця, канечне, у сценах, якія памяталі гулкія галасы сваіх таленавітых выхаванцаў, не магло заціхнуць паэтычнае слова. Магчыма паэты проста не заявілі пра сябе, так магутна, як празаікі, сярод якіх М. Даніленка і А. Капусцін. Хаця мажлівасці для гэтага былі. Цікавыя замалёўкі роднай прыроды пакінуў Алесь Хведар, дзеткам прысвяцілі свае першыя кнігі Нічыпар Парукаў і Станіслаў Кацуба, згадкі якога пра родны куточак могуць упрыгожыць любую анталогію.

Цікавай старонкай паэтычнага летапісу інстытута стала творчасць студэнтаў 50-ых — канца 60-ых гадоў. Пра свой родны Сож, Палессе, пра салаўіныя ночы юнацтва, студэнцкі інтэрнат пяялі Васіль Клімянкоў, Васіль Патапенка. Тонкімі лірыкамі зарэкамендавалі сябе Аляксей Саснок, Уладзімір Беліч, Людміла Грыгаровіч.

Найбольш яскрава гэтыя пошукі ўвасоблены ў паэзіі Алега Маісеенкі. Кароткімі байкамі змагаўся з рознымі недахопамі Васіль Дружкоў, з сатырычнымі вершамі выступіў Уладзімір Казелец, балады роднаму "Гомсельмашу", мірнай стваральнай працы прысвячаў Міхаіл Буткевіч.

Амаль ніхто з іх не стаў прафесійным паэтам, але любоў да слова спрыяла пошукам самога сябе, дапамагла ім стаць сапраўднымі людзьмі.

Магчыма, гэта і выпадковасць, але новы ўзлёт творчай актыўнасці студэнцтва прыпадае якраз на той час, калі на базе педінстытута ствараўся універсітэт. З гэтага часу частымі гасцямі ў ГДУ імя Ф. Скарыны сталі пісьменнікі, у тым ліку і народныя, паўнаводна бруілася "Крынічка" — літаратурнае аб'яднанне пры кафедры беларускай літаратуры, якой пачаў кіраваць паэт у душы прафесар Мікола Грынчык. Шмат карыснага для гэтай вялікай справы зрабіла шматтыражка "Гомельскі універсітэт", творчы калектыў якой здолеў паяднаць вакол сябе цікавую таленавітую моладзь. А яе было надзвычай многа — на кожным курсе падавалі сур'ёзныя надзеі па некалькі здольных паэтаў. Іменна ў гэты час вельмі хораша заявілі пра сябе Таіса Мельчанка, Ніна Шклярава, Рыгор Андрэявец, Алесь Дуброўскі, Станіслаў Крупенька, Міхась Башлакоў, Віктар Ярац, Віктар Стрыжак... Прычым амбіцыі і творчы патэнцыял большасці аўтараў не абмяжоўваўліся толькі маштабамі універсітэта. Іх агульныя "Уваходзіны" (а менавіта так сімвалічна назваў свой першы зборнік В. Ярац) сталіся па сутнасці прадвесцем уваходзін у вялікую літаратуру новай паэтычнай генерацыі. Свае першыя зборнікі называлі зусім проста: "Мая вёска" (Н. Шклярава), "Вясковая песня", "Бацькоўскі дом" (Т. Мельчанка), "Касавіца" (М. Башлакоў). "Вечныя даннікі" (аднайменны зборнік В. Стрыжака) сваёй Айчыны, яны з замілаванасцю згадвалі свой "Начны паром" (М. Башлакоў), "Дняпроўскі бакен" (В. Ярац) і, урэшце, дні свае залатыя. Па сутнасці была складзена адметная паэтычная анталогія краявідаў Палесся, яе някідкай, на першы погляд, але такой захапляльнай прыроды. Найбольш яскрава ўсё гэта ўвасоблена ў паэзіі Міхася Башлакова, які маляўніча і экспрэсіўна заявіў сябе песняром роднага краю. Хаця ўжо даўно Міхась Башлакоў жыве ў сталіцы, Палессе з яго незабыўнымі краявідамі і водарам, які адчуваецца амаль фізічна за словамі, па-ранейшаму застаецца для паэта крыніцай натхнення.

Подыхам сапраўднай замілаванасці прыгажосцю сусвету з яго такімі рэальнымі і ў той жа час выключна таямнічымі аспектамі існавання прасякнута пастэльная, акварэльная лірыка Віктара Яраца.

Новы этап паэтычнай гісторыі універсітэта звязаны з імем Анатоля Сыса, асобы таленавітай, шчодра адоранай, няўрымслівай, падчас непрадказальнай. Яго кіпучая энергія не заўсёды знаходзіла адэкватны выхад, што, як вядома, уласціва амаль усім творчым натурам. Ён праходзіць складаную эвалюцыю, паклаўшы пачатак яшчэ адной цікавай тэндэнцыі.

Якраз з часоў А. Сыса найбольш таленавітыя і ўпартыя вырашылі штурмаваць Мінск, здабываючы менавіта ўжо там славу і прызнанне. Ехалі яны зусім не правінцыяламі — амбіцыі і спадзяванні былі немаленькія. І ў значнай ступені — рэалізаваліся. Іменна нашы выпускнікі былі сярод заснавальнікаў таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя", якое кінула выклік традыцыям застою, заспакаення, халтуры ў літаратуры. Па-рознаму можна ацэньваць дзейнасць згаданага аб'яднання, але, самае галоўнае, яно ўскалыхнула спакойную плынь літаратурнага і культурнага жыцця рэспублікі. І гэта была не проста чарговая змена пакаленняў, не чарговае рушэнне аўтарытэтаў, бяздумная барацьба па тыпе — "у рожкі са старымі". Маладыя неслі сапраўды новае — і светабачанне, і светаўспрыманне і яго ўвасабленне. Яскравы прыклад: удумёны, засяроджаны Эдуард Акулін, які наважыўся паўтарыць подзвіг Максіма Багдановіча: адштурхоўваючыся ад "Санета" вялікага кніжніка, ён прыўнёс у нашу паэзію акрапаэму, а потым згадаў віланель, рытурнель, канцону, ронда, трыялет, тэрцыны... Той самы Э. Акулін стаў не толькі пранікнёным лірыкам, але і слынным бардам, лаўрэатам многіх фестываляў аўтарскай песні. І ён не застаўся адзінокі. Хутка ўсе пачулі і належна ацанілі захапляльны голас Вальжыны Цярэшчанкі, якая, увабраўшы традыцыі спеўнай Гомельшчыны, пералажыла на матыў сваёй душы класічныя радкі айчыннай паэзіі. Прызнаным бардам лічыцца цяпер і Андрэй Мельнікаў, пераможца многіх хіт-парадаў.

А згадаем нашых паэтэс. Надзеяй новай паэзіі называюць Ларысу Раманаву, пра творчую манеру якой некаторыя крытыкі сцвярджаюць, што яна не піша, а выцягвае свае вершы. Шчырую споведзь складанай, таямнічай душы жанчыны, што далучаецца да шматфарбнага, супярэчлівага, грознага свету, уяўляе сабой лірыка Вольгі Куртаніч. Вачыма філософа, які вызначае вартасць існавання, сутнасць часу і нашага яго ўспрымання, глянула на свет Ірына Багдановіч.

Гаворка пра слаўны гомельскі "дэсант" будзе няпоўнай, калі мы не згадаем арыгінальнага празаіка Анатоля Казлова, які здолеў у сваіх творах паяднаць у адно цэлае фантастычнае і рэальнае, штодзённы побыт і містыку.

Дамінантны аспект мастацкага свету празаіка — своеасаблівая філасофская паэтычнасць яго прозы, што ствараецца за кошт узвышэння над жыццём прадмета. Абвостранае пачуццё болю за лёс чалавека, Бацькаўшчыны выявіла яшчэ адну грань творчасці А. Казлова — грамадзянскую адказнасць мастацкай літаратуры за захаванне чалавечага ў чалавеку.

А. Казлоў у сваёй творчасці арганічна спалучае дзве, здавалася б, дыяметральна супрацьлеглыя тэндэнцыі ў сучаснай літаратуры. З аднаго боку, гэта схільнасць да выкарыстання ўмоўных сітуацый і матываў, а з другога — узмацненне непасрэдна пачуццёвага, эмацыянальнага пачатку. Калі першая з асаблівасцей характэрна для прозы пісьменніка, то другая ўласціва ягонай публіцыстыцы.

Зямля Гомелышчыны — унікальная, спеўная, меладыйная, паэтычная. Тут гучалі радкі несмяротных "Словаў" Кірылы Тураўскага яшчэ ў XII ст. І гэтая зямля нараджала і яшчэ народзіць не адно пакаленне талентаў, якія здабываць асвету ў сценах галоўнай навучальнай установы Палесся — Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.

Іван ШТЭЙНЕР

Інтэрнет падпіску не заменіць

Ажыятажу вакол падпіскі, нават на самыя папулярныя ці дэфіцытныя некалі выданні, цяпер няма, так што ў зале магілёўскага паштамта падчас чарговай падпісной кампаніі нічога надзвычайнага не адбывалася. Зрэшты, мы ішлі сюды не паназіраць за чародкамі наведнікаў, а распытаць людзей кампетэнтных пра тое, як сёння выпісваюць на Магілёўшчыне газету "Літаратура і мастацтва". І пагутарылі з начальнікам аддзела распаўсюджвання друку магілёўскага філіяла РУП "Белпошта" Таццянай КОСЦІНАЙ.

"Начальнік падпіскі", як адрэкамендавалі Таццяну Аляксандраўну яе калегі, адразу папярэдзіла: будзем гаварыць толькі пра паказчыкі па раённых вузлах паштовай сувязі на пачатак гэтага года і, зразумела, без уліку статыстыкі рознічнага продажу газеты.

Хвала камп'ютэрызацыі! Праз хвіліну я трымаю перад сабой лісток з табліцай, у якой — пералік вузлоў сувязі Магілёўшчыны. Пустыя клетачкі запаўняю сама, лічбамі, якія называе Таццяна Аляксандраўна. І што ж атрымліваецца? З 1 студзеня 2009 года ў Бялыніцкі раён па падпісцы паступала 15 асобнікаў "ЛіМа", у Бабруйскі — 20, Краснапольскі — 7, Быхаўскі — 6, у Глускі, Горацкі, Круглянскі, Хоцімскі — па 5, у Дрыбінскі — 3, а ў Клічаве выпісвалі толькі 1 (адзін!) экземпляр тыднёвіка. Найлепшыя паказчыкі па вузлах сувязі ў Кіраўску — 33, Асіповічах — 24, Шклове — 22. Рэкордная лічба — 38 — адносіцца да Магілёўскага РВПС, сам жа абласны цэнтр атрымліваў на пачатку года ўсяго 15 нашых газет. Агульная лічба падпіскі на "ЛіМ" па Магілёўшчыне ў студзені — 282 экземпляры.

Механізм падпіскі даволі складаны, таму не варта рабіць катэгарычныя высновы наконт яе статыстыкі. Хаця звычайна мы, падводзячы вынікі чарговай падпісной кампаніі, робім гэта фармальна і павярхоўна: глядзім на лічбы, параўноўваем іх дынаміку. А ведаем жа, што ўсялякая статыстыка — рэч адносная і вымагае канкрэтызаванага аналізу. Адкуль, напрыклад, браўся славуты працэнт спісання газет у шапіках? Дапусцім, у продаж паступіў 1 экземпляр "ЛіМа" і 20 — масавага выдання; "ЛіМ" ляжаў на паліцы за спінай прадаўца, іншае выданне — на прылаўку; праз тыдзень у кіяскёра заставаўся 1 экземпляр "ЛіМа" і 10 — іншага выдання, на падставе чаго рабілася выснова пра рэгулярнае стопрацэнтнае (а гэта гучыць як смяротны прысуд!) і 50-працэнтнае спісанне адпаведна...

Папрасіўшы сваю суразмоўцу пракаменціраваць названыя ёю лічбы, я пачула мудрыя і пераканаўчыя развагі. Пра што гаварыла Т. Косціна? Пра тое, што апошнім часам прыкметна зменшылася падпіска на ўсе выданні. Да таго ж, калі раней падпіска на раён фінансавалася, скажам, з бюджэту абласной бібліятэкі, дык цяпер гэта "перакінута" на раённы бюджэт. Ведамствы, якія зазвычай падтрымлівалі стабільнасць тыражоў, змушаныя эканоміць свае сродкі. А на чым у нас прывыклі эканоміць? На жаль, на культуры. І адказныя за падпісную кампанію адштурхоўваюць адпаведныя выданні. Наўрад ці ўсцешаць індывідуальныя паказчыкі, бо неспрыяльныя фінансава-эканамічныя працэсы адбіваюцца на сямейным бюджэце, і людзі мусяць адмаўляцца нават ад выдання, якое выпісвалі шмат гадоў.

Таццяна Аляксандраўна слушна заўважыла, што падпісныя звесткі варта суадносіць і з колькасцю насельніцтва, каб не памыліцца ў высновах наконт актыўнасці пэўных раёнаў. На Магілёўшчыне, дзе колькасць жыхароў у параўнанні з 2001 годам зменшылася на дзесяткі тысяч чалавек, пераважаюць гарадкі, мястэчкі, вёскі з нешматлікім насельніцтвам. На Бабруйшчыне жыве 239 тыс., у Горацкім раёне — 51 тыс., у Магілёўскім — 42 тыс., на Быхаўшчыне ды Крычаўшчыне — па 35 тыс., на Шклоўшчыне — 32 тыс. чалавек, а на Краснапольшчыне — 11 тысяч. Параўнаўшы гэтыя лічбы з адпаведнымі падпіснымі дадзенымі, якія называліся вышэй, міжволі заўважыш: самая гаротная дэмаграфічная сітуацыя ў Краснаполлі, а газета творчай інтэлігенцыі там, здаецца, больш запатрабаваная, чым у горадзе студэнтаў — Горках.

Работнікі паштовай сувязі актыўна спрычыняюцца да падпісных кампаній. Запрашаюць для іх супольнага правядзення калектывы мясцовых рэдакцый. Ладзяць Дні падпісчыка. Рэдакцыі газет (у тым ліку і рэспубліканскіх) паводле сваіх крытэрыяў праводзяць конкурсы паштальёнаў. Дарэчы, у Магілёўскай вобласці — 1400 паштальёнаў. Ці могуць яны паўплываць на сваіх кліентаў у выбары выдання? Як сцвярджае Т. Косціна, "агітаваць за адно выданне ва ўрон іншаму" паштальён не мае права. Ён можа толькі дапамагчы падпісчыку зарыентавацца ў разнастайным тэматычным спектры газет і часопісаў. Калі выданне дае свой рэкламны матэрыял, яго размяшчаюць у аддзяленнях паштовай сувязі ці перадаюць грамадскім распаўсюджвальнікам друку, сярод якіх ёсць захопленыя энтузіясты.

"Калі мы прывязём у Магілёў сваю рэкламную ўлётку, яе вывесяць на інфармацыйным стэндзе паштамта?" — "Абавязкова! — кажа Т. Косціна. — Хаця гэта, вядома ж, не гарантуе павелічэння падпіснога тыражу. Я наогул не бяруся гаварыць пра ўзровень цікавасці нашых падпісчыкаў да выданняў культурнага кірунку. Сёння масавых чытачоў цікавяць, пераважна, праграма тэлебачання, месяцавыя календары з рэкамендацыямі на тэму "Сад і гарод", публікацыі пад рубрыкай "Здароўе". Ды і да выданняў такога зместу цікавасць падае, чаму ў Магілёве, прынамсі, спрыяе і распаўсюджванне бясплатнай газеты накладам 40 тыс., кшталту сталічнай "Минск на ладонях". Людзі стараюцца эканоміць на ўсім. Аддаюць перавагу мясцовай прэсе, дый з яе выбіраюць не больш змястоўнае выданне, а што танней".

"Дык ці ёсць, Таццяна Аляксандраўна, святло ў канцы тунеля?" — "Напэўна, усё-ткі ёсць, — усміхаецца мая суразмоўца і працягвае разважаць ужо больш аптымістычна. — Не можа памерці падпіска! Мажліва, цяпер сам па сабе цяжкі час. Многае апраўдваюць крызісам, змяншэннем бюджэтнага фінансавання. Многае "спіхваюць" на камп'ютэр: маўляў, ён усё роўна забярэ чытачоў у друкаваных СМІ. Няпраўда! Існуюць побач, дапаўняючы адно аднае, радыё, тэлебачанне, тэатр, кіно, кнігі, газеты. Інтэрнет мае свае перавагі, але патрымаць у руках газету — гэта не тое, што азнаёміцца з яе электроннай версіяй, зусім іншае адчуванне. І праблема не ў наступленні Інтэрнета: проста ніхто сур'ёзна не займаецца тым, каб прывучыць моладзь да культуры чытання. Ужо не кажу пра ўзровень выхавання культуры наогул. Абавязаць жа чытачоў выпісваць пэўнае выданне практычна немагчыма. Іншая справа, калі само ведамства праявіць зацікаўленасць у распаўсюджванні па сваёй галіне адпаведных дзяржаўных газет, часопісаў, падтрымае іх, будзе рэкамендаваць спісы такіх выданняў, напрыклад, бібліятэкам ці спецыялізаваным навучальным установам. А яшчэ трэба займацца рэкламай. Чым часцей выданне, яго назва, будзе навідавоку і на слыху, тым больш у яго шанцаў прыцягнуць увагу чытачоў і падпісчыкаў".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: начальнік аддзела распаўсюджвання друку магілёўскага філіяла РУП "Белпошта" Таццяна Косціна; будынак магілёўскага паштамта.

Фота Віктара Кавалёва

Пра тых, хто па-за тэкстам

Звычайна, трымаючы ў руках тую ці іншую кнігу, чытач не задумваецца над тым, як кніга ўбачыла свет. Калі імя аўтара — пісьменніка ці вучонага — пазначаецца на вокладцы, то імёны вытворцаў друкаванай прадукцыі — паліграфістаў, усіх тых, хто надае словам матэрыяльнае ўвасабленне, застаюцца як бы за кадрам і па-за тэкстам. Хіба што на апошняй старонцы дробным шрыфтам убачыш два-тры прозвішчы — тэхнічнага рэдактара ці карэктара, або дызайнера вокладкі.

Нядаўна, пры выданні ў Брэсцкай друкарні сваёй кнігі, мне давялося блізка пазнаёміцца з самім працэсам "вытворчасці" друкаванага слова. Пра гэтае таінства і хачу распавесці.

Вытворчасць друкаванага слова

Пройдзем па тэхналагічным ланцужку шлях нараджэння паліграфічнай прадукцыі ў друкарні і пачнём з мазгавога штаба — вытворчага аддзела. Начальнік аддзела Алена Латышкевіч, хоць чалавек і заняты, але сустракае нас вельмі прыветна. У абавязкі аддзела ўваходзіць каардынацыя і суправаджэнне ўсіх этапаў работы, пачынаючы ад паступлення заказу і да яго выканання, і ўсё гэта — згодна з планам вытворчасці друкаванай прадукцыі і графікам выхаду газет у адпаведнасці са строгімі стандартамі прадпрыемства. Нягледзячы на непазбежныя няўвязкі, дробныя паломкі складанага паліграфічнага абсталявання...

Вытворчасць друкаванай прадукцыі ўключае ў сябе і працэс дадрукоўнай падрыхтоўкі, працэс друкавання, паслядрукоўныя працэсы, звязаныя з упакоўкай, захаваннем і прадстаўленнем спажыўцам гатовых вырабаў.

Пры дадрукоўнай падрыхтоўцы са мною, як з аўтарам-заказчыкам, працавалі аператар Людміла Церахава і спецыяліст-камп'ютэршчык Андрэй Наварыч. Людміла Аляксееўна з дапамогай камп'ютэрнай тэхнікі ажыццяўляе набор, вёрстку і раздрукоўку на прынтэры, а Андрэй Анатольевіч выконвае сканіраванне і апрацоўку фотаздымкаў. Сказана коратка і суха, але за гэтым, у скрупулёзных абмеркаваннях і зменах формы набору на экране, выкрышталізоўваліся старонкі будучай кнігі. Паралельна гэтыя ж два спецыялісты былі занятыя абавязковымі тэхналагічнымі аперацыямі, звязанымі з падрыхтоўкай выпуску газет, якія рыхтаваліся ў рэдакцыях і былі дасланыя ў друкарню на электронных носьбітах.

Раздрукаваныя адбіткі з нарад-заказамі перадаюцца майстрам участка (старанны малады спецыяліст, выпускнік Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта Раман Шабуня) потым — на вычытку карэктарам. Пасля першай карэктуры тэксты з праўкамі вяртаюцца да аператара на дапрацоўку, пасля другой карэктуры па камп'ютэрнай сетцы інфармацыя перадаецца на найноўшае абсталяванне прамога экспаніравання друкаваных форм. Пасля кантролю іх выканання майстрам, нарад-заказы ў камплекце з падрыхтаванымі друкарнымі формамі перадаюцца на ўчастак раздрукоўкі.

Працэс друкавання прадукцыі ўключае ў сябе расфлактоўку (размотванне рулонаў), рэзку паперы на спецыяльных машынах і друкаванне. Пры гэтым майстар участка таксама выконвае кантроль першага адбітку, пасля чаго друкар выконвае працу ў поўным аб'ёме. Пасля праверкі друкаванай прадукцыі кантралёрам яна перадаецца ў пераплётны ўчастак, дзе кнігі "апранаюцца" ў вокладкі. Тэхналогія вытворчасці вокладак у каляровым і чорна-белым варыянтах таксама ўяўляе сабой унікальны працэс, які ажыццяўляецца з дапамогай камп'ютэра. А перад гэтым, ідучы па цэху, адчуваеш трапяткое пачуццё, кранаючыся рукой тысяч і тысяч раскладзеных на стэлажах, але яшчэ не збрашураваных старонак будучых кніг — скарбонак чалавечых думак.

Неабходнае пасляслоўе

Пра дзяржаўную значнасць работы ААТ "Брэсцкая друкарня" гаворыць тое, што ў зацверджаным кіраўніцтвам краіны спіску прадпрыемстваў стратэгічна важных для Беларусі, у ліку 162-х адкрытых акцыянерных таварыстваў ёсць і Брэсцкая друкарня.

Галоўная каштоўнасць друкарні — людзі, большасць якіх "зраслася" з прадпрыемствам, аддала яму сваё сэрца і душу. У ліку такіх хацелася б назваць Аляксея Шамецюка, Вячаслава Гуцяка і дырэктара прадпрыемства Васіля Каленікава, які працуе ў друкарні больш як дваццаць гадоў. Паводле слоў дырэктара, спачатку абласныя і раённыя друкарні прызначаліся ў першую чаргу для друкавання газет. Але цяпер толькі ў адной Брэсцкай вобласці функцыяніруе тры цэнтры друку — у Брэсце, Баранавічах і Пінску. І разам з газетамі, якія ў агульным аб'ёме займаюць чвэрць вытворчасці, выпускаецца шырокі спектр кніжнай прадукцыі. Кнігі масавымі тыражамі Брэсцкая друкарня пачала выдаваць каля дзесяці гадоў таму. І паліграфісты ганарацца сваёй прадукцыяй. Пра яе якасць сведчаць дыпломы рэспубліканскага конкурсу "Мастацтва кнігі", а таксама шматлікія ўзнагароды за лепшы дызайн і дасягненні ў выпуску папярова-белавых тавараў.

Аляксандр ЮДЗІЦКІ

Меркаванне

Шэсць прычын не любіць крытыкаў

Апошнім часам размова паміж пісьменнікамі і крытыкамі ўсё часцей нагадвае дзіцячую гульню ў сапсаваны тэлефон: чым менш паразумення, тым весялей. Першыя скардзяцца на тое, што іх не разумеюць і недаацэньваюць, другія выказваюць пераканане, што крытыка ўвогуле ніводнаму мастаку слова не патрэбная. Складаецца ўражанне, што пісьменнікі і крытыкі — людзі з розных планет, з абсалютна розным менталітэтам, хаця працуюць яны ў адной культурнай прасторы і аднолькава зацікаўлены (вядома, у ідэале) у плённым развіцці беларускай літаратуры... Аднак факт застаецца фактам: паразумення няма, і літаратуры карысці ад гэтага мала. Магчыма, ёсць сэнс абмеркаваць праблему?

На маю думку і мой невялікі пакуль што ў гэтай справе досвед, ёсць некалькі асноўных прычын, якія ствараюць перашкоды ў паразуменні паміж крытычным і пісьменніцкім лагерамі.

1. Пісьменнік абсалютызуе мастацкую задуму. З гэтым даводзіцца сустракацца даволі часта. Аўтар апавядання, аповесці, рамана і г. д. чамусьці пераканаць, што калі ён меў на ўвазе добрую, патрыятычную ідэю, то і твор аўтаматычна атрымаецца высокамастацкім. Не можа быць дрэнным тое, што рабілася з найлепшымі памкненнямі. Крытык у канцы гэтага сказа ставіць пытальнік, ён шукае раўнавагу паміж задумай і яе мастацкім увасабленнем. Ідэю можна выказаць некалькімі словамі ў прыватнай размове ці некалькімі абзацамі ў публіцыстычным артыкуле. Калі ж перад чытачом мастацкі твор, то ён у першую чаргу павінен адпавядаць эстэтычным крытэрыям. Калі ж пра твор гэтага сказаць нельга, то ён не мае літаратурнай каштоўнасці, якой бы цудоўнай ні была асноўная ідэя і якімі б высакароднымі ні былі галоўныя героі. І крытык павінен звяртаць увагу найперш на гэта.

2. Пісьменнік абсалютызуе кантэкст уласнай творчасці: калі я напісаў нешта такое, чаго раней не пісаў, то гэта навінка ў літаратуры. Сапраўды, пачынаючы працаваць у новым для сябе жанры альбо пераходзячы з прозы ў паэзію (ці наадварот), аўтар настолькі захоплены адчуваннем навізны ў творчасці, што не заўсёды ў стане ацаніць ступень актуальнасці гэтых адкрыццяў для ўсёй літаратуры. Асцярожна, удаючы сціплую збянтэжанасць, пісьменнікі часам кажуць пра якісьці свой твор: "Здаецца, такога ў нашай літаратуры яшчэ не было..." Крытык жа асэнсоўвае мастацкія здабыткі ў кантэксце развіцця ўсёй літаратуры, найперш, вядома, беларускай, але не забываецца і пра далёкіх і блізкіх суседзяў. Зварот да новых, не ўласцівых канкрэтнаму пісьменніку формаў і тэм, безумоўна, сведчыць пра чарговую (не заўсёды вышэйшую) прыступку па лесвіцы яго творчай эвалюцыі. Аднак зусім не абавязкова гэта стане новым словам у літаратуры ўвогуле. І калі яно так і ёсць, то гаворка ідзе не пра недаацэнку, як мяркуе пісьменнік, а пра адэкватную ацэнку, як мяркуе крытык.

3. Пісьменнік чакае пахвалы. Маё цвёрдае пераканане: пісьменнікаў, якіх сапраўды цікавіць сур'ёзная і шчырая ацэнка іх твораў, можна пералічыць па пальцах адной рукі. Калі ж паглядзець, як рэагуе большасць творцаў на крытычныя заўвагі, нават нязначныя, то атрымліваецца, што крытык не прызнаецца прафесіяналам, крытыцы адмаўляецца ў прафесійным статусе. Як тады яшчэ можна растлумачыць тое, што задачай крытыка пісьменнік лічыць не аналіз твора, а яго рэкламу?

Крытык не хваліць і не ганіць, а робіць аналіз і дае ацэнку. Ён разглядае пісьменніка як прафесіянала, таму ні біяграфія, ні чалавечыя якасці не ўлічваюцца пры напісанні рэцэнзіі. Крытык імкнецца да дыялога, дыскусіі, а пісьменніцкі слых настроены толькі на хваласпеўны солад. Мне здаецца, што адмаўляючыся абмяркоўваць свой твор, прымаць розныя ацэнкі, пісьменнік і сабе адмаўляе ў прафесійнасці. "Які ты ў мяне разумны, які таленавіты, які самастойны," — гэта фразы з лексікона мамы, знаёмыя кожнаму з дзяцінства. У іншых жыццёвых сферах і лексіка іншая.

4. Пісьменнік адмаўляе магчымасць творчай няўдачы. Толькі аднойчы давялося пачуць такое прызнанне з вуснаў самога аўтара. У абсалютнай большасці выпадкаў пісьменнікі проста няздольныя дапусціць думку, што з-пад іх пяра можа пайсці ў свет твор, няварты друку. Ёсць у жанчын такая ўсім вядомая хітрасць: калі ва ўборы ці прычосцы выявіўся недагляд, то трэба рабіць выгляд, што так і трэба, так і было задумана. Тады ніхто, хутчэй за ўсё, не заўважыць. Нешта падобнае робяць і пісьменнікі: недапрацаванасць, размытасць сюжэта можна назваць імпрэсіяністычнасцю, зацягнутасць растлумачыць філасофскай насычанасцю, ненатуральнасць дыялогаў прасцей за ўсё спісаць на аддаленасць герояў адно ад аднаго і г. д. Ну, а нагрувашчванне бессэнсоўнага набору прыгожых слоў і метафар — увогуле найлепшы спосаб выявіць сваю творчую адметнасць. Знойдуцца тысячы аргументаў "за", усё, што заўгодна, акрамя кароткай эўфемістычнай фразы: гэта не самы ўдалы мой твор. Крытык не разглядае творчы працэс як непарыўны ланцужок шэдэўраў, а таму спакойна расцэньвае мастацкія няўдачы як заканамерныя этапы творчага шляху і не бачыць у гэтым "крыміналу". Наадварот, суцэльныя дыфірамбы цягам усяго творчага жыцця выклікаюць сумневы ў іх шчырасці. Чамусьці пісьменнік сам факт напісання твора лічыць тоесным вартасці яго надрукавання ў той час, як колькасць выдаткаваных на напісанне эмоцый, энергіі, сіл і — нарэшце — часу не з'яўляецца паказнікам мастацкай якасці.

5. Пісьменнік настолькі пераканаць ў сваёй таленавітасці, што з вялікай цяжкасцю дапускае думку, што некаму яго твор сапраўды можа не спадабацца. А менавіта таму: калі рэцэнзія не станоўчая, значыць, заказная. Усё гэта "проіскі" ворагаў і нядобразычліўцаў. Атрымліваецца, што некаторая частка пісьменнікаў лічыць крытыкаў функцыянерамі і адмаўляе ім ва ўласным эстэтычным гусце. Ніводзін крытык, які сябе паважае, не будзе пісаць рэцэнзію з нечай установкі. Калі і сутыкнецца з нейкімі этычнымі меркаваннямі (напрыклад, няёмка крытыкаваць пісьменніка вельмі паважанага ўзросту альбо таго, хто знаходзіцца ў цяжкім псіхалагічным стане, і г.д.), то ў такой сітуацыі не напіша пра твор нічога. Калі мне задаюць пытанне: "Хто вам даў заданне напісаць такую рэцэнзію?", я адказваю: "Сам аўтар, напісаўшы такую кнігу".

Тут трэба зрабіць прызнанне. Ёсць у крытыкаў вялікі грэх: яны, як правіла, арыентуюцца на ідэальнага чытача, а таму аналізуюць твор з "ідэальных", "абсалютных" пазіцый. Бывае ж так: крытыкі ацэньваюць твор, мякка кажучы, не вельмі высока, а ў пэўнай чытацкай аўдыторыі ён карыстаецца вялікай папулярнасцю. Вось тут ужо варта разглядаць праблему літаратурнага трохкутніка "пісьменнік — чытач — крытык". Пра сучаснага чытача і, у прыватнасці, чытача сучаснай беларускай літаратуры амаль ніколі не пішуць. І ён сам не так часта ўмешваецца ў інтымны (хаця і публічны) дыялог паміж аўтарам твора і яго рэцэнзентам...

6. Аднак нават пры наяўнасці ўсяго пералічанага адсутнасць паразумення не была б такой невырашальнай праблемай, калі б не адзін момант. Пісьменнікі схільныя атаясамліваць стаўленне крытыка да твора з адносінамі да яго самога як чалавека. Неаднойчы даводзілася сутыкацца з тым, што "недаацэненыя" мной аўтары, ні разу са мной не сустрэўшыся, былі пераканаць, што я іх калі не ненавіджу, то, прынамсі, маю відавочную непрыязь. Насамрэч крытык працуе найперш з тэкстам, аналізуе твор, а не чалавечыя якасці, і таму (калі няма асабістай прадузятасці) ніякай антыпатыі з-за няўдалай метафары да Івана Пятровіча ці Пятра Іванавіча адчуваць не будзе.

Ёсць магчымасць дыялога. Пытанне ў тым, ці ёсць у гэтым зацікаўленасць.

Жанна ЗАПАРТЫКА

Выдавецтва "Кнігазбор" нядаўна выпусціла ў свет дзве кнігі — "Трижды проклятая власть" і "Землей крещенные". Іх аўтарам з'яўляецца Аляксей Сазанчук.

Гісторыі суровай Поўначы

Раман "Трижды проклятая власть" ахоплівае цяжкі як для Расіі, так і для Беларусі перыяд 1996—1999 гг. Падзеі адбываюцца ў Сібіры. Раман прысвечаны праблемам Поўначы і людзям, якія працуюць там у цяжкіх умовах. Сапраўды, Поўнач усіх правярае на права называцца Чалавекам.

"Погляд збоку на складаныя працэсы сённяшняй рэчаіснасці ў пісьменніка па-мастацку вывераны, адлюстроўвае працэс постсавецкай адаптацыі нашага грамадства. Гэта важна яшчэ і таму, што сённяшні рознаўзроставы чытач мае неадназначныя погляды на працэсы, якія адбываліся ў 1990-я гады.

Адкрытая сур'ёзная размова пісьменніка з зацікаўленым чытачом дае, на мой погляд, магчымасць для пэўнага самааналізу, абуджэння і ўмацавання самасвядомасці, нераўнадушша да лёсу Айчыны.

Асабліва выразна гэта адчуваецца пры знаёмстве з другой часткай рамана Аляксея Іванавіча пад назвай "Землей крещенные".

Твор аўтара — не вынік лёгкаважнай фантазіі, а бурлівая плынь пачуццяў і адчуванняў, убачанага і захаванага ў памяці. Героі яго рамана — блізкія людзі, жыццё якіх яму вядома да дробязей. Празаік не выдумваў, а толькі карэкціраваў у літаратурным плане характары суайчыннікаў, захоўваючы, па магчымасці, іх дакладнасць.

Мне як гісторыку імпануе дакументальна-храналагічнае "пано", арганічна ўпісанае раманістам у жыццёвыя пуцявіны персанажаў кніг. Дадатна і тое, што аўтар карэктна, ненавязліва пакідае магчымасць чытачу паглядзець на сябе праз прызму часу, задумацца аб сваім сённяшнім прызначэнні. І сапраўды, чытаючы раман Сазанчука, бачыш лёс і характар беларусаў у віры неадназначных падзей і працэсаў, адчуваеш роднаснасць душ і памкненняў суайчыннікаў.

Вядома, не ўсё ў кнігах выглядае бясспрэчна ў трактоўцы вызначальных момантаў разглядаемага аўтарам перыяда айчыннай гісторыі. Але нельга не адзначыць блізкасць лёсаў герояў кніг кожнаму з нас; гэты выклікае душэўны ўздым і жаданне актыўна ставіцца да ўсяго, што грае вызначальную ролю ў развіцці беларускай нацыі. А гэта дорага каштуе!

Думаецца, што кнігі А. Сазанчука знойдуць шлях да масавага чытача.

Уладзімір ЯГОРЫЧАЎ

Лірыка сцішаных перажыванняў

Некалі Сяргей Дубавец у сваім артыкуле «Тры паэзіі», што сёння ўжо стаў «праграмным», адзначыў: «Кожнага разу, калі думаю пра паэзію, я думаю пра жанчыну. Пакуль ёсць жанчына — нараджаюцца вершы... Як у прозе эталонам ёсць усё ж такі мужчынская проза, так у паэзіі — усё ж такі жаночая паэзія». Гэтыя словы крытыка цалкам стасуюцца да мазырскай паэткі Наталлі Марціновіч, аўтара паэтычнага зборніка «Вечаровы твар».

В. Вейдле адзначаў: «Стихи не гнездятся в интеллекте». Пры чытанні вершаў Н. Марціновіч не з'яўляецца адчування надуманасці, штучнасці. Такое ўражанне, што вершы да яе сапраўды «прыходзяць», нараджаюцца самі. Яны спеўныя, музычныя, меладычныя:

Мне снілася прыгажосць.
Яе сумнаватае сола
Выманьвала ціха душу
З нерухомага цела,
І тая цякла безаглядна
За гукамі ў сад,
Які нараджаўся паволі
На століе і сценах пакоя
З шэрых пялёсткаў абуджаных ценяў.

Кажуць, што калі чалавеку Богам дадзены талент, то ён выяўляецца ў многіх галінах. У жыцці Н. Марціновіч побач з паэзіяй годнае месца займае і жывапіс, што надзвычай выразна праяўляецца ў паэтычнай творчасці. Творы Н. Марціновіч нагадваюць накцюрны Ф. Шапэна («Ад сонца зямля адлятае», «Мне снілася прыгажосць», «На дно туманаў і дажджоў», «Дзень залаты зазіраў у пакоі»). Пэўна, тут праяўляецца музычная адукацыя паэткі, яе праца, звязаная з музыкай. Нездарма існуе меркаванне, што паэзія — гэта музыка ў слове.

Вершы Наталлі Марціновіч разгортваюцца як музычны твор, пералівамі, пераходамі, плаўным цячэннем думкі:

Пачнём так:
Пад зыбка-залатой коўдрай мора
на пяшчотнай маціцовай
прохаладзі дна
дзве цупкія далоні
хаваюць спакой і паўзмрок.

Аднойчы нешта вабна і ціха
пазвініць недзе побач —
вабна і ціха,
вабна і ціха...

Расчыняцца палавінкі,
спакой пацячэ прэч,
а ў ракавіну ліне
святло і вецер струменяў.

Як мазыранка Наталля Марціновіч звяртаецца ў сваёй творчасці да роднага горада: *"Мой горад аблюбаваны вятрамі.//Тут яны нараджаюцца // і гойдаюцца ў сваіх калысках. //Тут яны ўпершыню скрыжоўваюць //Белыя клінкі"*.

Парадаксальнасць мыслення, нечаканыя пераходы думкі сведчаць пра глыбіню і філасофскі склад яе натуры («Мэта», «Птушка Фенікс», «Ісціна», «Кампрамісы», «Паралелізм»): *"Маналог: бясконцая прамая, // якая абышла зямны шар // і замкнулася на самой сабе. // Дыялог, як асобная форма // маналога, яшчэ болей беззнадзейны: // гэта дзве прамыя, //якія абышлі зямны шар // і замкнуліся на саміх сабе"*.

Жанчынам, істотам кволым і пяшчотным, цяжэй пераадольваць цяжар жыцця. Што тады казаць пра жанчыну, надзеленую боскім дарам прыгажосці, таленту — пра жанчыну-паэтку? Н. Марціновіч задаецца адвечным пытаннем:

Дзе ж тады, за якою мяжою
Звычны клопат зямны застаецца?
І з чаго пачынаецца тое,
Што мастацтвам, натхненнем завецца?

Шмат вершаў прысвячае Н. Марціновіч каханню, стыхіі, такой блізкай і натуральнай для жанчыны («***Здавалася б — чаго прасцей», «***Ну вось, я цябе і забыла», «Жарт-фантазія», «***Дзякуй табе, лістапад», «Паездка»). Паэтка выяўляе складанасць, супярэчлівасць гэтага пачуцця, калі побач — боль і радасць, смутак і слодыч, горыч і асалода. Н. Марціновіч — тонкі псіхолаг, здольны перадаць дыялектыку найскладанейшых чалавечых пачуццяў. Жанчына ў яе выяўленні паўстае то пяшчотнай, то какетлівай, то кволай і бездапаможнай, то рашучай і дзейснай. Менавіта ў каханні найпаўней і праяўляецца сутнасць жаночай душы.

У Н. Марціновіч вельмі добрая мова, адчуваецца натуральная беларуская стыхія, заглыбленасць у свет нацыянальнага. Вядома, што беларусы вельмі блізкія да прыроды, навакольнага асяроддзя:

Не заўважыла, што кроны вербаў
Ды бяроз да сэрца прыраслі
І перапляліся — разам з небам,
З птушкамі, што гнёзды ў іх звілі.

Творчасць Наталлі Марціновіч належыць да імпрэсіяністычнай плыні ў сучаснай беларускай паэзіі, лірыкі сцішаных, інтымных духоўных перажыванняў.

Анжэла МЕЛЬНІКАВА

Каб не здаралася канфузаў...

Свае ёсць музы у паэтаў.
Хто ж у мяне? Напэўна, муз...
І гэты муз ідэю гэтую
Прынёс, каб здарыўся канфуз...

Кацярына Савіцкая

Несапраўдная сапраўднасць

Чарговы нумар "Полымя", безумоўна, усцешыць чытача аповесцю Міколы Адама — "Насця". Адразу трэба адзначыць, што з творам Кузьмы Чорнага з падобнай назвай "Насцечка" аповесць М. Адама не мае нічога агульнага.

Для аматараў паэзіі М. Адама стыль, якім напісана аповесць, і, зрэшты, тэматыка, не будзе нечаканай, — усё гэта адпавядае таму пісьменніцкаму вобразу, які паспеў стварыць сябе ў літаратуры М. Адам. Галоўны герой падкрэслена і настойліва атаясамліваецца з асобай аўтара. Ён — беларускі пісьменнік, якога ўсе клічуць Адамам, ён прыходзіць пацікавіцца рэдакцыйнымі навінамі па адрасе Захарава, 19... Увогуле, мінскія рэаліі напаўняюць твор, яны пазнавальныя і пазначаныя сваімі сапраўднымі адрасамі. Праўда, час дзеяння высвятляецца толькі ў заключнай фразе: *"...Насця загінула на Нямізе ў тую крывавую нядзелю, калі... Ды што толку, калі яе няма!!!"*

Паколькі галоўны герой — пісьменнік, то лагічна было пачаць твор з напісанага гэтым пісьменнікам... твора. Займае ён, праўда, толькі дзве старонкі, не мае ні пачатку, ні канца, але выступае ў якасці своеасаблівай "тлумачальнай даведкі", у якой тлумачыцца паходжанне сур'ёзнай траўмы галавы Адама.

Аднак для тых, хто аддае перавагу строгай паслядоўнасці развіцця сюжэта і несупярэчлівасці развіцця характараў, твор падасца незразумелым. А незразумелага сапраўды шмат: Насця — каханка галоўнага героя — апынаецца ў яго кватэры праз нейкі час пасля адной кароткай выпадковай сустрэчы, не ведаючы адрасу і не маючы ключоў; герой нідзе не працуе, аднак усім расказвае, што аднымі ганарарамі сыты не будзеш; у прыступе п'янай рэўнасці герой сваю каханку збівае і гвалціць, аднак перакананы, што сапраўды яе вельмі моцна кахае; Насця, каб адпомсціць раўніваму палюбоўніку, арганізоўвае яго арышт... Ці сапраўды Адам трапіў у турму, ці прысудзілі яго да зняволення тэрмінам на тры гады, ці яго выпусцілі праз суткі, ці даравала яму Насця і ці насамрэч яны збіраліся ажаніцца — усё гэта для чытача аповесці будзе загадкай. Аўтар перапаўняе чытача няўпэўненасцю ў правільным успрыманні твора амаль на кожнай старонцы, аднак аповесць тым і цікавая, што ўвесь-часна правакуе, здзіўляе, выклікае на шчырасць.

Паспрабаваў здзівіць чытача і Г. Чарказян. Празаічныя старонкі "Полымя" прадстаўляюць тры яго апавяданні "Ангеліна-анёл", "Стары сейф" і "Даруй, Рыжык!" У першым апавяданні вядзецца абсалютна не здзіўляльная гаворка пра "санаторны" раман паміж мужчынам і жанчынай. Усмешкі, заляцанні, рамантычныя ночы — і ўсё б нічога, калі б тая самая Ангеліна-анёл не прызналася, што яна — мужчына, які колькі часу таму зрабіў аперацыю па змене полу. Праўда, герой аказаўся сапраўдным джэнтльменам — яго пачуццяў такое прызнанне не змяніла.

А вось паэтычным старонкам часопіса, якія змяшчаюць нізкі вершаў В. Шніпа, С. Шах і В. Максімовіча, не стае яркасці і адметнасці. "Балады крыві і любові" В. Шніпа, якімі распачынаецца часопіс, уяўляюць з сябе проста сінтаксічную шараду. Прыкладам можа служыць кожны верш, аднак такое назіранне даўно не навіна — гэта стала ўжо паэтычным крэда В. Шніпа, і, лагічна меркаваць, аматары яго вершаў такое крэда прымаюць. А вось наўрад ці ім будзе прыемна пераканацца ў "паэтычнай ляноце" аўтара, якая выяўляецца ва ўжыванні аднолькавых рыфмаў у шэрагу розных балад:

...Бо самыя лепшыя леглі
ў зямлю.
Вялікае княства,
як сонца, знікае,
І ўсходзіць у сэрцах,
як слова "люблю"...

(Балада Стэфана Грабоўскага)

І пішаш ты
пра родную зямлю,
Дзе парассыпаны,
нібы каралі,
Азёры,
ля якіх тваё "люблю"...

(Балада Альгерда Абуховіча)

І любіць ён не менш,
чым ты, зямлю,
Якую Бог нам даў,
каб кожны мог
Па-беларуску ёй сказаць
"люблю"...

(Балада Усевалада Ігнатоўскага)

Рубрыка "У лучнасці братняй" прадстаўляе сучасную таджыкскую паэзію. "Школьныя далягляды" прысвечаны гісторыі ўзнікнення жанру рамана і развіццю беларускай раманістыкі, у агляд якой уключаны дэтэктыўны раман У. Сцяпана і М. Клімковіча "Цень анёла" і раман-эсэ А. Федарэнкі "Мяжа". Акрамя гэтага, чытачы пазнаёмяцца з артыкуламі М. Мятліцкага, Н. Гальпяровіча, В. Гурскага, С. Саладоўнікава, Т. Шамякінай, А. Каўруса і А. Мяснікова.

Розныя знакі

Майскі "Нёман" прадстаўляе "Гродзенскі сшытак", які склалі празаічныя творы В. Быкава, У. Навумовіча, І. Фаменковай, І. Пяшко, І. Шатыронак, а таксама нізкі вершаў Б. Ермашкевіча, В. Куца, П. Сямінскага, Ф. Чычкана, Л. Шаўчэнкі, М. Сярова, А. Нікіпорчык, Д. Радзівончыка. Па-за "Гродзенскім сшыткам" змешчаны ў нумары вершы У. Скарынкіна ў перакладзе Г. Артханава.

Аповесць І. Пяшко "Валюта" ўяўляе замалёўку з беларускага правінцыйнага жыцця — напаўдэтэктыўны сюжэт, які з вялікім поспехам мог бы замяніць хаця б адзін з сотні сюжэтаў расійскіх серыялаў. У аповесці няма нічога надзвычайнага: жанчыну несправядліва абвінавацілі ў крадзяжы грошай, раённы журналіст дапамог ёй вярнуць добрае імя. Магчыма, сітуацыя крыху ідылічная, аднак па-мастацку ўвасобленая даволі перакананальна. Шкада, што аўтар не засяроджваў увагу на дэталёвай псіхалагічнай распрацоўцы характараў. (Напрыклад, вобразы міліцыянераў — толькі абагульненне распаўсюджаных меркаванняў). Адчуваецца ў аповесці, асабліва ў канцоўцы, і некаторая зададзенасць. Тым не менш, дзякуючы дынамічнаму сюжэту, твор будзе нясумным адпачынкам для аматараў лёгкага, не абцяжаранага грувасткімі інтрыгамі, дэтэктыва.

"Гродненская тетрадь без Василя Быкова? Вопрос более чем риторический", — адзнаецца ў невялічкай прадмове да публікацыі апавядання В. Быкава "В первом бою", якое было надрукавана 19 чэрвеня 1947 года ў газеце "Гродненская правда". Важным здабыткам нумара з'яўляецца, безумоўна, і аповесць А. Федарэнкі "Нічые" ў аўтарскім перакладзе на рускую мову. Твор гэты без перабольшання стаўся ў свой час знакам для сучаснай гістарычнай літаратуры. Можна не пагаджацца з ракурсам асэнсавання, з аўтарскай канцэпцыяй. Аднак не прызнаць, што гэта сапраўды вельмі значны твор у сучаснай беларускай літаратуры, які выяўляе сутнаснае ў разуменні лёсу беларускай нацыі, немагчыма. Таму вельмі ўсцешна бачыць "Нічыіх" і ў перакладзе на рускую мову, што пашырыць кола чытачоў аповесці.

Публіцыстычныя старонкі часопіса прадстаўлены артыкуламі Н. Чайкі, Л. Кебіч, А. Сідарэнкі. З крытычных артыкулаў выклікае цікавасць рэцэнзія-роздум Г. Кісялёва "Даешь европоэзию!" Аўтар аналізуе сучасную беларускую маладую паэзію, у прыватнасці, творы Т. Сівец, В. Трэнас, В. Жыбуля і В. Бурлак. Ацэнкі аўтара вострыя, аднак яго меркаванне не пакіне абыякавымі ні тых, хто будзе з ім салідарны, ні тых, каму захочацца паспрачацца. Акрамя гэтага, літаратурная крытыка і літаратуразнаўства прадстаўлена артыкуламі У. Вялічкі, Л. Кебіч, А. Лойкі.

На паэтычных старонках найбольш уражваюць радкі Віктара Куца і Алы Нікіпорчык. Праўда, дзеля справядлівасці варта адзначыць, што не ўсе вершы В. Куца аднолькава цікавыя і зладжаныя. Аднак такія, як "В отцовском доме", "Осенний пейзаж", нягледзячы на сваю традыцыйнасць, што ўжо і па назвах відаць, стануць для чытача крыніцай свежай паэтычнай вобразнасці:

На столе, где огарок
прощальной свечи,
Будто в замкнутом круге,
в тарелке — ключи.
Будто в замкнутом круге
схоронена жизнь,
Это связка ключей
здесь ее сторожит.

Нешта акмеістычнае ёсць у гэтым вобразе — глыбокім, насычаным некалькімі сэнсавымі пластамі, што дазваляе развіваць асацыяцыі ў розных кірунках. Больш няўлоўная, ледзь адчувальная падтэкставасць — у мініяцюрах А. Нікіпорчык:

Вы мне даны,
как солнце — небу.
Вы мне даны:
бескрайность — морю,
Вы мне даны:
дыханье — жизни...
Так почему Вы
не даны мне?

Пытанне лірычнай гераіні гучыць настолькі кранальна, што не хочацца разбураць гэтую кранальнасць ніякімі каментарыямі.

Замкнёнае кола

Майскі нумар "Маладосці" адзначаны творам, прысвечаным Вялікай Айчыннай вайне, — аповесцю Васіля Ткачова "Вятрак — птушка вольная". Аповесць будзе прыемная аматарам спакойнага, ураўнаваженага стылю: аўтар распавядае пра жыццё акупаванай вёскі ў стылі "Векапомных дзён" М. Лынькова. Падчас чытання твора не раз узнікала адчуванне, што пісьменнік вышывае ўзор па загадзя намаляванай схеме — настолькі ўсё прадказальна і знаёма. Відаць, на сучасным этапе беларускай літаратуры ёсць два шляхі распрацоўкі ваеннай тэматыкі — або выкарыстанне ваенных падзей толькі як экстрэмальнага фону для развіцця псіхалагічнай калізіі, або паўтарэнне ранейшых, даўно не новых гісторый у добрым стылёвым выкананні. Аповесць В. Ткачова характарызуецца акурат апошнім: дзяды-энтузіясты, іх дасціпныя жонкі, якія падманваюць немцаў і, вядома ж, маленькія хлапчукі, што мараць далучыцца да партызанаў. Наяўнасць такіх герояў і відавочнае акцэнтаванне аўтарскай увагі на іх дае падставы назваць аповесць юнацкай.

Дэбютант Сяржук Каліта прапануе чытачам паспрабаваць уцячы ад сябе. Менавіта так — "Уцякач ад сябе" — называецца яго апавяданне. Твор цалкам адпавядае сучаснай апавядальнай плыні: замест вострай сюжэтнасці — роздум, рэфлексійнасць і самаіронія. Галоўны герой здзяйсняе пратэст супраць зададзенасці і абумоўленасці жыцця, у дзень свайго пяцідзесяцігоддзя, калі задаволеныя і не зусім цвярозыя госці пайшлі адпачываць ад пачастункаў юбіляра, пакідае кватэру адчыненай і сыходзіць... у лес. З пафаснымі разважаннямі пра марнасць паўсядзённага клопату, умоўнасць пачуццяў і прывязанасцяў і рашэннем не вяртацца ў гэты свет прывідных каштоўнасцяў ніколі. Аднак вярнуўся герой дадому *"дзесьці праз месяц, адпачнуўшы і апантаны новымі ідэямі, а можа таму, што стала халадаць, пачаліся дажджы, якія не прыносілі ўжо ніякай радасці"*.

Нягледзячы на відавочную іранічную напоўненасць, гэтае невялічкае апавяданне мае трагічны падтэкст. Па сутнасці, аўтар сцвярджае немагчымасць чалавека вырвацца з усталяванага раз назаўсёды парадку рэчаў і з'яў. Праўда, герой прызнаецца: *"Тое, што мяне чакалі, было даволі прыемна. Увогуле так і павінна было быць"*. Разам з гэтым "уцякач ад сябе" прызнаецца і ў тым, што здзейсненыя ўцёкі не сталі тым чаканым духоўным ачышчэннем, якое ён жадаў атрымаць. Замкнёнае кола. Апавяданне С. Каліты — гэта не пошук выйсця ці адказу на пытанне, гэта выяўленне трагікамічнасці спроб сучаснага чалавека "ўцячы ад сябе".

Ад кожнага нумара "Маладосці" чакаеш новых імён і новых мастацкіх здабыткаў. Вось і ў майскім — дэбют К. Савіцкай, вучаніцы 11 класа гімназіі № 11 імя М. Чарнышэўскага. Нізка яе вершаў робіць супярэчлівае ўражанне. З аднаго боку, — арыгінальная вобразнасць; з другога — паспешлівасць, непрадуманасць і нават моўныя памылкі. Так чароўна пачынаецца верш:

Вясна ў кароткім
паліто
Скрозь думкі хмар —
да небакраю.

І вось раптам:

І хочацца пазбавіць крок,
І не адзінкай быць,
а парай.

Незразумела, ад чаго менавіта *хочацца* лірычнай гераіні *пазбавіць крок*. Аднак глыбокіх падтэкстаў тут шукаць не трэба, бо ў радку гэтым проста няма ніякага сэнсу: верагодна, такі пераклад займела слова *"поубавить"*. Пакуль маладой паэтцы, у якой, безумоўна, ёсць талент весці гаворку на паэтычнай мове, трэба "дамовіцца" найперш са сваёй лірычнай гераіняй адносна таго, дзеля чаго яе думкі з'яўляюцца на старонках часопіса.

Больш выспелымі выглядаюць вершы вядомай ужо аматарам маладой беларускай паэзіі аўтаркі Ю. Новік. Праўда, літаратурнай "ахайнасці" не стае і ёй — часта ў верш аб'ядноўваюцца радкі, якія не ствараюць вобраза, адзінай паэтычнай думкі. А своеасаблівым падсумаваннем не толькі ўласнага жыццёвага, але ў пэўным сэнсе і ўсяго беларускага паэтычнага вопыту з'яўляюцца вершаваныя прызнанні А. Жука:

Я сярод вас
далёка быў не першы,
І не апошні быў
я да ўсяго...
Жыццё прачытана,
нібы Купалы вершы,
І болей мне чытаць
няма чаго.

Вядома, гэтыя словы не трэба ўспрымаць літаральна, імя Купалы ўжываецца ў дадзеным выпадку як пэўны абагульнены вобраз паэтычнага стылю, мастацкага светабачання. "Прачытанасць жыцця" стварае для аўтара новыя магчымасці — цяпер наспела неабходнасць прачытанае *выказаць*.

Акрамя гэтага, на старонках часопіса — заканчэнне "Дзённіка спакою" Я. Сіпакова, працяг рамана Ю. Крашэўскага "Кароль у Нясвіжы" і аб'яднаныя ваеннай тэматыкай артыкулы Я. Аксяновіча, С. Макарэвіча, разгляд новай кнігі Р. Барадуліна, лінгвістычны аналіз паэтычнага стылю М. Мятліцкага ў выкананні А. Багамолавай, а Л. Дучыц і І. Клімковіч правялі невялічкае расследаванне, "Калі Бог і Божая Маці хадзілі па зямлі".

* * *

Усім вядома, што перарабляць зробленае табой — рэч не толькі непрыемная, але і складаная. Гэта датычыць усіх галін дзейнасці, і літаратура — не выключэнне. Няўдалыя радкі ці рыфмы могуць са свядомасці аўтара з ніякаватай сарамлівасцю (ці без яе) перасяліцца на часопісныя старонкі акурат з гэтай прычыны, што вось так, па-чалавечы зразумець можна. Аднак здзіўленне выклікае шораз іншае: няўжо пісьменнікі так легкадумна ставяцца да свайго "літаратурнага іміджу"?

Жанна КАПУСТА

Міхась КУРЫЛА

* * *

Край мілы сэрцу, дарагі,
Пагоркамі стракаты,
Край — поўны смутку і тугі,
Легендамі багаты...
І ў нас рупліўцы свае ёсць:
Рамантыкі, паэты —
Той, хто шануе прыгажосць,
Жыве духоўным светам!..

* * *

Па дарозе да вясны,
На левабярэжжы,
Сняцца лёгкія нам сны,
Ды не нам — належаць...

Там ні здрады, ні маны,
Толькі снег іскрысты.
Па дарозе да вясны —
Смех дзявочы чысты!..

Маладымі мы былі —
Горача кахалі,
Лёгка воблакі плылі,
Лёгка мы ўздыхалі...

Не трывожылі нас сны
На левабярэжжы, —
Па дарозе да вясны
На прасторы снежным.

* * *

Агонь апошняй свечкі
Не згас пакуль, гарыць.
І месяц Шляхам Млечным
Шчэ прадаўжае плыць.

І доўжацца шчэ спрэчкі
Пра побыт наш і час.
Агонь апошняй свечкі —
Гарыць пакуль, не згас.

А жоўты ліст, вандроўнік,
Над поплавам ляціць,
Пасох-завяў бульбоўнік,
А пыл дарог — курыць;

Расходзяцца кругамі
Сумненні на вадзе...
Ды новыя надзеі
Нам дорыць новы дзень.

У роздуме аб вечным
Знаходжу сіл запас...
Агонь апошняй свечкі
Гарыць пакуль, не згас.

* * *

Не шукай,
Не знойдзеш апраўдання
Позняму візіту на парог,
Дзе цябе чакалі да змяркання,
Каб бядзе хоць словам дапамог...

Без цябе
Астыла ў кубку кава,
Выкашана чыста лебяда...
Што далей? А гэта не цікава..
Проста ты давер не апраўдаў.

* * *

У доме пад сонцам —
жыве немаўля,
Цёпла, утульна ў тым доме.
Там пасялілася дабрыня,
Побач — і шчасце, вядома.

У доме пад сонцам —
страчаюць людзей
Словам лагодным, падзякай.
Часта начуе там маладзік
На мяккіх шпалерах, бадзяга.

У доме пад сонцам
жыве і шчаня,
Гаспадарам на ўцеху.
А за вячэрай збярэцца радня —
Жартаў наробяць і смеху...

У доме пад сонцам —
блакітны абрус
Стол сагравае,
з букетам валошак.
У доме пад сонцам жыве беларус
З раённага цэнтра Валожын.

Леў ПАРЭМСКІ

* * *

Душа навек паэзіяй працята.
Шчаслівы я і разам з тым бядак,
Бо вось ізноў не тая нота ўзята,
Фіяска зноў, няўдачлівы спявак!

Але не трэба мне інакшай долі,
Сваю пуціну бласлаўляю я...
Жыццё маё!
Цярпенню ў тваёй школе
Вучылася паэзія мая.

* * *

Адхацела сэрца, адхацела
Наўздагон за марамі імчаць.
Зморанаму цяжкасцямі целу
Не дагнаць ужо іх, не дагнаць.

Ім цяпер камандуе лянота,
А яна — нядобры камандзір...
О жыццё! Гані з душы сумоту,
Усталюй у ёй спакой і мір!

* * *

Як прагну я ў душы прасвету,
Як прагну вырвацца з глушы,
Каб зноў гармонія Сусвету
Была гармоніяй душы.

Ды ўсё радзей, радзей такое
Мне дорыць сумнае жыццё —
Бы прывучае да спакою,
Да пераходу ў небыццё.

* * *

Мне Лёс не дорыць
святаў і прыўкрас,
Будзённасць жыць
у горычы змушае...
І павадырка Муза іншы раз
Мяне надоўга раптам пакідае.

І вось тады бярэ мяне адчай,
Палоняць розум чорныя развагі,
Душа нямее
ў роспачных начах
І жыць тады
зусім няма адвагі.

Уладзімір ШПАДАРУК

Радзіма мая

Глухі, бессэнсоўны,
Без сонца, без поўні —
Мой шлях да цябе.

Туманам спавіты,
Слязамі паліты —
Мой шлях без цябе.

Узнёслы, крылаты,
Духоўна багаты —
З табою мой шлях.

Люблю, ганаруся,
Навек застануся
З табою, мой шлях,
Радзіма мая.

* * *

Калі не я, то хто ж тады
Цябе, бярозка, прыгалубіць,
Хто прыгажосць тваю
прыгубіць
І сум суцешыць маладыя?

Хто разбярэ птушыны спеў
І хто пачуе крык птушыны?
Калі не я, то хто, скажы мне,
За зоркай здолее паспець,

Што адрываецца ўначы
Ад надакучлівага неба?
Хто з наваколлем памаўчыць,
Калі такая ёсць патрэба?

Усё далей ляцяць гады,
Назад не вернуцца аднойчы.
І я праводжу ў шлях іх моўчкі,
Калі не я, то хто ж тады?

* * *

Гэты роздум, што зараз я маю,
Мне б у час той святочны, калі
Маладою была яшчэ мама,
І аблокі так лёгка плылі.

І цяплейшым было надвор'е —
Побач, воддаль і ў сэрцы маім,
І не ведаў я большага гора,
Чым у вочы — ад вогнішча дым.

* * *

О, як удзячны лёсу я!
Ён паспрыяў мне, бо аднойчы
Твае задумлівыя вочы
Знайшлі мяне ў тумане дня,
Дзе я пакутліва блукаў,
Адрынуты зямлёй і небам,
І невядома што шукаў,
І сам сябе амаль не ведаў.

Неспадзявана, спакваля,
Мо, і сама не ўсведамляла,
Ты над зямлёй мяне ўзняла
І да святла накіравала.

* * *

Насуперак усім нягодам
Я сваё сэрца зноў малю,
Каб не згубіла недзе годнасць
І шчырасць зберагло маю.

Каб не стамілася аднойчы
Мой дух над безданню трымаць,
І холад не пускала ў вочы,
І крыўду ўмела дараваць.

Хай доўга сэрца маё б'ецца,
І дбае толькі аб адным:
Каб ля яго хтось мог сагрэцца.
Інакш нашто яно тады?

Фота Кастуся Дробава

Уладзімір ЛОБАЧ

Уладзімір Лобач нарадзіўся ў Свіры ў 1960 годзе. Дзяцінства правёў у прыгожых мясцінах нарачанскага і смаргонскага краёў. Мае дзве вышэйшыя адукацыі. Вывучае філасофію, рэлігію, аўтар філасофскіх артыкулаў па ўсходніх вучэннях і філасофіі.
Вершы піша з 1991 года. Выйшлі два зборнікі: "Сад любові" (2004) і сумесная кніга карцін-вершаў з мастачкай Нінэль Шчаснай "Мастацтва — у вершы, вершы — у мастацтва" (2006).

Выватні

Выватні,
як знямоглыя людзі,
крэкчуць ноччу ў лесе.
Балюча ім
у перапіленых грудзях
адчуваць,
што не пражылі
пад небам шчаслівага веку.
Чаму іх вырвала бура
з карэннем? —
Мо за зямліцу
трымаліся дрэвы няўдала
падобна людцам няўдалым,
якія робяць не тое,
што зорамі ім наканавана.
Мо пакаянне й малітва —
гэты выватняў уначы
стогн?

Ценькая струна

Трымціць у сэрцы ценькая струна
І звон яе анёлам толькі чутны.
Пакутуе і мроіць зноў душа:
"Хто дапаможа мне сысці
з крыжа?" —
Кахання чыстага ўзлёт магутны!

Дзівосны гук тае танюткае струны
Бывае, сам пачуеш
у вясновым садзе...
Тады здаецца:
ён зыходзіць ад слязы,
Што, бліснуўшы
над вогнішчам душы,
На снег зляцела ў ціхім зарападзе.

Некласічная элегія

Які Тадж-Махал
табе я збудую,
каханка мая сінявокая,
калі нават не маю
камення для бруку я?

Але ёсць у мяне
Найдаражэйшае,
што мільён
Тадж-Махалаў змяшчае,
Гэта —
Слова,
Небам спасланае
ў сэрца маё натхнёнае.

Кароткія навелы

Віктар СУПРУНЧУК

Сена

Стаяла магутная зіма. Ясельда, здавалася, расцягнулася ад вёскі да Сімонікавага лесу. Лёд зіхацеў мноствам фарбаў, нібыта люстэрка без памераў і таўшчыні. Сасна за Лагерамі яшчэ больш парудзела, і неба было стальнога колеру.

На Міжарэках у нас стаяў стажок сена, які мы склалі, лазячы па жывот у балоце. Пад здзек слепакоў, камароў і машкарні. Калі мучыла смага, я піў ваду, якую набіраў у бутэльку ў Ясельдзе, праз сваю майку, нібы сіта, каб раптам жаба не трапіла ў рот. Але ж накасілі, згрэблі і састагавалі мы з бацькам тое сена. І вось зіма, калі можна яго адвезці ў калгасны свіран, каб, нарэшце, атрымаць спажыву для нашай кароўкі. Умова была адна: не здаеш у калгас чатыры тоны сена — не атрымаеш свае дзве. Столькі патрэбна карміцельцы, каб перазімаваць.

Мы вязём з татам сена. Конь ідзе памалу. Ён стомлены, ледзь цягне за сабою вялікую гурбу сена, якое я шырака расклаў у баку, утаптаў, каб найбольш улезла на сані.

Сонца заходзіць рана. І вось толькі апошні чырвоны ягоны пісяг яшчэ відзён за вёскаю, а калі мы на Алендрах — і ён знік.

На ферме, дзе трэба скласці сена, ужо цёмна. Аднекуль узнік старшыня:

— Скідвайце. Залічу вашы тоны...

...Ашукаў. Назаўтра сказаў, што ведаць не ведае, пра якое сена размова.

Нават перад смерцю мой тата не мог забыць гэтай крыўды...

Кот Мілорд і сабака Шарык

Я прыехаў у родную вёску, прайшоў па сваёй вуліцы, падыхаў яе водарам. Вішні і слівы, яблыні і грушы пахлі гэтак жа, як у дзяцінстве. І трава, здаецца, таксама. Бегла па блакітным небе пухматая хмарка, а ўслед ёй клекатаў бусел, што ўзляцеў са свайго гнязда, якое яшчэ з майго дзяцінства месціцца на Клёчкавай хаце. І ўжо было пад поўдзень, калі пасля спёкі на вуліцы збіралася калейка, і каровы, адмахваючыся хвастамі ад аваднёў, нетаропка варушыліся да лаза альбо на пастаўнік.

Уздоўж вуліцы буяла трава, сакавітая, смачная, сам, здаецца, еў бы. І не вытаптаная яна была капытамі, і не запэцканая ляпёшкамі кароў. Прыгожая, шыракалістая трава, якая была ярка-зялёная, нягледзячы на пыл, што ўзлятаў, нібы порах, з-пад колаў выпадковых машын.

Здаецца, цяпер замычаць каровы, і якая-небудзь з іх, натапырыўшы рогі, пачэша той ці іншай суседцы бок, і пачнецца валтузня і тупат на вуліцы, пачуецца гуканне пастуха. Вось-вось выйдзе гурт... Чакаю яго... І цішыня...

Толькі недзе там, над былым выганам, дзе месцяцца дачы гараджан, раз-другі адзінока закрычала кнігаўка і сціхла. Потым зноў маркотны спеў, быццам шукае слухачоў і адначасова нагадвае пра сябе: "Я тут, я покуль жывая!"

...На вуліцу выйшаў шэры кот Мілорд. Пазяхнуў, пацягнуўся і лёг пасярод дарогі, не баючыся, што раптам на вышыні ягоных вачэй узнікне машына. Нібыта здзекуючыся з усёй цывілізацыі, некалькі разоў перавярнуўся ў цёплым пыле і адпоўз у цень пад вішню.

Сабака Шарык, як марафонец перад іспытам, лена выпрастваючы свае парослыя сівой шчэццю лапы, выйшаў з двара, мордаю адапхнуўшы з дарогі веснічкі. Падышоў да ката і, парушаючы тысячагадовую зняважу і нянавісць, грэбліва павёў убок пысаю. Уздыхнуўшы, Шарык прылёг бліжэй да варот.

Іхні гаспадар Кастусь паеў супу з лісічкамі. Потым — бульбы з курыцаю. Выпіў кубак квасу, што Наста ўчора прынесла з крамы. Дужа смачны ў гарачыню. Сеў на лаўку.

Машыны пакуль не едуць. Пылу няма. Сабака не гаўкае. Мурлыкае кот ля нагі. А неба блакітнае-блакітнае.

— Вось каб Бог даў так пражыць сто гадоў! — сказаў мне Кастусь. — І не трэба мне аніякая карова. Яе ж трэба карміць, паіць, даіць...

Качан капусты

Новы год надыходзіць незаўважна і раптоўна. Ён узнікае нечакана, як восень, зіма альбо лета. Хоць і ведаеш, што ён вось-вось ступіць праз парог тваёй хаты. Шчымлівае пачуццё ахоплівае душу і цела, адчуваеш свята, хоць і адначасова разумееш, што робішся на адзін год старэйшы, гэта значыць — бліжэй да вечнасці.

Я быў на Каўказе. За акном разгарнулася белая прастора, у якой схаваліся горы, нешматлікія будыніны вайсковай часці, куды мяне накіравалі ў камандзіроўку. У маленькім пакойчыку я быў адзін, а па суседстве ў казарме збіраліся адзначаць Новы год незнаёмыя мне салдаты: есці цукеркі і пернікі, піць гарачы салодкі чай з белым хлебам і маслам.

Я толькі прыехаў з-пад горада Абавяна, які намнога ніжэй, чым гэтая асобная вайсковая кропка. Дабіраўся доўга, бо шлях быў занесены снегам, і грузавік, хоць і быў з ланцугамі на колах для лепшага тармажэння, ледзь поўз, часам становячыся ўпоперак дарогі.

Мы прыехалі, калі зрабілася зусім цёмна. У казарме месца не знайшлося, і мяне пасялілі ў гэты дамок, адкуль некалькі дзён назад выехаў на новае месца службы афіцэр з сям'ёй.

Было холадна і вельмі хацелася есці. Пакарміць мяне паабяцалі толькі заўтра. Было вельмі сумна. Праз гадзіну — Новы год. Па ўсёй зямлі сустракаюць яго, а я пазбаўлены гэтага шчасця. Недзе далёка-далёка мама і тата, браты і сёстры сядзяць за святочным сталом, радуюцца. Пэўна, успамінаюць і мяне. Але я не з імі. Што зробіш, такі зараз у мяне лёс. Лёс салдата, які служыць за некалькі тысяч кіламетраў ад роднай хаты.

Я сядзеў адзін у цемры, бо лямпачкі ў патроне не мелася, і шкадаваў сябе. Яшчэ трошкі — і, мабыць, заплакаў бы ад сваёй нікчэмнасці і крыўды на ўвесь белы свет.

Яркія ўспышкі святла за акном прымусілі мяне выскачыць з дамка на двор. Гэта адна за адной ляцелі ў неба рознакаляровыя ракеты. З кожным стрэлам чуліся салдацкія крыкі, якія вярталіся рэхам з гор. Значыць, надышоў Новы год. Забыўшыся на смутак і адзіноту, я таксама закрычаў: «Ура-ура! Эгэ-гэй!» З надыходам Новага года мне ўжо значна менш заставалася служыць у войску. А які салдат не марыць пра «дэмбель»?

Праз хвілін дзесяць, адчуўшы, што мае вушы касцянеюць ад марозу, я вярнуўся ў дамок. Толькі зачыніў за сабою дзверы, ступіў крок і, зачапіўшыся нагою за нешта, што ляжала каля дзвярэй, ледзь не разбіў лоб. Памацаў рукою, што гэта, і спярша здзівіўся, а пасля ўзрадаваўся. На падлозе ляжаў амаль поўны мяшок качаноў свежай капусты. Гэта быў боскі падарунак! Ухапіўшы качан, я пацягнуў яго ў пакой. Трошкі счысціў навобмацак верхняе лісце і пачаў трушчыць капусту, аж прыцмокваючы: такая яна была смачная. Больш ніколі ў жыцці я не еў з такім задавальненнем і апетытам ніводную страву. І калі ад качана засталося, як кажуць, вераб'ю раз дзеўбануць, я адчуў, што здаволіўся. Мне не было ўжо сумна і адзінока, і тое, што не гарэла лямпачка, не перашкодзіла легчы ў ложак, накрыць сябе некалькімі матрацамі і шчасліва заснуць. Я таксама адзначыў Новы год!

Кошык Яраслава Пархуты

На кухонным падаконніку ў мяне заўсёды стаіць кошык. Невялікі, зроблены з каранёў. Сплецены ён прыгожа, акуратна, рабрынка да рабрынкі. Штодзень ён у мяне перад вачыма, вельмі зграбны, жаўтаваты, пад колер цыбулі, якую трымаю ў ім. Відаць, цыбулі ў кошыку ўтульна, яна заўсёды сухая, ніколі не гніе. Гляджу на яго і, здаецца, нібыта ён жывы: дыхае, усміхаецца. Вось-вось нешта скажа. Я ведаю, што гэтага ніколі не будзе, але ж, мусіць, мы да глыбокай старасці ў душы застаёмся дзецьмі і верым у цудоўную казку...

Гэты кошык мне вельмі дарагі, таму што яго зрабіў для мяне Яраслаў Пархута. Выдатны пісьменнік, незвычайны чалавек, з якім я сябраваў шмат гадоў. Колькі ўдараў вытрымала яго сэрца: інфаркты, інсульты... Ён адчайна змагаўся за жыццё і неаднаразова перамагаў смерць, выкарабкваючыся з бездані і ўзнімаючыся зноў на ногі. Аб'ездзіў і абышоў, мабыць, кожны куток Беларусі, стварыў цудоўную кнігу выдатных навел "Зямля бацькоў нашых" пра родную зямлю. Аптымізм яго, здавалася, быў невычэрпны. Адбіўшыся ад чарговай хваробы, браў у рукі свой кіёк і ішоў далей, каб яшчэ больш пазнаваць свет і людзей, ствараць новыя творы. І кошык, што стаіць у маёй кватэры, — гэта таксама ягоны твор. Я кожны дзень па некалькі разоў "перачытваю" яго зноўку і зноўку, уяўляючы перад сабой аўтара і тыя далёкія сцяжынкі, на якіх назаўжды засталіся сляды Яраслава Сільвестравіча Пархуты...

Эксплуататары

Георгій МАРЧУК

Маналог

Трэба штосьці з гэтым капіталізмам рабіць. Вакол адны эксплуататары, кожны толькі і стараецца на чужым гарбе... так і стараецца. Вось і мае — не сям'я, а нейкае кодла эксплуататараў. Вяртаюся з працы стомлены, як кіт, які толькі што глынуў пару тон крылю, і ўжо з парога так і чакаюць усе, каб нагрузіць. Я ўжо і без таго — як антылопа гну, што адмахала дзесяць кіламетраў. Калега папрасіў бандэроль адправіць, кажа, у цябе пошта побач з домам. Згадзіўся. Прыходжу, а мая пошта на рамонце. Іду праз два кварталы на цэнтральную, а там паўкіламетровая чарга, накшталт газэлей Томпсана, што згрупіраваліся перад пераправай. Але рабіць няма чаго — адстаяў гадзіну.

Тут жонка пачынае першая:

— Не мог дагэтуль смецце вынесці? Без справы дзве гадзіны швэндаешся! Лайдак, табе супрацыпаказаны капіталізм!

— Гэта я лайдак?! У нас у Тэатры юнага гледача (я там асвятляльнікам працую) па тры спектаклі на дзень. Стамляюся, што той экскаватар, які пераварочвае сотні тон зямлі.

Слухаць не хоча.

— Што стаіш, як Дзед Мароз, якому сто грамаў не далі? Вынось смецце! Во гэта тып дык тып! Яшчэ прыкідваецца, што не чуе! — камандуе жонка.

Я сапраўды кепска чую. Вушы ватай пазатыканы.

О, вы не ведаеце, што такое наш тэатр і наш глядач, калі ён у гуморы і калі крыкамі дапамагае героям перамагаць на сцэне зло. Роў касмічнай ракеты — гэта ўчарашні дзень. Тыфозі на стадыёнах адпачываюць.

— Самы час табе пазатыкаць не толькі вушы, але і ноздры, — бурчыць жонка, — зусім ад рук адбіўся.

— Нікога так не эксплуатуюць, як мяне! — лямантую я.

З другога пакоя, дзе па тэлевізары ідзе перадача "Экстрасенсы і секс", адгукаецца цешча:

— А цябе ніхто ў шыю не гнаў. Ажаніўся па сваёй волі?

— Па сваёй.

— Ну дык, калі ласка, выконвай свой грамадска-побытавы абавязак. Вынось смецце!

Іду ўніз. Тут сусед, яшчэ адзін прыхаваны эксплуататар, кажа: Вася, патрымай дзверы, я ключы забыў, на хвілінку ў гастраном збегаю, пляшку вазьму і назад".

Стаю, прытрымліваю дзверы... Чакаю... Дзесяць хвілін, дваццаць.

Нарэшце прыбягае. "Прабач, — кажа, — аднакласніка сустрэў, сорак гадоў не бачыліся".

Дык, кажу, мінулым разам у такой сітуацыі ты казаў, што трыццаць гадоў не бачыліся.

— Сапраўды? Во склероз пракляты!

Вось што капіталізм з людзьмі робіць. Забываць пачаў. А ў кватэры гэтыя акаянныя эксплуататары ўжо зусім раз'юшыліся.

— Ты што ж, недарэка, пустыя бутэлькі не вынес? Рабоў тут няма!

Бяру бутэлькі, бягу ўніз неахвотна. Як на тое ліха, ліфт адключыўся. Прыбягаю назад — чую ўжо з калідорчыка: у кватэры нешта нядобрае. Нібыта нехта галосіць.

Жонка з парога:

— Ты бутэлькі выкінуў?

— Як загадалі.

— Я ўсё разумею, — абураецца жонка, — ты можаш не любіць маю маці, сваю цешчу, але каб гэтак жорстка помсціць... Плямёны ў Афрыцы да такога не даўмеюцца.

— Пра якую помсту ты кажаш? — дзіўлюся я, усё яшчэ цяжка дыхаючы — Ды я ніжэй за асфальт. Малекула.

— Дык чаму ж ты, малекула, этыкеткі ад бутэлек не паадклейваў? Ці ж ты не ведаеш, што мая мама іх усё жыццё калекцыяніруе?

— Я думаў, што наша дачка іх даўно паадклейвала.

— Ты замест яе ўрокі рабіць будзеш? Бяжы ўніз, пакуль маму ўдар не хапіў, нясі бутэлькі назад.

— Ліфт не працуе. Можа, пасля вячэры?

— Не. Ты хочаш мамінай смерці. Бяжы, пакуль бамжы не расцягнулі, — ужо строга загадвае жонка.

Трэба сказаць вам, этыкеткамі гэтымі абклеена ўся кватэра. Дзверы, тумбачкі, халадзільнік, тэлевізар, ванна, уся прыбіральня. Здараецца, заходжу — вочы разбягаюцца. Уніташ адшукаць немагчыма. Усё ў этыкетках. Эх, думаю, эксплуататары, на ўсё ў вас апраўданне знойдзецца.

Жонка, нібыта падслухаўшы мае думкі, іранізуе:

— Вярнуўся час капіталізму, час эксплуататараў — памятаеш падручнік па палітэканоміі?

— Як я яго мог забыць, калі я яго не ведаў?

— Твае праблемы.

Ля пад'езда суседка з адзінаццатага паверха, адна, сумная-сумная. Ліфт жа не працуе, а яна з новым тэлевізарам.

— Памажы, — кажа, — Васіль, век памятаць буду. Праз пяць хвілін мая любімая перадача.

Сяк-так дацягнулі.

Толькі сеў вячэраць — дачка румзае. Не атрымліваецца ў яе задача. Я ведаю, што і ў мяне не атрымаецца, але супраціўленне марнае.

— А што цешча робіць? Яна матэматыку лепш ведае, — шукаю паратунку я.

— Нахабнік! Мама вышывае ўнучцы заданне па ўроку працы. Чорнага сабаку экс-прэзідэнта Пуціна.

— А ты?

— Людажэр! І табе не сорамна? Я адпахала восем гадзін за камп'ютэрам. Дык дай хоць перад сном любімы серыял даглядзець. На героя Пэдра ўзвялі паклёп, ён у турме, няўжо ў цябе няма спачування, кат?

Толькі, значыць, з дачкой разабраліся на пачатку дзесятай гадзіны, колькі вадкасці ўсё ж засталося ў ёмістасці, з якой пералівалі ў другія трубы, — скажу вам задачка, Лабачэўскі адпачывае. Аўтары падручніка — эксплуататары, факт.

Чую цешчын голас:

— Дачушка, з балкона дзьме.

Жонка грозна так, як ільвіца, ад якой леў пайшоў да іншай:

— Хто апошнім быў на балконе?

— Я не быў, я не быў! — з апошняй надзеяй гукаю з ваннай.

— Мне дзьме... — стогне цешча. — Хутчэй бы на цягнік ды дамоў, у Крым.

Колькі жыве, столькі абяцае, што з'едзе ў Крым... Дваццаць гадоў усё абяцае.

— Хто апошнім прыйшоў у кватэру? — вядзе дазнанне жонка.

— Тата, — адказвае дачка. Яшчэ адзін эксплуататар расце.

— Ідзі на балкон і зачыні там шыбу. Маме дзьме.

На балконе холадна, але хочацца пасядзець даўжэй, дачакацца, калі ўсе паснуць ды памарыць пра той час, калі і я стану эксплуататарам.

Цешча заснула ў крэсле, давялося завяршыць вышыванне чорнага сабакі; паралельна дапамог жонцы разгадаць крыжаванку.

Толькі гэта я, значыць, адно месца ў сабакі вышываць заканчваю — званок у дзверы.

Сусед просіць праверыць па Інтэрнеце ягоны латарэйны білет. Не паспеў я з білетам разабрацца, цешча прачнулася, просіць расказаць, чым там перадача "Экстрасенсы і секс" закончылася.

Кажу, усе празорцы бачылі адно і тое.

— А здагадаліся, хто зацяжараў?

— Праз дзевяць месяцаў здагадаюцца.

Толькі закончыў мыць посуд, як зноў званок у дзверы.

Сусед, выкшталцоны эксплуататар, пасварыўся з жонкай, выклікалі міліцыю. Давялося гадзіну пабыць у ролі панятога.

Раніцай, толькі паспеў паснедаць, куляй вылятаю на працу. Чытаю ў ранішняй газеце аб'яву. І вось цуд! Мая мара можа спраўдзіцца. У глыбокай тайне вязу дакументы і паступаю ў сярэднюю навучальную ўстанову на завочнае аддзяленне. Сэрца тахкае! Я трымаю ў руках білет навучэнца. Вось яна, мара. Чыгуначны тэхнікум. Спецыяльнасць "Эксплуатацыя чыгуначных шляхоў". Вы зразумелі, так? Вася — эксплуататар. Будзе і на маёй вуліцы пянёк гарэць. Капіталістычны. А як жа!

Часцінка вялікай гармоніі

Сакрэт музычнай дынастыі

Нясвіжская зямля ўзгадавала ці прыняла пад сваё крыло шмат цікавых творчых людзей, якія зрабілі ўнёсак у развіццё культуры не толькі Нясвіжчыны, але і ўсёй Беларусі, і нават свету. Часцей за ўсё ў такіх выпадках гаворка ідзе пра асобных творцаў, што вылучыліся ў пэўнай галіне мастацтва, і зусім рэдка — пра сем'і, для якіх творчасць з'яўляецца справай агульнай. На Нясвіжчыне такія сем'і ёсць.

Уладзімір Прыгун і яго жонка Тамара — людзі ў нашым раёне вядомыя. Мабыць, няма ніводнага сталага чалавека, які б не ведаў гэтую цудоўную сям'ю, не пабываў бы, хоць аднойчы, на канцэрце з удзелам самаадданых музыкаў. Нядаўна яны сустракаліся з чытачамі Нясвіжскай раённай бібліятэкі. І тое, што прыйшлі туды людзі розных узростаў — ад вучняў старэйшых класаў Нясвіжскай беларускай гімназіі да наведвальнікаў гасцёўні "Ясь і Яніна", што дзейнічае пры бібліятэцы, — людзей пенсійнага ўзросту, гаворыць пра шырокую цікавасць да творчасці мужа і жонкі Прыгуноў.

Тамара Міхайлаўна — карэнная несвіжанка, прадстаўніца добра вядомай тут музычнай дынастыі Гурыных, — свае здольнасці пераняла ад бацькоў. Маці, Ірына Вікенцьеўна, мае цудоўны голас і спявае ў царкоўным хоры, тата, Міхаіл Канстанцінавіч, быў выкладчыкам Нясвіжскай музычнай школы, акампаніятарам знакамітага Лявонавіцкага хору і народнага хору Цэнтральнай раённай бальніцы. Першыя ўрокі ігры на баяне Тамара і яе брат Уладзімір, цяпер выкладчык Нясвіжскай школы мастацтваў, атрымалі ад бацькі. І ўжо не маглі ўявіць, што ёсць недзе іншы свет, у якім не пануюць чароўныя мелодыі іх дзяцінства.

Потым Тамара паступіла ў Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі. Далей — кансерваторыя, дзе вучылася ў такіх кампетэнтных педагогаў, як Міхаіл Солапаў, Леанід Азарэвіч ды іншыя.

Яе першае месца працы — мінская 10-я музычная школа, куды Тамара прыйшла выкладчыкам па класе баяна і акардэона. Праз нейкі час запрасілі маладую настаўніцу на пасаду намесніка дырэктара па харэаграфіі ў 125-ю харэаграфічную школу. Адначасова працавала ў Ждановіцкім аздараўленчым цэнтры для дзяцей з чарнобыльскай зоны. Тут працаваў і яе муж, Уладзімір Прыгун, падпалкоўнік у адстаўцы.

Уладзімір Уладзіміравіч родам з Віцебска. Закончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі па класе трубы, інстытут культуры (цяпер БДУ культуры і мастацтваў). Працаваў начальнікам курса Акадэміі МУС Беларусі, граў у аркестры Міністэрства ўнутраных спраў.

У 1996 годзе Тамару Міхайлаўну напаткала вялікая страта — памёр бацька. Каб не пакідаць маці без падтрымкі, Тамара Міхайлаўна і Уладзімір Уладзіміравіч пераязджаюць у Нясвіж. Тамара Прыгун становіцца пераемніцай справы бацькі, уладкоўваецца на працу ў Нясвіжскую музычную школу, бярэ на сябе кіраўніцтва народным ансамблем "Ліра", які дзейнічае пры Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы, сноўскага народнага ансамбля песні і танца "Вяночак". Арганізуе вакальную групу "Гармонія", удзельнікі якой — выкладчыкі Нясвіжскай школы мастацтваў. Пры Сноўскім доме культуры з яе лёгкай рукі ствараецца мужчынскі народны ансамбль "Акцэнт", адзін з вакалістаў якога — Уладзімір Прыгун.

А яшчэ Тамара Прыгун стала стваральнікам і кіраўніком дзіцячага інструментальнага ансамбля "Меламаны" пры музычнай школе і вакальнага ансамбля "Пралеска", візітоўкай якога з'яўляецца песня "Пралесачка", напісаная самой кіраўніцай. Выканальніцкае майстэрства гэтых калектываў, якія ўдзельнічалі ў фестывалях не толькі на радзіме, але і ў Германіі, Літве, Польшчы, Расіі, неаднаразова адзначалася на абласным, рэспубліканскім узроўнях. А творчасць ансамбляў "Вяночак" і "Акцэнт" — і на міжнародным.

Што да рэпертуару, дык пераважаюць у ім уласныя песні Тамары Прыгун. Частка з іх, а гэта 39 твораў, увайшла ў песенны зборнік "І льюцца гукі па-над родным краем", выданнем якога апекаваўся старшыня агракамбіната "Сноў" Мікалай Радаман. Наогул, таленавітай аўтаркай створана каля сотні песень. Мяркуе выдаць іх зборнік для дзяцей, і аснова ўжо ёсць: гэта добра вядомыя несвіжанам "Кацяняты", "Новы дзень", "Замок из песка", "Кукла" і многія іншыя, якія з прыемнасцю выконваюць юныя ўдзельнікі ансамбля "Пралеска".

У 2008 годзе Уладзіміра Уладзіміравіча запрасілі на пасаду дырэктара клуба жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Тамара Міхайлаўна стала там мастацкім кіраўніком, арганізавала пры клубе вакальную групу "Элегія". Разам муж і жонка ладзяць цікавыя творчыя вечары, святочныя імпрэзы. Не так даўно ў сценах клуба выступаў вядомы на ўсю Беларусь ансамбль "Чысты голас", кіраўніком якога з'яўляецца Валерый Уладзіміравіч Прыгун. Так што творчыя традыцыі гэтай сям'і працягваюць дзеці і ўнукі. Летась паступіла ў Маладзечанскае музычнае вучылішча імя М. Кл. Агінскага пляменніца Т. Прыгун — Ірына Гурына. Самы малодшы з таленавітай дынастыі — васьмігадовы ўнук Раман Кісялёў, які на конкурсе юных выканаўцаў сярод навучэнцаў агульнаадукацыйных школ Мінска заняў 1-е месца, атрымаў дыплом.

Аднойчы звязаўшы свае лёсы, Уладзімір Уладзіміравіч і Тамара Міхайлаўна ніколі не разлучаюцца. Яны ўжо не ўяўляюць сябе паасобку. Агульныя справы, агульныя памкненні, сумесныя праекты. Яны ўсюды разам: і дома, і на працы, і на адпачынку. Хаця адпачынак у гэтай сям'і своеасаблівы. Гэта канцэрты — пачэсны вынік складанай, але цікавай і змястоўнай дзейнасці.

Дзе ж чэрпаюць гэтыя людзі столькі натхнення, адкуль у іх такая прага да творчасці, да працы? Сакрэт раскрыла Тамара Міхайлаўна. Крыніца натхнення — у вялікай сіле роднай зямлі і той сямейнай гармоніі, якую яны з мужам для сябе стварылі.

І ліецца па-над родным краем чароўная мелодыя іх кахання — часцінка вялікай гармоніі Сусвету.

Валянціна ШЧАРБАКОВА
г. Нясвіж

Радуемся разам

Ажывілася дзейнасць Мемарыяльнага музея-майстэрні З. І. Азгура. Прыкметны дом, што знаходзіцца на сталічнай вуліцы, названай пасля смерці знанага беларускага скульптара яго імем, быў пабудаваны больш як два дзесяцігоддзі таму — адмыслова пад акадэмічную майстэрню для народнага мастака СССР Героя Сацыялістычнай Працы Заіра Азгура. Тут ён працаваў і праводзіў імправізаваныя экскурсіі для гасцей, якім цікава было апынуцца ў незвычайным асяроддзі постацяў, фігур, статуэтак, бронзавых і гіпсавых твараў знакамітых і безыменных людзей. Апошнім часам будынак па вуліцы Азгура, 8, нібыта выпаў з культурнага асяроддзя: разгарнуўся працяглы рамонт. І толькі летась, калі адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння З. Азгура, яго Мемарыяльны музей-майстэрня нагадаў пра сябе адкрыццём грунтоўнай юбілейнай выстаўкі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Увагу шырокай публікі гэтая цікая сядзіба мастацтва прыцягнула сёлетняй вясной, калі тут, разам з усім культурным светам, адзначалі Міжнародны дзень музеяў і ладзілі "музейную ноч".

Імпрэза рыхтавалася музейцамі разам з Беларускім саюзам мастакоў, яго секцыяй скульптуры і аддзяленнем скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Амаль 10 гадзін, да глыбокай ночы, працягвалася акцыя "Дзень скульптара"; быў прадстаўлены праект П. Вайніцкага "Галовы. Антыпартрэты"; адбыўся вернісаж "Думкі і вобразы. Са студыйнай прасторы ў гарадское асяроддзе"; прайшлі ўрокі лепкі, кінапаказ і відэалекцыя, перформанс "Інквізіцыя маралі" ды начная праграма "Мастацтва замест сну"... Гэты музей, заснаваны на базе творчай майстэрні Акадэміі мастацтваў СССР і персанальнай майстэрні З. Азгура, выступіў з ініцыятывай штогадовага святкавання на сваёй пляцоўцы Дня скульптара.

На рэтрапраграму "Калі заўтра вайна" запрашае гледачоў Музей гісторыі беларускага кіно. Гэта рэдкасная і надзвычай цікавая падборка фільмаў: "Вялікая ілюзія" (Францыя, 1937 г.), "Дачка Радзімы" (СССР, 1937 г.), "Калі заўтра вайна...", "Прафесар Мамлок", (абедзве стужкі савецкай вытворчасці, 1938 г.). Сёння, 12 чэрвеня, плануецца паказ "Аляксандра Неўскага" (СССР, 1938 г.). Да канца месяца можна паглядзець фільмы "Замежны карэспандэнт" (ЗША, 1940 г.), "Джордж з Дзінкі Джаза" (Вялікабрытанія, 1940 г.), "Памылка інжынера Кочына" (СССР, 1940 г.) ды "Вялікі дыктатар" (ЗША, 1940 г.). Спецыяльная рэтрапраграма "Вёрсты вайны" прысвячаецца 85-годдзю з дня нараджэння Васіля Быкава і 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У яе ўключаны стужка "Васіль Быкаў. Узыходжанне" рэжысёра-дакументаліста Віктара Дашука, мастацкія фільмы "Трэцяя ракета" Рычарда Віктарава, "Альпійская балада" Барыса Сцяпанава, "Узыходжанне" Ларысы Шапіцькі, "Знак бяды" Міхаіла Пташука.

У Магілёўскім музеі імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі, філіяле Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, працягваецца выстаўка "Кераміка Пабло Пікасо". Апроч 36-і твораў славутага майстра (а гэта амаль уся калекцыя, што захоўваецца ў Мінску, у НММ Беларусі, — тыражныя сподкі, талеркі, вазы, глякі, выраблены пры непасрэдным удзеле аўтара ці пад яго наглядам), экспануюцца графічныя работы знанага французскага мастака Фернана Лежэ і яго жонкі Надзеі Хадасевіч-Лежэ. Вядома, што менавіта ёю, нашай зямлячкай, якая сябравала з Пікасо, узоры яго непаўторнай керамікі былі перададзены ў дар беларускаму музею.

Лана ІВАНОВА

На здымку: будынак Мемарыяльнага музея-кватэры З. І. Азгура.
Фота аўтара

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе прыём у магістратуру на 2009 год

на бюджэтнай аснове

з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасці:

1—16 80 01 "Музычнае мастацтва" (тэорыя і гісторыя музыкі, фартэпіяна, альт, драўляныя духавыя інструменты, медныя духавыя і ўдарныя інструменты, баян-акардэон, спевы);

без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасці:

1—16 80 01 "Музычнае мастацтва" (фартэпіяна, скрыпка, струнныя народныя шчыпкова-ўдарныя інструменты, дырыжыраванне (акадэмічны хор)).

Асобы, якія паступаюць у магістратуру, падаюць заяву на імя рэктара акадэміі.

Да заявы дадаюцца наступныя дакументы:

- копія дыплома аб вышэйшай адукацыі;
- копія дадатка да дыплома аб вышэйшай адукацыі;
- тры фотакарткі 3х4;
- выпіска з пратакола пасяджэння савета факультэта для асоб, якія рэкамендаваны для паступлення ў магістратуру ў год заканчэння ВНУ;
- медыцынская даведка па адпаведнай форме;
- спіс і копіі навуковых апублікаваных прац (пры наяўнасці);
- копіі дыпломаў лаўрэатаў ці дыпламантаў рэспубліканскіх конкурсаў навуковых прац (пры наяўнасці);
- копіі дыпломаў лаўрэатаў ці дыпламантаў выканальніцкіх конкурсаў (пры наяўнасці);
- выпіска з працоўнай кніжкі (для працуючых);
- рэферат па абранай спецыяльнасці з рэцэнзіяй;
- копія пашпарта;
- пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Паступаючыя здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці. Прыём дакументаў праводзіцца 29, 30 чэрвеня, 1, 2 ліпеня з 10.00 да 15.00; 27 чэрвеня і 5 ліпеня — з 10.00 да 12.00; 4 ліпеня — з 12.00 да 14.00. Уступныя экзамены — 6, 7 ліпеня 2009 года.

Плынь святла і дабрыні

Літоўская мастачка Бірутэ Куцкайтэ нарадзілася і першыя гады пражыла ў Гервяцкім краі, што на Астравеччыне. Духоўная повязь з радзімай захавалася ў мастачкі на ўсё далейшае жыццё...

Першае, што я бачу, прачынаючыся ранкам, — сонечныя сланечнікі ў гліняным збаночку, якія вісяць насупраць майго ложка. Яны запаўняюць мой пакой і мой ранішні настрой святлом — і ўжо не так важна, свеціць за акном сонца ці імжыць надакучлівы восеньскі дождж. А калі яшчэ са сцяны ля парога, праводзячы мяне на працу, усміхнецца чароўны блакітны кот — добры-добры, якімі бываюць толькі каты Бірутэ, — я ведаю: дзень будзе ўдалы. Не ў тым сэнсе, што ніхто мяне не пакрыўдзіць, не абразіць і ўсё задуманае атрымаецца — тут ужо, што называецца, раз на раз не выпадае. Але пазітыўны настрой, што падарылі мне зранку карціны Бірутэ Куцкайтэ, добрыя і светлыя, як яна сама, дапаможа справіцца з усім, што пашле мне сённяшні дзень — перажыць стому бясконцых клопатаў, зайздрослівыя позіркі нядобразычліўцаў, нейкія дробныя няўдачы і непрыемнасці.

Я не перастаю захапляцца Бірутэ Куцкайтэ, членам Саюза народных мастакоў Літвы і — адзначаю гэта з радасцю і гонарам — нашай зямлячкай. І не стамляюся расказваць пра яе маладым людзям, якія скардзяцца на неўладкаванасць, шэрасць будзённага жыцця, на сваю незапатрабаванасць і страчанасць у гэтым імклівым, мітуслівым, абыякавым свеце, на тое, што жыць сумна і нецікава. На тое, "што ўсё лепшае прыдумана да нас, усё правільнае сказана не намі, а нам застаўся толькі пераказ". Ну, хай сабе пераказ! Але ж і пераказаць можна так, што дух займае! І калі твой "пераказ" стаўся для некага адкрыццём, — дык чаму ён не можа звацца творам мастацтва?

Вядома ж, да Бірутэ Куцкайтэ кветкі маляваў не адзін мастак! І вельмі таленавітыя, і нават геніяльныя. І вучні знакамітых майстроў. Але ж мне дапамагаюць спраўляцца з дэпрэсіяй менавіта сланечнікі Бірутэ! І я дзякую Богу, што аднойчы, у 1987 годзе, ва ўжо даволі сталым узросце, калі многія жанчыны лічаць, што жыццё скончылася і засталося ім толькі глядзець серыялы ды назапашваць хваробы, яна ўбачыла на дачы ў сястры Ніёле кветкі, хараством якіх так захапілася, што ўзяла ў рукі пэндзаль. Каб ужо не выпускаць яго ніколі. І пісаць, ствараць, дарыць людзям свае карціны, якія ў большасці сваёй (я не бачыла ўсе) — гэта магутная плынь святла і дабрыні.

Чаму Бірутэ пачала маляваць? Напэўна, усё ж нагадалі пра сябе гены. У сям'і, здаецца, само паветра было працятае творчасцю, мастацтвам. Бацька, Уладас Куцка, быў таленавітым разьбяром па дрэве, неперaўзыдзеным майстрам па вырабе калаўротаў, якія яшчэ і сёння служаць ткаллям гервяцкага краю і захапляюць не толькі сваёй функцыянальнасцю, але і мастацкасцю аздаблення. Маці, Элеанора Юравічутэ-Куцкайтэ, — слынная на ўсю акругу вышывальшчыца і вязальшчыца. Сястра Ніёле ад народнага мастацтва пакрочыла ў прафесійнае: стала балерынай, салісткай Акадэмічнага тэатра оперы і балета Літвы.

А Бірутэ абрала зусім, на першы погляд, не творчую прафесію — гукааператар на Літоўскім радыё. І вось узялася за пэндзаль, каб перадаць на палатне харaство кветкі...

Не перастаю захапляцца — ды і здзіўляцца — таму, як мастачка ставіцца да сваёй малой радзімы, вёскі Кністушкі Астравецкага раёна. Сям'я пераехала ў Вільнюс, калі Бірутэ была яшчэ маленькая. Ну што, здавалася б, можа помніць дзіцё з таго вясковага жыцця, хай сабе і прыязджала сюды часта пагасціць? А паглядзець на яе карціны — гэта ж няспынны гімн малой радзіме мастачкі! Гервяцкі касцёл, прыгажосць і веліч якога нікога не пакідаюць абыякавым; вясковая бабулька з такой жа добрай, як у Бірутэ, усмешкай; на сцяне вясковай хаты — пляцёнка цыбулі; букет простых і геніяльных, як жыццё, рамонкаў... І каты: ружовыя, блакітныя, са званочкамі — як з дзіцячых сноў і казак.

У Бірутэ Куцкайтэ прайшло 16 персанальных выставак у Літве і Беларусі. Яе паштоўкі выдаваліся ў ЗША. Яе карціны захоўваюцца ў многіх прыватных калекцыях. Не бяруся ацэньваць мастацкую вартасць саміх работ, бо я не мастацтвазнаўца, але думаю, што яе поспех — сведчанне менавіта высокай каштоўнасці твораў. Мне ж карціны Бірутэ не проста падабаюцца — яны дапамагаюць жыць. Нездарма яе работы знаходзяцца ў многіх прыватных калекцыях, і мастачка працягвае шчодра дарыць іх сваім сябрам і знаёмым.

Яе жыццёвае крэда мне таксама даспадобы: "Трэба ісці па жыцці, высока ўзняўшы галаву. Тады сонца, неба і птушкі будуць бліжэй. І ўсё ў вас атрымаецца". І многія жыхары Астравеччыны, захопленыя талентам Бірутэ Куцкайтэ, удзячныя ёй за дабрыню, мудрасць, за тое, што ўсім сваім жыццём і творчасцю яна дапамагае бачыць святло і цягнуцца да яго.

Ніна РЫБІК
г. Астравец

Энтузіязм як стратэгія керамістаў

У сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" прайшла выстава "Кола агню" — вынік работы VI Міжнароднага пленэру па кераміцы "Арт-жыжаль". Ужо традыцыйная для гэтай галерэі выстаўка дала падставу грунтоўна асэнсаваць стан і праблемы развіцця мастацкай керамікі ў Беларусі.

У межах выставы адбылася навукова-творчая канферэнцыя "Класіка і авангард беларускай керамікі", праведзеная ў канферэнц-зале бібліятэкі БДУ культуры і мастацтваў. Прысутныя падкрэслілі надзвычай важную ролю ў мастацкім працэсе нашай краіны пленэраў па кераміцы "Арт-жыжаль", адзначылі іх няўтомнага арганізатара Валерыя Калтыгіна. Сам жа майстра не звяртае ўвагу на ўхвальныя эпітэты і даволі крытычна ставіцца да кампліментаў, хаця і заслужаных. Валерый Калтыгін бачыць пэўную небяспеку ў тым, што пленэр вычэрпвае свой тэхналагічны рэсурс.

Але ж галоўным рэсурсам пленэру з'яўляюцца найперш людзі. І майстры, і моладзь, для якой такая праца становіцца сапраўднай школай майстэрства. Школай, дзе можна пераняць унікальны вопыт і ўменні старэйшых калег. Неацэнны досвед працы з "адкрытым полымем", спасціжэнне тэхналагічных сакрэтаў працы з шамотам, паліваміі, абварамі... І ў выніку — узбагачэнне мастацкай скарбонкі "Арт-жыжаля" новымі ідэямі, пластычнымі і каларыстычнымі здабыткамі. Дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ, вядомая керамістка, арганізатар канферэнцыі Тамара Васюк адзначыла шэраг выхаванцаў сваёй кафедры, якія ўдзельнічалі ў пленэрах "Арт-жыжаля". Кастусь Цітоў, Алег Ткачоў, Павел Пазнякоў ды іншыя заявілі пра сябе не толькі як таленавітыя маладыя мастакі, але ж і як камерцыйна паспяховыя асобы, якія зарабляюць на жыццё менавіта керамікай. Таксама вылучыліся ўдзельнікі пленэраў — выхаванцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: Ірына Шчасная, Любоў Баразна, Алена Чэпелева... Дарэчы, Валерый Калтыгін адзначыў, што ён ахвотна прымае да ўдзелу ў пленэрах выхаванцаў БДУ культуры і мастацтваў, БДАМ, Магілёўскага вучылішча культуры. Галоўная ўмова адбору — малады кераміст павінен быць прафесійна падрыхтаваны і гатовы да цяжкай, напружанай працы. Сапраўды, некаторыя абпалы заканчваюцца далёка занач, а з ранку трэба зноў уключацца не толькі ў творчы працэс, але і ў тэхналагічныя работы па абслугоўванні печаў і г.д. Таму на пленэры няма месца гультаям і людзям са слабай фізічнай падрыхтоўкай.

Доктар мастацтвазнаўства Валерый Жук у сваім выступленні акрэсліў асноўныя праблемы мастацкай керамікі. Напрыклад, пры закупках для музеяў творы керамікі ацэньваюцца на парадак ніжэй за жывапіс ці графіку. А матэрыяльных і фізічных затрат на керамічны твор ці мастацкі твор са шкла патрабуецца нашмат болей, чым на стварэнне, напрыклад, работы ў тэхніцы алейнага жывапісу, ужо не кажучы пра акварэль. Таксама В. Жук падкрэсліў залежнасць керамікі ад поглядаў на архітэктуру. Напрыклад, ён прыгадаў 1970-ыя гады — "залатыя часы" керамікі, калі існавала мода на керамічныя інтэр'еры. Керамічнымі пано аздаблялі кафэ, рэстараны, клубы, кінатэатры, грамадскія ўстановы. Сёння ў нашай прасторы, і, што самае горшае, у галовах заказчыкаў, пануе так званая "еўрабудоўля", якая не мае кропак судакранання з прыроднымі матэрыяламі, і з глінай у першую чаргу. Заўважу, што ў асяроддзі бізнесоўцаў моднымі цяпер з'яўляюцца творы з іржавага металу, якія, вядома ж, маюць права на існаванне. Ды і творы "Арт-жыжаля" часам нагадваюць эстэтыку постіндустрыяльнай металапластыкі. Сёння неадкладнай задачай керамістаў з'яўляецца папулярызацыя, "піар" сваіх дасягненняў, увядзенне іх віду творчасці ў кантэкст сучаснага мастацтва.

На канферэнцыі гаварылася не толькі пра стан мастацкай керамікі, былі закрануты і праблемы керамікі прамысловай. Сваімі назіраннямі пра нялёгкае становішча керамістаў-прамыслоўцаў падзяліўся Міхаіл Казярог, галоўны тэхнолаг знакамітага завода ў Івянцы. Але ж выступленні мастацтвазнаўцаў унеслі ў ход абмеркавання аптымістычны настрой. Яўген Шунейка выказаў упэўненасць, што выратуюцца мастакі-керамісты менавіта энтузіязмам. Яго падтрымала Таццяна Гаранская — канкрэтнымі прыкладамі творчасці мастакоў, якія не чакалі хуткага поспеху, а самаадданa працавалі і дасягалі ў выніку плёну. Кераміка — насамрэч высокае мастацтва, здатнае адлюстраваць не толькі побытавыя ці гумарыстычныя тэмы, але і выказаць сапраўдную трагедыю. Такая выснова прагучала ў выступленні мастацтвазнаўцы Ларысы Фінкельштэйн, якая падсумавала вынікі канферэнцыі.

Дзяніс БАРСУКОЎ

На здымках: работы беларускіх керамістаў розных гадоў.

Фота Святланы Берасцень

№ 22 12 чэрвеня 2009 г. Лім

Калі падлічыць, колькі кніг захоўваецца ў сярэднестатыстычнай сям'і, то наўрад ці налічыцца хоць бы некалькі соцень. Зрэшты, сем'і бываюць рознымі, і па колькасці кніг іншая можа паспрачацца з невялікай правінцыйнай бібліятэкай.
Але як уявіць у звычайнай кватэры 15 тысяч (!) кніг, якія не проста стаяць на паліцах, а гаспадар актыўна карыстаецца імі ў сваёй працы? Прызнацца — з цяжкасцю!

Захавальнік старажытнасці сівой

Ёсць у яго калекцыі, частку якой ён перадаў у экспазіцыю выставы, створанай у сценах вайсковага факультэта, і рэдкія прадметы — жэтон сельскага старасты Гарадзенскай губерні, памятны медаль Генеральнага штаба Расійскай імперыі, гузікі з мундзіраў заваёўнікаў, якія мелі няшчасце ўварвацца на нашу зямлю і нават ядро са шрапнеллю ўсярэдзіне, якое не разарвалася.

Менавіта столькі кніг убачыў я ў асабістай бібліятэцы намесніка начальніка навучальнай часткі вайсковага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы маёра Аляксандра Сявенка.

У Аляксандра неверагодная па сваёй унікальнасці бібліятэка, якая налічвае звыш 15 тысяч выданняў, якія датаваны сярэдзінай XVIII стагоддзя, а таксама маюцца найноўшыя кнігі па гісторыі і этнаграфіі. Тры тысячы з іх фаліянтаў — старажытныя, каштоўныя выданні. Кнігі часам трапляюць да Аляксандра ў вельмі дрэнным стане. Іх трэба "лячыць" — дбайна чысціць ад бруду кожную старонку, іншы раз зноўку пераплятаць. А гэта карпатлівая праца, якая патрабуе выдаткаў і часу! На жаль, habent sua fata libelli — кнігі маюць свой лёс, як гаварылі рымляне.

Сваю бібліятэку Аляксандр Сявенка пачаў збіраць яшчэ школьнікам. Шматлікія факты з гісторыі Гародні сталі вядомыя толькі дзякуючы даследаванням, як ён гаворыць, "на тысячу гадоў назад і на два метры ўглыб".

На пытанне, у чым каштоўнасць старажытнай кнігі, Аляксандр адказаў не задумваючыся:

— У тых унікальных звестках, якія яна ўтрымлівае. Іншы раз гэта першакрыніца ў даследаваннях па ваеннай гісторыі і краязнаўстве. Ёсць у маім зборы і асобнікі, якіх няма, верагодна, нават у Нацыянальнай бібліятэцы — рукапісныя лісты са старажытных кніг на пергаменце, рэдкія аўтографы, прыжыццёвыя публікацыі Элізы Ажэшкі ды іншых знакамітых аўтараў, "Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі — Гарадзенская губерня", выдадзеныя ў 1863 годзе, кнігі на польскай мове, датаваныя 1750 годам, падшыўкі часопіса "Ніва" канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Дарэчы, дачыненне да ўчарашніх газет у многіх абыякавае, перыёдыка лічыцца аднадзёнкай. А насамрэч — гэта багаты матэрыял для вывучэння эпохі, часам найпадрабязны летапіс мінулых гадоў. У мяне ёсць падшыўкі некаторых газет, пачынаючы з 1840 года, дзе па карэспандэнцкіх зводках ужо можна вывучаць гісторыю! Вельмі характэрныя і газетныя малюнкі. У тыя часы не было фатаграфіі ў тым выглядзе, у якім яна маецца цяпер. Тэхналогія яшчэ не дазваляла захаваць рухі. Трэба было замерці перад аб'ектывам на працяглы час. А рухі замалёўваліся да мяжы XX стагоддзя.

У маёра Сявенка, дарэчы, вельмі рэдкі і шырокі збор старых фатаграфій.

Аляксандр збірае ўсё, звязанае з ваеннай гісторыяй, — фатаграфіі, дакументы, кнігі, узнагароды. Ёсць у яго калекцыі, частку якой ён перадаў у экспазіцыю выставы, створанай у сценах вайсковага факультэта, і рэдкія прадметы — жэтон сельскага старасты Гарадзенскай губерні, памятны медаль Генеральнага штаба Расійскай імперыі, гузікі з мундзіраў заваёўнікаў, якія мелі няшчасце ўварвацца на нашу зямлю і нават ядро са шрапнеллю ўсярэдзіне, якое не разарвалася.

Унікальнасць калекцыі ў тым, што амаль усе экспанаты датычаць гісторыі Беларусі і Гарадзеншчыны. Войны, захопнікі знішчылі або разрабавалі шматлікія гістарычныя каштоўнасці, якія цяпер вялікая рэдкасць. Прадметы мінулага, што ўяўляюць нават не матэрыяльную, а хутчэй навуковую цікавасць, занялі сваё месца ў музеях, архівах або ў калекцыянераў, іншыя з якіх не маюць да навукі ніякага дачынення і зарабляюць на такіх рэчах грошы.

Да сваёй калекцыі маёр Сявенка падыходзіць з іншых пазіцый. Да прыкладу, бронзавы кінжал, датаваны першымі стагоддзямі нашай эры, можа патрымаць у руках любы яго госць. А калекцыяй старажытных кніг карыстаюцца гісторыкі і навукоўцы з універсітэта. Па сутнасці, гэта ўжо не бібліятэка, а сур'ёзны навуковы архіў, які зрабіў бы гонар любому музею або навучальнай установе, таму што ў ім нямала гістарычных дакументаў дарэвалюцыйнага перыяду.

У яго хатняй калекцыі ёсць і старажытны посуд — у прыватнасці, з каляровага шкла Гарадзенскага шклозавода "Нёман", які здзіўляе сваімі незвычайнымі для сённяшняга часу формамі. Прычым гэты посуд працягвае служыць у хаце Аляксандра па сваім прамым прызначэнні, што надае сервіроўцы стала невымоўную прыгажосць. Захавалася нават "стопка", з якой любіў піць яго прадзед — казак, фотаздымак якога маёр таксама перадаў на выставу ва універсітэт.

Аляксандр Віктаравіч Сявенка з дасканаласцю валодае польскай мовай і чытае кнігі ў арыгінале. Ведае англійскую і лацінскую. Гэта дапамагае працаваць са старымі дакументамі.

У сваіх даследаваннях ён знайшоў месца, дзе шведскі кароль Карл XII узімку 1708 года з войскамі пераправіўся праз Нёман і правалiўся пад лёд. У памяць аб сваім выратаванні шведскі кароль загадаў паставіць на беразе камень з высечаным надпісам. Ніхто не ведаў, дзе менавіта праходзіла пераправа, а Аляксандр знайшоў гэты кавалачак берага і, кіруючыся гістарычнымі дакументамі, сёння можа з дакладнасцю яго паказаць.

— На жаль, — наракае маёр Сявенка, — яно ў хуткім часе будзе затоплена за будаўніцтва плаціны, а магло б стаць месцам турыстычнага паломніцтва.

Жыццё кароткае, і чалавек абмежаваны ўласнымі ўспамінамі. Вывучаючы гісторыю і іншыя часы, я пачынаю іх разумець, яны робяцца як бы маімі і ствараецца ўражанне, што жывеш значна даўжэй. Гістарычныя падзеі, як быццам уліваюцца ў мае ўспаміны, а я стаўлюся іх удзельнікам. Бо я ведаю не толькі сухую статыстыку гістарычных дат, падзей, войнаў, мае даследаванні дазволілі прабрацца ў побыт людзей розных гадоў. А калі ёсць вызначанае разуменне гісторыі, пачынаеш бачыць доследны час не па асобных фрагментах, а цалкам, ва ўсёй яго шматстайнасці. Пранікаешся светаадчуваннем менавіта тых людзей, якія жылі да нас, лепш разумееш культуру і матывы чалавечых паводзін.

Сяргей КЛІМКОВІЧ

На здымках: калекцыянер Аляксандр Сявенка; частка унікальнай экспазіцыі.

Святло праз кнігу

У кожнага з нас ёсць мара. Нехта жадаў аб'ехаць увесь свет, а хтосьці — зрабіць вялікае адкрыццё, вынікам якога стаў бы ўсеагульны дабрабыт. Бальшыня, відаць, хацела б зусім няшмат і адначасова вельмі многага — проста быць шчаслівымі. Галоўная мара Людмілы Дашко — дырэктара Нясвіжскай бібліятэчнай сістэмы — пабудаваць новую бібліятэку, якая б стала сапраўдным Храмам кнігі. Ад моманту нараджэння гэтай задумы і да часу яе здзяйснення прайшлі гады. Але мара стала явай.

Людміла Сцяпанаўна — карэнная несвіжанка. У яе сям'і заўсёды паважалі кнігу. І таму ні для каго не стала навіной, што пасля заканчэння СШ № 1 г. Нясвіжа Людміла вырашыла паступаць у Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага на бібліятэчны факультэт. На канчатковае рашэнне паўплывала і мама, кіруючыся агульнапрынятым меркаваннем, што прафесія бібліятэкара вельмі спакойная. Але тут Марыя Васільеўна памылілася. Усе 37 гадоў працы ў гэтай галіне не былі для Людмілы Сцяпанаўны спакойнымі. Яе кіпучая натура пастаянна імкнулася да нечага новага, нестандартнага. Ёй ніколі не імпанавала работа па шаблоне. У сваёй дзейнасці яна штодня знаходзіла і знаходзіць арыгінальныя падыходы да вырашэння любых пытанняў. Гэтыя якасці ў свой час заўважылі ў Людміле старэйшыя калегі, калі яна толькі пачала працаваць у дзіцячай раённай бібліятэцы. У 1976 годзе Людміла Сцяпанаўна была пераведзена на пасаду загадчыцы аддзела абслугоўвання цэнтральнай бібліятэкі. Творчы падыход да працы жанчына найлепшым чынам прымяніла на новай пасадзе. Акрамя непасрэднай бібліятэчнай работы, разам з калегамі наладжвала цікавыя сустрэчы з вядомымі майстрамі слова, арганізоўвала літаратурныя вечары, удзельнічала ў пастаноўках Нясвіжскага народнага тэатра.

У 1994 годзе Людміла Сцяпанаўна была прызначана дырэктарам Нясвіжскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Пад яе кіраўніцтвам працавалі 43 філіялы. Вялася камп'ютэрызацыя бібліятэк, аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў. У арганізацыі дзейнасці бібліятэчнай сістэмы Людміла Сцяпанаўна кіравалася найперш вопытам шматгадовай дзейнасці ў гэтай галіне, а таксама не цуралася лепшых здабыткаў іншых бібліятэчных сістэм краіны і нават замежжа.

Адносіны з калегамі Людміла Сцяпанаўна будуе на добра вядомым усім прынцыпе — чалавечнасці. У вырашэнні многіх спрэчных пытанняў яна кіруецца перш за ўсё справядлівасцю, да кожнага шукае свой, асабісты падыход. Мо таму і калектыў, якім яна кіруе, зладжаны і надзейны.

У тым, што горад сёння мае новую, па-сучаснаму абсталяваную бібліятэку, ёсць заслуга і яе, дырэктара. Пачынаючы з часоў стварэння В. Дражным архітэктурнага праекта, яна пастаянна была ў курсе падзей, уносіла свае прапановы.

Нядаўна Людміла Сцяпанаўна адзначыла цудоўны юбілей. Яна прыйшла да гэтай даты з найлепшымі здабыткамі і здзяйсненнямі розных планаў. Узнёслая, прачулая Л. Дашко заўсёды ідзе ў нагу з часам. І кожнае яе памкненне нясе ў сабе святло, якое яна перадае праз кнігу.

Валянціна ШЧАРБАКОВА,
галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі Нясвіжскай раённай бібліятэкі.

«У часопіса, які не чытае моладзь, няма будучыні»

Гутарка з першым намеснікам дырэктара РВУ «Літаратура і Мастацтва», галоўным рэдактарам часопіса «Нёман» Алесем Бадаком

— Алесь Мікалаевіч, кажуць, з другога паўгоддзя часопіс "Всемирная литература" трэба шукаць на старонках "Нёмана"...

— І я спадзяюся, той, хто яе там знойдзе, не расчаруецца. Прынамсі, у бліжэйшых планах — дагэтуль невядомае рускамоўнаму чытачу апавяданне Жоржа Сімянона, раман знакамітага французскага пісьменніка Эдварда Форстэра "Пакой з выглядам", фільм па якім у 1985 годзе заваяваў тры "Оскары". Апроч таго, рыхтуюцца апавяданні папулярных сучасных венгерскіх пісьменнікаў, нешта з амерыканскай прозы, што таксама не выходзіла паруску.

— А вам не даводзілася чуць меркаванне, што наша літаратура і замежная пад адной вокладкай будуць глядзецца недарэчна?

— Даводзілася, прычым, нехта ў дадзеным кантэксце шкадаваў "Всемирку", нехта — "Нёман". На шчасце, шмат і тых, хто не бачыць у такім суседстве нічога ненармальнага. Хутчэй наадварот. Бо калі, напрыклад, венгры друкуюць у сябе сучасных беларускіх аўтараў і лічаць гэта нармальнай з'явай, то чаму мы ў сябе, друкуючы іх, павінны лічыць інакш? Дарэчы, пагартайце "Нёман" 80-х ці 70-х гадоў мінулага стагоддзя: там рэгулярна друкаваліся творы замежных пісьменнікаў, і не толькі Маркеса, якога многія найперш і згадваюць, калі гаворка заходзіць пра "той час". Вось толькі сёння Маркеса надрукаваць у "Нёмане" вельмі складана — правы на публікацыю яго твораў па-руску даўно выкуплены.

— І на публікацыю не толькі яго твораў...

— Вядома. Тыя ж Міларад Павіч ці Мілан Кундэра, ці Харукі Муракамі — шкада, але пакуль не нашы аўтары.

— Што значыць, "пакуль"?

— Тое і значыць. Зусім нядаўна ў размове з адным нашым перакладчыкам з французскай мовы пра перспектывы публікацый твораў замежных пісьменнікаў у "Нёмане" прагучала імя Рамэна Гары. Чаму ж неўзабаве не можа прагучаць імя... Але каб не сурочыць, давайце пагаворым пра гэта пазней, калі тое, што нам пакуль абяцана на словах, можна будзе патрымаць у руках.

— Аднак давайце не будзем забываць, што "Всемирка" дадалася да "Нёмана", а яго аб'ём застаўся ранейшым.

— Справа ў тым, што яна дадалася, калі мы ўжо заключылі з Белпоштай дамову, у якой быў вызначаны, у тым ліку, і аб'ём "Нёмана".

— А як у наступным годзе?

— Гэта будзе шмат ад чаго залежаць. Напрыклад, ад тыражу. Ад таго, якой пад канец гэтага года будзе самаакупнасць часопіса. Мы павінны лічыць кожную капейку. Вось мяняем вокладку, будзе ў чатыры колеры, бо ў яе афармленні хочам выкарыстоўваць карціны ці фрагменты карцін знакамітых беларускіх мастакоў,

пачынаючы ад Бялыніцкага-Бірулі, Цвіркі, Хруцкага. Дык нехта з супрацоўнікаў рэдакцыі, памятаю, заўважыў: але ж гэта паўплывае на самаакупнасць. Таксама капейка. Можа, і не адна. Але вокладка — гэта твар часопіса. А праз мастацтва — яшчэ і твар Беларусі.

— Тыраж, самаакупнасць... Не дзіва, што вы так мройна загаварылі пра Павіча, пра Кундэру...

— Ды не, якраз найперш мы разлічваем на нашых аўтараў і на нашу літаратуру, якая, між іншым, усё часцей друкуецца ў той жа Еўропе, у Расіі. Іншая справа, што чым вышэй будзе ўздымацца планка патрабаванняў да рукапісаў, тым цікавейшы, а значыць, і больш запатрабаваны будзе часопіс. А як толькі планка крыху апускаецца — чарга на публікацыю расцягваецца на год і больш наперад. Прычым, гэтыя даўжэзныя чэргі на публікацыю старонняга чалавека могуць навесці на дзве супрацьлеглыя думкі: або ў літаратуры шмат выдатных пісьменнікаў, або наадварот, няма з чаго асабліва выбіраць.

— А не старонняга?

— Не старонні ведае, што ўсё куды больш складана.

— Наша вечная праблема?

— Не толькі наша. Нядаўна ў нашай установе гасцявалі балгарскія пісьменнікі. Усміхаліся, хоць і горкай усмешкай: у Балгарыі пісьменнікаў больш, чым чытачоў. Таму праблема не толькі наша. Але, думаю, не вечная. Я заўважыў яшчэ да "Нёмана", — і калі ў "Маладосці" працаваў, і калі ў "Полымі": моладзь... Ды што значыць — моладзь: ім ужо па трыццаць, а часам яшчэ і саракагадовых лічаць маладымі. Дык вось яны, у пераважнай большасці сваёй, зусім не так хваравіта рэагуюць, калі ім адмаўляюць у публікацыі, ужо не кажучы пра тое, калі ім кажуць, што трэба нешта дапрацаваць, нешта паправіць, скараціць, а да ўсяго трэба пачакаць, што раман ці аповесць, ці няхай сабе і вершы мусяць паляжаць у запасе. Я не памятаю, каб яны калі пісалі скаргі ў розныя інстанцыі, што вось, маўляў, не ацанілі мой чарговы геніяльны твор.

— Можа, таму і не скардзяцца, і гатовыя доўга чакаць публікацыі, што маладыя: сціплыя яшчэ, не аблашчаныя славай, прэміямі рознымі.

— Ды не, куды там сціплыя. Проста ў іх выпрацавалася большая творчая самастойнасць і незалежнасць ад пэўнага выдання. Не надрукуе "Маладосць" — панясуць у "Дзеяслоў". Ці наадварот. Кнігі выдаюць — як бліны пякуць. Ды дзякуй Богу, што выдаюць. Хіба лепш было, калі мы калісьці чакалі некалькі гадоў, каб трапіць у выдавецкія планы? Іншая справа, што магчымасць хутка выдацца часам успрымаецца як сведчанне бездакорнасці ўласных твораў. Асабліва ў прыватных выдавецтвах катастрафічна не хапае прафесійных рэдактараў. Якія могуць не толькі папрацаваць над стылем, для чаго, зрэшты, ёсць стыльрэдактары, ці расставіць коскі, для чаго ёсць карэктары, а менавіта займацца рэдактурай твора. Добры рэдактар — гэта ж другое "я" аўтара. І гэтае другое "я" павінна быць куды больш строгае, чым "я" першае. Памятаю, калі прыйшоў працаваць у "Полымя" ў аддзел прозы, у шуфлядзе стала знайшоў агульны сшытак, у якім яшчэ рукой Івана Пташнікава было запісана на шматлікіх старонках: ад каго з празаікаў калі і што паступіла ў аддзел, далей — свая ацэнка твора, далей — прысуд: ці прапаноўваць да друку ў канкрэтны нумар, ці вярнуць аўтару на дапрацоўку, ці вярнуць яму назусім. Цікавейшы сшытак, шкада, што ён не захаваўся. Гэткі своеасаблівы дзённік жыцця аддзела за некалькі гадоў. Многім ужо тады дастаткова вядомым аўтарам Пташнікаў вяртаў рукапісы на дапрацоўку з лёгкасцю і чыстым сумленнем. А сёння часам адбываюцца рэчы, якія, думаю, Івану Мікалаевічу і не сніліся. Вось нядаўна заходзіў аўтар, у якога ў "Нёмане" ляжыць раман. Кажа: калі надрукуеце, я выпішу 300 (!) экземпляраў таго нумара. Я спачатку падумаў, што не дачуў пра колькасць. Пытаюся: а навошта вам столькі? Перадасць у бібліятэкі. Назбіраў 500 долараў дачцэ на камп'ютэр, але сёння так цяжка надрукавацца (!) ці выдацца (!). Я кажу: ці будзе раман надрукаваны, ці не — лепш купіце камп'ютэр. Дарэчы, ён пераказваў сюжэт таго свайго рамана — цікава, цягне пачытаць.

І ўсё ж самастойнасць у літаратуры — вялікая рэч. Дзякуючы ёй вось і замежжа для маладых куды бліжэй знаходзіцца, чым для тых, хто ў літаратуру прыйшоў яшчэ за савецкім часам. Пакуль старэйшыя высвятляюць паміж сабой, хто з іх больш таленавіты, маладыя проста дружна перакладаюцца, выдаюцца. І па-мойму, зусім не чакаюць, калі тыя самыя старэйшыя саступяць ім сваё месца. Бо ў іх іншыя п'едэсталы. Зусім іншыя. Але хацелася б, каб "Нёман" быў цікавы і ім. Цікавы і трыццацігадовым, і саракагадовым. І не толькі пісьменнікам, але і мастакам, музыкантам, акцёрам. Ды пры гэтым не разгубіў і чытачоў больш сталага веку. У часопіса, які ніколі не трымаюць у руках людзі сталага веку, — няма мінулага, а ў часопіса, які не гартае моладзь, — няма будучыні. Хоць, вядома, ёсць тэмы "пазаўзроставыя", звяртацца да якіх, калі хочаце, наш духоўны абавязак. Ну вось, напрыклад, у другім паўгоддзі мы пачынаем друкаваць шэраг твораў да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай. Гэта і мастацкія і дакументальныя рэчы. Да ўсяго, што так ці інакш звязана з дакументалістыкай, мы ўвогуле ставімся з вялікай пашанай. І не толькі мы, сёння ва ўсім свеце такія жанры запатрабаваныя. Спадзяюся, тут мы зможам задаволіць самыя розныя чытацкія густы. Бо ў планах — успаміны Аляксандра Карскага пра свайго знакамітага дзеда Яфіма Карскага, несумненна, знакавую фігуру ў гісторыі Беларусі. Пасля — прыватныя гутаркі двух вядомых грамадскіх дзеячаў савецкай эпохі Панцеляймона Панамарэнкі і Кірыла Мазурава. Мазураў запісваў іх у свой нататнік у 1983 годзе. Рыхтуем да друку ўспаміны сястры Сяргея Прытыцкага, вядомага заходнебеларускага рэвалюцыянера. Калісьці пра яго быў зняты фільм "Чырвонае лісце", але яе ўспаміны даюць куды больш поўнае ўяўленне пра цікавы і няпросты лёс гэтага чалавека. Не так даўно з магнітафонных стужак, якія нам прапанаваў вядомы пісьменнік Анатоль Сульянаў, быў зняты тэкст аўтарскай вечарыны Васіля Быкава ў Доме літаратара, прымеркаванай да яго 60-годдзя. У аснове тэксту — адказы на пытанні прысутных. Яшчэ на адной стужцы — сустрэча Васіля Быкава і Алеся Адамовіча з афіцэрамі Беларускай ваеннай акругі, якая адбылася 9 лютага 1984 года. Цяпер трэба ўсё гэта давесці да ладу і, вядома ж, друкаваць. Уладзімір Ягоўдзік прапанаваў нам свае згадкі пра сустрэчы з Уладзімірам Караткевічам, Зоськай Верас, Міхасём Рудкоўскім, Янам Скрыганам, Уладзімірам Калеснікам. Пабольш бы такіх успамінаў, якія патрэбны не тым, каго ўжо, на жаль, няма з намі, а нам самім, нашай літаратуры, яе будучыні. Успамінаў пра тых жа Міхася Стральцова, Івана Шамякіна, Анатоля Грачанікава, Івана Чыгрынава, Барыса Сачанку, Вячаслава Адамчыка... Не казённа-юбілейныя, а шчырыя, сардэчныя. А колькі яшчэ цікавага і невядомага шырокаму чытачу знаходзіцца ў дзяржаўных і прыватных архівах. Нядаўна размаўляў з дачкой Адама Русака, аказваецца, у яе ёсць лісты, якія пісаў яе бацьку Міхаіл Ісакоўскі, той самы, што паставіў сваё прозвішча пад перакладам на рускую мову верша "Бывайце здаровы...", а таксама Леаніда Уцёсава, які, калі верш стаў словамі папулярнай песні, уключыў яе ў свой рэпертуар.

І ўсё ж самастойнасць у літаратуры — вялікая рэч. Дзякуючы ёй вось і замежжа для маладых куды бліжэй знаходзіцца, чым для тых, хто ў літаратуру прыйшоў яшчэ за савецкім часам. Пакуль старэйшыя высвятляюць паміж сабой, хто з іх больш таленавіты, маладыя проста дружна перакладаюцца, выдаюцца. І па-мойму, зусім не чакаюць, калі тыя самыя старэйшыя саступяць ім сваё месца. Бо ў іх іншыя п'едэсталы. Зусім іншыя. Але хацелася б, каб "Нёман" быў цікавы і ім. Цікавы і трыццацігадовым, і саракагадовым. І не толькі пісьменнікам, але і мастакам, музыкантам, акцёрам. Ды пры гэтым не разгубіў і чытачоў больш сталага веку.

— А недасведчанаму чалавеку можа падацца, што ўсё цікавае з архіваў ужо надрукавана.

— Ну што вы! Вось дзякуючы Уладзіміру Ягоўдзіку ў рэдакцыі "Нёмана" апынуўся адбітак карэктуры кнігі Івана Сініцкага "Новая Зеландыя — Еўропа. Падарожныя ўражанні". Сама карэктура захоўваецца ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, а кніга чамусьці так і не выйшла. А, між тым, яна і сёння чыталася б з цікавасцю. Дарэчы, Іван Сініцкі яшчэ напісаў успаміны "З майго жыцця ў вёсцы". Гэта пра яго родную Смаргоншчыну пачатку дваццатага стагоддзя. Успаміны знаходзяцца ў Маскве, у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, у аддзеле рукапісаў фонду пісьменніка і кнігазнаўцы Мікалая Рубакіна. Думаю, што яны таксама вельмі цікавыя.

Вядома, шмат у часопісе было, ёсць і будзе матэрыялаў пра наш сённяшні дзень. Пра цікавых людзей, пра цікавыя падзеі. Вяртаецца рубрыка "У свеце навукі". У "Нёмана", пачынаючы з 45-га года, увогуле шмат цудоўных традыцый. І калі карціць прыдумаць нешта новае, часам бывае карысна паглядзець яго старыя падшыўкі.

— А калі гаварыць пра ўласна літаратурныя творы нашых пісьменнікаў?

— Ну вось, напрыклад, у ліпені мы пачынаем друкаваць гістарычны раман Алега Ждана "Князь Мсціслаўскі". Ён пра падзеі, якія адбываліся ў шаснаццатым стагоддзі на нашай зямлі, калі паміж Польшчай і Расіяй ішла жорстая барацьба за свае тэрыторыі. Праз гэта старажытны Мсціслаў апынуўся ў аблозе. Раман сапраўды вельмі цікавы, яму б яшчэ добрую раскрутку зрабіць. Спадзяюся, нешта прапануе часопісу і празаік Наталля Голубева, якая цяпер усё актыўней працуе ў гістарычнай прозе. Ці ўзяць тую ж Алену Папову, невялікі раман якой павінен з'явіцца ў "Нёмане" восенню. Яе ведаюць у Еўропе як пераможцу Першага еўрапейскага конкурсу п'ес, як аднаго з аўтараў анталогіі "Жанчыны-пісьменніцы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы", што выйшла ў Лондане. Нарэшце, яе добра ведаюць у Расіі, бо там яна рэгулярна друкуецца, прычым, у самых аўтарытэтных літаратурных часопісах, а ў нас, як заўсёды, неяк неаацэнена. Нават і не ведаю, ці мае яна хоць якую прэмію. Зрэшты, справа не ў прэміях. Некаторыя нашы жанчыны-літаратаркі не маюць ніводнай, але пра іх рэгулярна пішуць газеты — якія фільмы падабаюцца, што дома гатуюць.

— Гэта добра ці кепска?

— Адны пісьменнікі любяць хвацца ў цяньку славы, іншыя — паваляцца на яе санцапёку. Кожнаму сваё. Але для самой літаратуры як тавару, які трэба прадаць, якому трэба знайсці свайго чытача, гэта, безумоўна, добра.

— Для многіх паняцці "літаратура" і "тавар" проста несумяшчальныя.

— Сыходзячы з гэтай логікі, кнігі ці часопісы трэба дарыць, а не прадаваць. Хоць, калі ўлічыць, што колькасць чытачоў з часам усё памяншаецца, можа, яно было б і някепска. Зрэшты, на цікавы твор і грошай не шкада, калі ён, вядома, па кішэні, а нецікавы і за так нікому не патрэбны.

— Літаратуру Сярэднявечча сёння таксама мала хто чытае...

— Але ж за ёй — агромністая армія чытачоў некалькіх мінулых стагоддзяў, якая, між іншым, што б там не казалі пра "мала хто чытае", пастаянна папаўняецца. Па ўсім свеце. Што нашы сённяшнія *нечытачы* супраць гэтай арміі!

— Калі вы гаворыце цікавы, то маеце на ўвазе...

— Я маю на ўвазе цікавы ў самым шырокім значэнні гэтага слова. Цікавы сваім сюжэтам. Ці стылем. Ці формай. Сваёй філасофіяй, сваім светабачаннем. Ён можа быць для масавага чытання, а можа быць мала зразумелы шырокаму чытачу, але абавязкова знойдуцца тыя, што яго ацэняць высока. Знойдуцца тыя, каго ён кране, прымусіць задумацца пра нешта вельмі важнае. Можа, нават зменіць іх погляд на ўласнае жыццё, на гэты свет. Цешу сябе надзеяй, што хоць зрэдку гэта будзе адбывацца, дзякуючы, у тым ліку, і часопісу "Нёман".

Гутарыў
Анатоль ДАНІЛЕЎСКІ

Фота Кастуся Дробава

№ 22 12 чэрвеня 2009 г. ЛіМ

Поўная прыгод эпоха

У 2008-м годзе ў выдавецтве Логвінава выйшла кніга Сержа Мінскевіча "Я з Бум-Бам-Літу". З гэтай нагоды — наша гутарка з яе аўтарам — паэтам, празаікам, перакладчыкам і літаратуразнаўцам, які працуе ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.

— Якія людзі і падзеі натхнілі вас на літаратурную творчасць?

— Магчыма, літаратурная творчасць была, кажучы камп'ютэрна-смартфонавай мовай, "ува мне зашыта". Яшчэ ў дзяцінстве, у дзіцячым садку прыдумляў для маёй малодшай сястры Алёнкі казкі. Яна вельмі смяялася ад маіх аповедаў, а вось пра што яны былі — не помню. Здаецца, пра бясконцыя падарожжы і незвычайныя прыгоды маленькага чалавечка Мячарыка, складзенага з двух мячыкаў. У малодшых класах я напісаў байку.

Людзі, якія натхнялі займацца літаратурай... наперш — мая мама. Яна нарадзілася ў Сібіры, беларускую мову не ведала, але, прыехаўшы ў Беларусь, пачала цікавіцца роднай мовай беларусаў. Чытала мне ў дзяцінстве кнігі па-беларуску, сярод якіх былі тамы Янкі Маўра. А падтрымаў мае літаратурныя пачынанні Георгій Штыхаў — вядомы наш гісторык. Ён пачытаў мае вучнёўскія апавяданні і параіў паступаць на філфак. Заняцца ж перакладамі Міцкевіча пераканала мяне нашая выбітная актрыса Галіна Дзягілева. Свет дзіцячай літаратуры "адкрыў" для мяне мой сын Адам. Што ж наконт пісьменнікаў-натхняльнікаў — гэта той жа Янка Маўр, пасля Адам Міцкевіч. Прыгадаю паводле ўзроставай шкалы: Чукоўскі, Андэрсен, Хармс, Бёрнс, Стывенсан, Кэрал, Ільф і Пятроў, О'Генры, Караткевіч, Набокаў, Лем, Азімаў, Шэклі, Брэдберы, браты Стругацкія, Толкіен, Герберт, Разанаў, Акудовіч, Эка... Можна заўважыць, што ў літаратурных прэферэнцыях назіраецца "сумяшчэнне прыемнага з карысным"...

— Што для вас значыць фармальнае ўвасабленне верша? Наколькі значны змест, напрыклад, у вашых фігурных вершах (у форме акна, банана-Байкала, чарвяка), магічных квадратах, паліндромах?

— Форма — візуальная прастора паэзіі. Калі мы жывём у чатырохмернай час-прасторы, то паэзія сумяшчае шэсць прастораў: гукавую, сэнсава-свядомую, пачуццёвую (імгненнае і пазнейшае адчуванні), візуальную, кніжна-гістарычную (усе дачыненні да папярэдніх тэкстаў) і прагнастычную (прароцтва, прадбачанне, папярэджанне). Безумоўна, у розных вершах адбываецца спалучэнне і скрыўленне гэтых прастораў, напрыклад, у філасофскай лірыцы дамінуе сэнсава-свядомая, у інтымнай лірыцы — пачуццёвая. У візуальнай — натуральна, візуальная прастора. Яна прачыняе чытачу розныя ўзроўні зместу.

— Якую творчую каштоўнасць для вас мае ваша дзейнасць як "зрухара, рэаніматара і верніка" Бум-Бам-Літа?

— Я лічу, што слова "рэаніматар" у гэтым шэрагу не да месца. Бум-Бам-Літ — гэта рух. А як можна рэаніміраваць рух? Гэта плынь, радыёхваля, якая, аднойчы згенераваная, бясконца вандруе па Сусвеце. Калі творчую дзейнасць чалавека можна класіфікаваць па яго асабістых перыядах, то мой удзел у Бум-Бам-Ліце — гэта выдатная, поўная прыгод і творчай энергіі эпоха — скарб задумак, асацыяцый, назіранняў. У маёй кнізе "Я з Бум-Бам-Літу" гэта адлюстравана.

— Раскажыце пра сваю містычную сувязь з Адамам Міцкевічам і пра тое, як вы выклікалі яго дух.

— Гэта была не містыка, а містэрыя. Не спірытуальны сеанс, а рытуальны. Мы выклікалі дух паэта на яго дзень нараджэння ў Доме літаратара. І ён праступаў у яго вершах і перакладах на беларускую мову, у рамансах на яго словы. А калі на Лысай гары з удзельнікамі "Літаратурнага прадмесця" на Дзяды мы выклікалі духі і Міцкевіча, і іншых беларускіх пісьменнікаў, то ўмоўна прытрымліваліся абраду гэтага народнага свята, вядома ж, імправізуючы. Магу сцвярджаць: ён з намі тады быў — мы гэта адчувалі.

— Якая мастацкая ідэя закладзена ў разглядзе асобных частак цела чалавека і яго рэчаў у вашых празаічных "абсурдэльках"?

— Кожная частка чалавека ды яго рэч могуць шмат паведаміць пра свайго ўладальніка — узгадаем "дэдуктыўны метад" Шэрлака Холмса. У гэтых абсурдэльках вядзецца вышук характэрных і прыхаваных рыс як асобнага чалавека, так і асаблівасцей грамадства ўвогуле.

— Наколькі прыдатны метад транслагізму для паэзіі?

— На пяцьсот працэнтаў. Слова "метад" у гэтым выпадку выкарыстоўваецца ў старажытнагрэчаскім, першасным значэнні: шлях мыслення. Фактычна паэт прапаноўвае чытачу траекторыю палёту думкі па ўсіх прасторах паэзіі, па ўсіх узроўнях тэксту-свету. Хаця чытач можа і не прытрымлівацца гэтай траекторыі, можа сам сабе абраць, як ён хоча лётаць... і ўвайсці ў піке ці "штопар"...

— Ці ёсць у вас дэвіз або афарызм, які натхняе на подзвігі?

— Яшчэ са школьных гадоў: "Жыццё без прыгодаў — нецікавае."

— Ці верыце вы ў жыццё пасля смерці? Як дасягнуць бессмяротнасці?

— Веру. Як спяваў Высоцкі, "добрую рэлігію прыдумалі індусы". Мы тым ці іншым шляхам рэінкарнуемся. І прытым кожны сам сабе выбірае такі шлях, нават стварае, пракладае яго. Тэорыя транслагізму, калі яе пашырыць з тэкставай прасторы на нашу час-прастору, падказвае, што гэта так і ёсць. Што датычыць бессмяротнасці, то спачатку трэба высветліць, якой бессмяротнасці дасягаць. Калі гэта бессмяротнасць у памяці людзей — то ёсць два класічныя спосабы. Першы: зрабіцца знакамітым добрымі ўчынкамі, другі — прыдбаць славу Герастрата. У такім выпадку я аддаю перавагу першаму. Што датычыць бессмяротнасці духу — то дух і так бессмяротны. Калі бессмяротнасці розуму — то я спадзяюся на навуку, якая здолее праз колькі дзесяткаў гадоў перапісваць розум індывідууму ў электронную ці кванта-фізічную версію; што датычыць фізічнай бессмяротнасці — з поўным захаваннем цела, душы, розуму — то спадзяюся на медыцыну (з дадаткам геранталогіі). Я ўпэўнены, што чалавек неўзабаве зможа нашмат падоўжыць працягласць свайго жыцця, а потым зробіць яго анлімітным. Чаму так? Таму што смерць — вынік эвалюцыі — гэта свайго кштальту метад спроб і памылак. Ты — індывід — пажыў і дай пажыць іншаму, можа, твой наступнік будзе болей прыстасаваны да вонкавага асяроддзя і, можа, разумнейшы. Хто запусціў ці што запусціла гэты механізм — пакуль невядома, але гэты эвалюцыйны механізм вёў менавіта да ўзнікнення моцнага чалавечага розуму. І ёсць такое самаўпэўненае меркаванне, што справу эвалюцыі чалавека наш розум ужо можа ўзяць на сябе — мы ўжо можам выпраўляць некаторыя генетычныя адхіленні чалавека, вырошчваць новыя органы, вялікія перспектывы адкрываюць ствалавыя клеткі... Калі цяпер кажуць, што прыйшоў канец эпохі мадэрнізму, настала эпоха постмадэрнізму, то варта казаць, што настала альбо наступае эпоха постэвалюцыі (маецца на ўвазе адпрыродная эвалюцыя).

Таццяна БАРЫСЮК

На здымку: супрацоўнікі аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры НАН Беларусі: А. Вальчук, Ж. Шаладонава, У. Мархель, С. Скамарохава, Т. Барысюк, С. Мінскевіч. 2005 год.

Фота з архіва аўтара

Каго ўзносіць Праметэяў дух?

Неяк тэлефоннае "алё" данесла жаданне чалавека сустрэцца і пачуць маё стаўленне да яго твораў. Неўзабаве мы сустрэліся з паэтам пенсійнага ўзросту. Ён прапанаваў мне аж дзве кніжкі. Вядома ж, кожны аўтар чакае станоўчага водгуку, інстынктыўна адчувае неспакой за сваю творчасць.

Назва кніжкі "Пад зоркай Мілавіцай" загадкава-інтрыгуючая. Фрагмент карціны Батычэлі ўпрыгожвае вокладку. Так і павінна быць! Чалавека сустракаюць па адзенні, і кніжку — таксама.

У першым шасцірадкоўі ўгадваецца інтанацыя "Веранікі" М. Багдановіча, затым яна абрываецца. Было б толькі на карысць аўтару прайсці дарогай класіка, але гэтага не адбылося.

Дамінантай у кнізе выступае каханне. Але тэма кахання асабліва адчувальная ў творчасці маладых. Пра каханне напісана даволі шмат, і сказаць пра яго па-мастацку вельмі складана. Наўрад ці чытач адчуе ў кнізе глыбіню пачуцця, знаёмага Рамэа і Джульеце, Трыстану і Ізольдзе, Энею і Дзідоне.

Ды на вуснах, як пячатка
Твой апошні пацалунак.

Праклюнулася метафарычная завязь, хаця можна было б "апошні пацалунак" замяніць ёмістым свежым эпітэтам. А вось малюнак прыроды:

І ўжо лаўлю. Лісцёвай кучай
Падаўся мне вячэрні бэз.

І тут аўтару не ўдаецца галоўнае: прыпыніцеся, і вы адчуеце, як казыча нос духмяны водар бэзу, асабліва імжыстым адвячоркам...

Гартаючы старонкі, чытач дамыслiць, што ў кнізе намалявана змроеная перспектыва быць паэтам, калі душу маладзёна сагравае прамень надзеі здабыць права на прапіску ў паэзіі.

А цяпер давайце паразважаем, што ж такое паэзія? На гэтае пытанне так выказаўся наш класік Янка Купала: "Праўду з няпраўдай, цноту з гарэзіяй, вымешай спрытам, будзе паэзія". Гэта на першы погляд, а на самай справе: з якім спрытам? Паэт — не слесар, які ўцяміў: гайка закручваецца ўправа...

Літаратура — гэта навіна, вынаходніцтва! Яна абавязвае творцу да пастаянных пошукаў, дзе трэба ўвесь час звяраць сваю працу з досведам класікаў, сапернічаць з імі і з прыродай. Рэмарк калісьці сцвярджаў, што літаратура, гэта дзевяноста дзевяць працэнтаў поту і адзін працэнт натхнення. Творца ўхопіцца за гэты адзін працэнт і, натхнёны пошукам, уцячэ з гарадскога тлуму ў абдымкі прыроды, каб папоўніць запас ураджанняў, вышукаць ідэю і тэму, падслухаць жыццё і час.

Ізноў ходзячы па снатворных куплетах, чытач заўважыць, як выразна выступаюць моўныя хібы, як расцякаецца слоўная вадзіца, а на ёй разышлася плыткая думка каляровымі плямамі, як салярка на вадзе.

Эх узняць бы
Ды абняць бы
Ружашчокую лілею!

Трэба: ружовашчокую. "Нехта будзе рады мужам" — мужу. Рыфмуецца: жаўток — закуток. А ёсць слова "закутак". А дзе паэзія ў выразах: "крыламі махае", "халодны снег", "жоўтай лейкай", "на подыуме — маладыя дзяўчаты", "дыміць на вугалях", а трэба: на вуголлі. Так скажа кожны, толькі не паэт, бо творчы чалавек крыху іншы.

Вёрстка вершаў нагадвае карданны вал, шрыфт — бляклы курсіў, нечытэльны, строфы рознага памеру і рытму. Хаатычнае чаргаванне націскных і ненаціскных гукаў яе ўкладваецца ў паняцце рытмічнага акцэнтнага твора. Цяпер акіньце позіркам тэхнічныя дадзеныя кніжкі, і ў вас упадзе лірычны настрой: "карэктарка" (трэба — "карэктар"), "друк аўсетны", "папера аўсетная", ёсць слова — афсетны. І такога зелля назбіраеце не адну цялежку.

Калі аналізаваць мясцовую літаратурную творчасць, то з усёй плеяды літаратараў яскрава вылучаецца самабытная паэзія Аляксея Белага, якая прасякнута пафасам сённяшняй рэчаіснасці, вершы Мікалая Зайцава з яго іскрамётнымі палымянымі вобразамі прыроды. Сярод празаікаў плённа працуе Аляксандр Галькевіч.

Яшчэ варта спыніцца на вандроўнай паэзіі Юры Мацюшкі. Яго вершы церабілі горныя пуцявіны, купаліся ў Карэльскай увішнай быстрыні, адчулі смак дажджу і ветру нават тады, калі "солнце исчерпало свою ласку". Вадаспаднае рэха цясніны адбіваецца ў радках:

Приближают вершины
вселенную к нам.
А в порогах...
Не знаем причины...
Там ревущие струи летят
по камням,
Пены много, а небо с овчину.

Было б грэшна не згадаць нашых паэтаў, якія ўпэўнена падымаліся на Парнас, але заўчасна сталі часцінкай вечнасці: В. Ігнаценка, Г. Гапановіч, В. Бутрым, Л. Львоў ды іншыя.

Паэзія не любіць паспешлівасці, абыякавасці, не даруе легкадумных рашэнняў і не церпіць спакою. Неабходна — тварыць! І гэтыя выніковыя радкі павінны пакласці ў аснову прыхільнікі прыгожага пісьменства.

Мікола БУСЬКО
г. Баранавічы

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў гісторыі беларускай літаратуры з'яўляецца тым перыядам, калі пасля пакутна-трагічных і вынішчальных 1930-х гадоў і Вялікай Айчыннай вайны пачаў фарміравацца новы склад пісьменніцкай супольнасці. Ў літаратуру прыйшла моладзь з франтоў і партызанскіх атрадаў, з вялікім досведам ваеннага жыцця, што прадвызначыла яе асноўную тэматыку на многія гады. У сваім выступленні на першым пасляваенным пісьменніцкім пленуме ў 1945 г. М. Клімковіч адзначыў: "...на пленуме прысутнічае моладзь, якая не была на папярэдніх пленумах, якая прыйшла ў літаратуру ў часе вайны, унесла ў яе сваю плынь, свой вопыт назіранняў і маладой творчасці, свой задор. Старыя літаратары павінны ўключыць іх у літаратурнае жыццё, павучыць іх прымаць актыўны ўдзел у будаванні пісьменніцкай арганізацыі, у арганізацыі яе творчай работы. За гэтыя гады мы згубілі вельмі шмат літаратурных майстроў, багатых вопытам, — Купалу, Бядулю, Чорнага, Мурашку, Самуйлёнка, згубілі шмат таленавітых маладых пісьменнікаў". Многія, хто прысутнічаў на тым пленуме, ведалі, што за гэтымі фразамі не толькі мартыралог вайны, а і імёны Максіма Гарэцкага, Адама Бабарэкі, Міхася Чарота, Алеся Дудара, Міхася Зарэцкага, Васіля Сташэўскага, Анатоля Вольнага, Тодара Кляшторнага, Ізі Харыка і яшчэ многіх таленавітых беларускіх літаратараў, якія трапілі пад рэпрэсіўны малох 1930-х. Сапраўды, трэба было «будаваць пісьменніцкую арганізацыю», будаваць наноў, а не проста адбудоўваць. Асноўны цяжар гэтага будавання выпадаў на моцна парадзелыя шыхты старэйшага пакалення пісьменнікаў. Важная роля ў арганізацыі літаратурнага жыцця пасляваеннай Беларусі адводзілася Якубу Коласу.

Якуб Колас і дзейнасць ССП БССР



Адной з асноўных гістарычных крыніц у даследаванні падзей літаратурнага жыцця таго часу служыць архіўны фонд № 78 Саюза пісьменнікаў БССР, які зберагаецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Захавалася грунтоўная колькасць дакументаў, да якіх варта звярнацца, каб узнавіць рэаліі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Перш за ўсё, гэта стэнаграмы з'ездаў, пленумаў, пратаколы пісьменніцкіх сходаў, пасяджэнняў прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў, літаратурных секцый, а таксама творчая перапіска, планы, справаздачы і інш. У гэтым кантэксце вялікую цікавасць уяўляюць тэксты выступленняў Якуба Коласа на некаторых пісьменніцкіх форумах. Адразу адзначу, што многія з іх вядомыя і пазней увайшлі ў зборы твораў. Дакументы фонду Саюза пісьменнікаў, тым не менш, адыгрываюць важную ролю ў далейшай працы над тэкстамі Якуба Коласа: стэнаграмы з'ездаў і пленумаў занатавалі іх без правак і купюр, хоць і не без тэхнічных памылак. Першым у храналагічным шэрагу стаіць выступленне Якуба Коласа на першым пасляваенным пленуме ССП БССР, які адбыўся 27—30 снежня 1945 года. У часопісе «Полымя» (№ 11—12. 1945 г.) у рубрыцы «Хроніка» гаворыцца пра тое, што менавіта Якуб Колас адкрыў пленум і прыводзіцца некалькі радкоў з яго ўступнага слова.

Якуб Колас быў старшынёй, адкрыў і вёў агульны рэспубліканскі сход пісьменнікаў Беларусі 12 чэрвеня 1947 г. Пратакольная стэнаграма не фіксуе выступленняў ці заўвагі старшыні сходу, але яна дастаткова дакладна падае тэксты многіх выступленняў, перадае агульную атмасферу сходу. Якуб Колас аб'явіў і слухаў даклады М. Клімковіча, А. Эльмана, В. Барысенкі, М. Лынькова і іншыя.

Якуб Колас прыняў удзел і ў першых пасляваенных з'ездах пісьменнікаў: другім 1949 года і трэцім 1954 года. Захаваліся стэнаграмы яго выступленняў. Прамовай Якуба Коласа быў адкрыты 2-гі з'езд ССП БССР. Збор твораў падае гэтае выступленне цалкам. І толькі ў канцы тэксту, у тым месцы, дзе Якуб Колас вітае прыбыўшых на з'езд, скарочаны спіс гасцей, адсутнічаюць іх поўныя імёны і не прыводзяцца словы пра аб'яўленне з'езду адкрытым. Па-за ўвагай пераліку імён тэксту збору твораў засталіся К. А. Калечыц (Буйло), Р. Б. Хесін, А. Ц. Канстанцінаў, К. В. Папоў, А. Дз. Дзееў, А. Клёнаў, М. М. Кузько, С. Л. Кір'янаў, Л. Л. Данілоўскі, А. А. Пляшкоў, Я. Л. Усыскіна. У гэтым жа месцы тэксту збору закралася і памылка: стэнаграма прыводзіць прозвішча Папоў-Яшын Аляксандр Якаўлевіч, што адпавядае сапраўднасці, а збор падае псеўданім Яшын і сапраўднае Папоў праз коску, як прозвішчы дзвюх розных асоб. Па зразумелых прычынах выкінута з тэксту імя Сталіна.

Стэнаграма 3-га з'езду зафіксавала: «Пры з'яўленні Якуба Коласа раздаюцца гарачыя апладысменты». Пісьменнік сваёй прамовай адкрыў і 3-ці з'езд ССП БССР. Ён гаварыў пра поспехі беларускай літаратуры і пра «апраўданні ёю высокага даверу камуністычнай партыі і народа», пра шляхі прагрэсу савецкай краіны, пра паэзію, пра крытыку і крытыкаў, цытаваў А. С. Пушкіна. Стэнаграма зафіксавала і радкі яго выступлення, якія пазней у поўны збор не будуць уключаны. Гэта дастаткова вялікая цытата са справаздачнага даклада Г. М. Малянкова на XIX партыйным з'ездзе і яго пазітыўная ацэнка Якубам Коласам.

Якуб Колас уваходзіў у склад прэзідыума праўлення ССП БССР. Захаваліся пратаколы гэтай кіруючай структуры саюза. Але, як правіла, паэт на пасяджэннях не прысутнічаў. Прынамсі, пратаколы зафіксавалі толькі два такія факты: 12 студзеня 1948 г. і 30 чэрвеня 1949 г.

Якуб Колас уваходзіў ці не ва ўсе юбілейныя камітэты і прызначаўся іх старшынёй, абіраўся ў прэзідыумы розных сходаў, у тым ліку з'ездаў, пленумаў ССП БССР. Калі ўлічыць, што ў гэты перыяд Якуб Колас — вельмі актыўны ўдзельнік агульнасаюзных пісьменніцкіх мерапрыемстваў, дэпутацкіх сходаў, працуе ў Камітэце па Дзяржаўных прэміях, Савецкім камітэце абароны міру, да таго ж друкуе значную колькасць твораў, выступае як публіцыст, то можна ўявіць тую фізічную нагрузку, якая нязменна прыводзіла паэта да паступовай страты здароўя. Менавіта гэтая думка ўзнікае, калі гартаеш дакументы ССП БССР 1945—1955 гг.

Якуб Колас уваходзіў у склад прэзідыума праўлення ССП БССР. Захаваліся пратаколы гэтай кіруючай структуры саюза. Але, як правіла, паэт на пасяджэннях не прысутнічаў. Прынамсі, пратаколы зафіксавалі толькі два такія факты: 12 студзеня 1948 г. і 30 чэрвеня 1949 г.

Цікавую старонку фонду Саюза пісьменнікаў ствараюць дакументы пра святкаванне 70-годдзя Якуба Коласа, якое адзначалася ў 1952 г. 8 мая 1952 г. прэзідыум ССП БССР зацвердзіў план мерапрыемстваў да 70-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, які тут прыводзіцца цалкам:

"1. Правесці вялікі агульнагарадскі літаратурны вечар у Мінску, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

2. Правесці літаратурныя вечары Якуба Коласа ва ўсіх абласных гарадах.

3. Правесці літаратурныя вечары, прысвечаныя юбіляру ва ўсіх рабочых клубах, у дамах культуры і хатах-чытальнях.

4. Правесці літаратурны вечар на радзіме паэта, у в. Мікалаеўшчына, з выездам брыгады пісьменнікаў (дакл. тав. Агіевіч У. І.).

5. Прасіць Учпедгіз БССР выдаць плакат "жыццёвы шлях Якуба Коласа" — партрэт Якуба Коласа.

6. Прасіць Камітэт Паліграсветустаноў даць указанні ўсім бібліятэкам аб арганізацыі выставак і дакладаў аб творчасці Якуба Коласа.

7. Прасіць Інстытут літаратуры Акадэміі Навук БССР выдаць зборнік артыкулаў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа.

8. Прасіць Савет Міністраў СССР выдаць паштовыя маркі з партрэтам Якуба Коласа.

9. Прасіць Міністэрства асветы БССР даць указанні школам, тэхнікумам і вышэйшым навучальным установам аб правядзенні вечароў з дакладамі аб жыцці і творчасці Якуба Коласа.

10. Прасіць Савет Міністраў прысвоіць імя Якуба Коласа вуліцы ў Мінску, школе ў Пінкавічах (дзе Якуб Колас настаўнічаў), педвучылішчу ў Нясвіжы (дзе Якуб Колас вучыўся ў семінарыі) і аднаму з клубаў.

11. Прасіць Савет Міністраў БССР перайменаваць Стаўбцоўскі раён, дзе нарадзіўся паэт і знаходзіцца шмат мясцін, звязаных з яго жыццём і творчасцю, у Коласаўскі раён, а таксама ўстанавіць мемарыяльныя дошкі ў Пінкавічах, Пінску і ў Нясвіжы на адпаведных будынках.

12. Прасіць Дзяржаўнае выдавецтва БССР закончыць выданне збору твораў Якуба Коласа да дня нараджэння.

13. Рэкамендаваць ва ўрадавую камісію па правядзенні юбілею Якуба Коласа наступных таварышаў: П. Броўку, К. Крапіву, М. Лынькова.

14. Прасіць Савет Міністраў абвясціць дом у Акінчыцах (цяпер пабудаваны), дзе нарадзіўся паэт, дзяржаўнай уласнасцю з перадачай яго пад мясцовы клуб імя паэта.

15. Прасіць ССП братніх рэспублік адзначыць юбілей Якуба Коласа ў сваіх выданнях.

16. Прапанаваць рэдакцыям «Полымя», «Беларусь», «Бярозка», «Советская Отчизна» і «ЛіМ» — адзначыць гадавіну змяшчэннем адпаведных артыкулаў і іншых матэрыялаў.

17. Арганізаваць цыкл літаратурных радыёперадач аб творчасці Якуба Коласа».

Не ўсё з гэтага плана было магчымым ажыццявіць, але тым не менш, ён уражвае сваёй грунтоўнасцю і прадуманасцю.

Не заставалася без увагі ўдзельнікаў мерапрыемстваў ССП БССР творчасць пісьменніка. На пленумах, з'ездах, сходах пісьменнікаў давалася ацэнка твораў Якуба Коласа. А. Куляшоў высока ацаніў паэму «Рыбакова хата» (Рэсп. сход 24—26 лютага 1948 г.), даклад па аповесці «Дрыгва» зрабіла М. Барсток, па паэме «Новая зямля» — Ю. Пшыркоў (на пашыраным пленуме па пытанні перакладаў беларускай літаратуры на рускую мову ў чэрвені 1951 г.).

Узнікалі сітуацыі, калі на артыкулы Якуба Коласа «рэагавалі» адпаведнымі пастановамі, у тым ліку на старонках друку. Цікавай падаецца гісторыя артыкула Якуба Коласа «Спозненая і дужа нядобрасумленная крытыка» пра паэму М. Лужаніна «Кладкі Градоўскага», які быў апублікаваны 25 красавіка 1950 г. у газеце «Звязда». Абмеркаванне на прэзідыуме ССП БССР 29 ліпеня 1950 г. гэтага артыкула, як і ўласна паэмы, справакавала публікацыя М. Ларчанкі ў «ЛіМе» за 15 ліпеня таго ж года. Слухалі пытанне «Аб рэагаванні Саюза ССП БССР на артыкул М. Ларчанкі, змешчанага ў газеце «Літаратура і мастацтва», у якім даецца адмоўная ацэнка паэме М. Лужаніна «Кладкі Градоўскага» ў той час як артыкул Якуба Коласа аб паэме, змешчаны ў газеце «Звязда», дае станоўчую ацэнку паэме». Пасля спрэчак, у якіх выступілі М. Клімковіч, М. Танк, А. Куляшоў, К. Крапіва, А. Зарыцкі, П. Глебка, М. Горцаў, П. Кавалёў, была вынесена пастанова:

«1. Даручыць газеце «Літаратура і мастацтва» неадкладна рэагаваць на артыкул Якуба Коласа «Спозненая і дужа нядобрасумленная крытыка», змешчаны ў газеце «Звязда».

2. Даць поўную ацэнку паэме М. Лужаніна "Кладкі Градоўскага", улічваючы яе дадатныя і адмоўныя бакі, улічваючы артыкул аб ёй М. Ларчанкі".

Якуб Колас незвычайна востра рэагаваў на ўсе праявы пасляваеннага жыцця народа. Пра гэта сведчаць многія запісы яго дзённіка. Гэта пацвярджаюць і лісты, напісаныя ССП БССР ад імя Якуба Коласа ці падпісаныя ім. Такіх прыкладаў многа. Усё гэта дае магчымасць рэканструяваць многія падзеі таго часу, удакладніць факты і зверыць тэксты, якія па многіх прычынах замоўчваліся альбо рэдагаваліся адпаведна кан'юнктуры.

Ганна МАРКОЎСКАЯ

Беларускі адрас Заменгофа

Ідэя стварэння штучнай мовы вядомая са старажытных часоў, але ў XIX стагоддзі сталі рабіцца канкрэтныя захады па яе ажыццяўленні. Найбольшую ж папулярнасць атрымала штучная мова эсперанта, створаная Людвігам Заменгофам, з дня нараджэння якога сёлета спаўняецца 150 гадоў.

Чаму адбылося так, што ўрач-акуліст па адукацыі ўвайшоў у гісторыю як спецыяліст па мовазнаўстве і стваральнік міжнароднай мовы, што стала вядомай у шматлікіх краінах свету? Растлумачыць гэта можна, мабыць, такім чынам. Л. Заменгоф нарадзіўся ў Беластоку ў яўрэйскай сям'і, дзе размаўлялі на некалькіх мовах — яўрэйскай, польскай, беларускай, рускай... Беласток у гады яго дзяцінства — гэта шматнацыянальны горад, у якім жылі прадстаўнікі многіх нацыянальнасцяў і на вуліцах якога гучалі розныя мовы. Можна было пачуць і нямецкую, літоўскую і нават цыганскую мову. Каб вольна пачуваць сябе з аднагодкамі, трэба было разумець і ўмець размаўляць на некалькіх мовах. Магчыма, мара пра лёгкае паразуменне з прадстаўнікамі розных народаў нарадзілася ў Заменгофа ў дзяцінстве і была прычынай стварэння такой мовы, якая была б зразумелай усім.

Эсперанта грунтуецца на лексічнай і граматычнай асновах еўрапейскіх моў, перш за ўсё — раманскіх. Графіка абапіраецца на лацінскую аснову, слоўнікавы запас налічвае каля ста тысяч выразаў. У аснову граматыкі пакладзена 16 правіл без выключэнняў, што забяспечвае яе прастату і даступнасць для ўспрымання. Заменгоф лічыў, што яна можа быць засвоена без асаблівых цяжкасцяў на працягу адной гадзіны.

Здавалася б, у былым СССР, дзе адной з галоўных задач была рэалізацыя ідэі, увасобленай у лозунгу "Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!", простая для вывучэння міжнародная мова павінна была б стаць папулярнай. Аднак улады разумелі, што вывучэнне савецкімі грамадзянамі міжнароднай мовы патрабавала і яе практычнага прымянення праз выхад на кантакты з "пралетарыямі розных краін". А гэта было вельмі непажадана, таму што цягнула за сабой "магчымае ўздзеянне на савецкіх людзей варожай ідэалогіі". Менавіта таму эсперанта было забаронена ў СССР ў 1938 г. Пакрысе адраджацца мова пачала толькі ў 1955-1956 гг., пасля смерці Сталіна. Асаблівай увагі Заменгоф у пасляваеннай Беларусі не заслужыў. Няма згадак пра яго ў "Белорусской советской энциклопедии", толькі ў 18-томнай "Беларускай энцыклапедыі" ёсць кароценькая інфармацыя.

З боку аматараў эсперантысцкага руху ўсё часцей гучаць прапановы пра ўвядзенне вывучэння эсперанта ў агульнаадукацыйных школах, хаця б на ўзроўні факультатываў. Дарэчы, Людвіг Заменгоф жыў і працаваў на нашай зямлі. Пакуль пра гэта сведчыла толькі мемарыяльная дошка на доме № 5 па вуліцы Кірава ў Гродне. (На дадзены момант у сувязі з капітальным рамонтам дома дошка знятая). Надпіс на ёй паведамляў, што ў гэтым доме з 1893 па 1897 гг. жыў Заменгоф, аўтар эсперанта. Хацелася б, каб у Гродне не абмежаваліся ўсталяваннем мемарыяльнай дошкі, але і назвалі адну з вуліц горада імем гэтага сусветна вядомага чалавека. Падчас працы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне ў 2007 г. удалося высветліць, што Заменгоф не толькі вёў у Беларусі практыку ўрача-акуліста, але і прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і губерні: ён быў прысяжным засядацелем акруговага суда.

Жыццёвы шлях Л. Заменгофа скончыўся ў 1917 г., пахаваны ён на Цэнтральных яўрэйскіх могілках у Варшаве.

Міхаіл ДАБРЫНІН,
прафесар, доктар педагагічных навук

РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне члену Саюза пісьменнікаў Беларусі Даўтатовічу Барысу Дзмітрыевічу ў сувязі з заўчаснай смерцю сына АЛЯКСАНДРА.

Дваццаць пяць зямных гадоў

Са школьных гадоў помняцца чыстыя, крыштальныя радкі вершаў Паўлюка Труса. Прамовіць-прачытаць іх — як крынічнай вады напіцца, як удыхнуць чысціню лесу... Спеўна, спакойна, шчыра, з невычэрпным пачуццём любові. Яго жыццё маланкай шуганула і знікла, пакінуўшы вечнасці дыяменты-россыпы выдатнай паэзіі. Як Адаму Гурыновічу і Максіму Багдановічу, Паўлюку Трусу было адпушчана толькі дваццаць пяць зямных гадоў.

Паўлюк Трус нарадзіўся 6 мая 1904 г. у вёсцы Нізок на Уздзеншчыне. Сям'я жыла, як і большая частка сялян, зусім небагата. Паўлюк часта наймаўся ў пастухі, хадзіў за бараною, вазіў з бацькам лес на сплаў, у дванаццаць ужо мог араць, а праз пару гадоў стаў побач з бацькам у пракосе. Бацькі бачылі ў ім будучага працалюбнага гаспадара, але навакольны бор, цёплая вясновая ралля, росны пастушкоўскі ранак і ўсё, што так напоўнена спевамі прыроды, гадавалі паэта.

Пасля сканчэння пачатковай школы бацька адвёз сына ў мястэчка Узда і ўладкаваў у Вышэйша-пачатковае вучылішча. Тым не менш, гэта не вызваліла Паўлюка ад абавязкаў паўсядзённага вясковага існавання. Не вызваліўся ён ад гаспадарчых і матэрыяльных праблем сваёй сям'і і пасля таго, як паехаў у Мінск, будучы залічаным у Белпедтэхнікум. Усе канікулы праводзіў дома, дапамагаў у нялёгкай сялянскай працы. Свае сціплыя ганарары таксама дзяліў з роднымі: дапамагаў расплачвацца з даўгамі, купляў абноўкі сёстрам, адкладваў на абяцаную бацьку закладку новага дома.

І ўсё ж, гэта была самая шчаслівая пара яго жыцця. Менавіта ў гэты перыяд паэзія стала сэнсам яго жыцця, яго дыханнем і настроем. З вялікім трапятаннем ён убіраў веды і мудрасць лекцый Якуба Коласа, М. Грамыкі, А. Круталевіча, В. Барташэвіча, М. Рыдзеўскага, У. Ігнатоўскага, радаваўся сустрэчам з Янкам Купалам, Ц. Гартным, З. Бядулем, М. Чаротам, Я. Лёсікам. У тэхнікуме яшчэ больш сышоўся з землякамі П. Глебкам і А. Якімовічам, пасябраваў з Я. Пушчам, М. Лужаніным, С. Дарожным, З. Бандарынай і многімі іншымі.

Вучоба ў Паўлюка Труса спалучалася з актыўнай працай у рэдакцыях. Ужо з 1924 г. ён пісаў вершы ў «Радавую рань», «Беларускі піянер», «Малады араты», «Савецкую Беларусь», часцей за ўсё друкаваўся ў «Беларускай вёсцы». У гэты ж час Паўлюк Трус актыўна займаецца апрацоўкай фальклорна-паэтычных матэрыялаў для кампазітараў У. Тэраўскага, Н. Сакалоўскага, Р. Пукста, І. Любана. Сам спяваў у хоры, наладжваў пастаноўкі п'ес, выконваў у спектаклях ролі, маляваў дэкарацыі. Яму не было роўных у працаздольнасці. Гэты каржакаваты вясёлы хлопец з ледзь прыкметнай картавінкай меў зайздросную вынослівасць і за свой кароткі век стварыў неверагодна многа.

У 1925 годзе Паўлюк Трус быў прыняты ў літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». У гэтым жа годзе паэт рыхтуе і выдае ў серыі «Бібліятэка «Маладняка» свой першы зборнік «Вершы». Зусім маленькі, толькі чатырнаццаць твораў, але такі чаканы, выпакутаваны марамі ўсіх папярэдніх гадоў. П. Трус браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці аб'яднання. Раз на тыдзень наведваў паэтычную студыю, дзе слухаў лекцыі А.Бабарэкі, наведваў школы і рабочыя клубы. Увесь вольны час праводзіў у Дзяржаўнай бібліятэцы на вуліцы Савецкай ці ў Пушкінскай. З часу ўступлення ў аб'яднанне творы П.Труса ўсё часцей стануць з'яўляцца на старонках часопіса «Маладняк». З сялянскай упартасцю ён асвойвае ўсё новае, што прыносіць яму жыццё, узнімаючыся на вяршыню сапраўднай паэзіі.

1926 год прынёс змены ў літаратурнае жыццё Беларусі. 26 мая група пісьменнікаў аб'явіла аб сваім выхадзе з "Маладняка" і стварэнні новай літаратурнай арганізацыі "Узвышша". У чэрвені 1926 г. падае заяву аб выхадзе і Паўлюк Трус. Але ён не мог ведаць, што ў хуткім часе пачнецца змаганне за кожнага таленавітага пісьменніка-маладнякоўца. П. Трус вымушаны будзе трымаць адказ перад М. Чаротам і М. Зарэцкім, а пасля атрымае канфедынцыйны ліст ад П. Галавача з просьбай даць пачытаць М. Лужаніну і П. Глебку, а пасля знішчыць: *«Як расцэньваю я факт вашага выхаду? Мне здаецца, што вы не абдумалі свайго паступка сур'ёзна і зрабілі абмылку, якую павінны выправіць зараз жа, выправіць, узяўшы сваю заяву і зданыя білеты назад, г.зн. вярнуцца назад у арганізацыю. Я яшчэ раз кажу, не трэба забываць палітычнай значнасці «Маладняка» як арганізацыі і з'явіцч унутры яе, таксама таго, што перш за ўсё для нас партыя і камсамол, а потым мы пісьменнікі, паэты, трэба ведаць як партыя паглядзіць на наш паступак, раней чым мы зробім яго».* П. Галавач, М. Чарот і М. Зарэцкі, трэба думаць, былі не адзінымі, хто заняўся «перавыхаваннем» П. Труса. Прысаромлены паэт вярнуўся ў "Маладняк".

У чэрвені 1927 года П. Трус атрымлівае дыплом настаўніка сямігодкі. Паўстае пытанне пра ўладкаванне на працу. Цэнтральнае бюро «Маладняка» прапаноўвае паэту рэдактарскую пасаду ў Мінску, але ён нечакана для ўсіх вырашае пакінуць Мінск. Даведаўшыся, што ў Гомелі ёсць вольная пасада сакратара газеты «Новая деревня», ён просіць замацаваць за ім гэта месца. Праз некалькі месяцаў газета была ліквідавана і П. Трус пераходзіць на пасаду загадчыка беларускага аддзела ў газету «Палеская праўда». Акрамя рэдакцыйнай працы, паэт актыўна займаецца асветніцкай справай на Гомельшчыне, тады толькі-толькі далучанай да Беларусі. *«Калі я стаў сустракацца з людзьмі, якія не ведаюць і нават не хочуць прызнаць, што існуе нейкая Беларусь, не гаворачы ўжо аб яе багатым гістарычным мінулым, то гэта яшчэ больш надавала мне ахвоты абудзіць у людзей забытую імі нацыянальную свядомасць, абудзіць сярод іх любасць да Беларусі, у прыватнасці да беларускае мовы і літаратуры»*, — пісаў П. Трус у заяве на паступленне ў БДУ.

> **«Калі я стаў сустракацца з людзьмі, якія не ведаюць і нават не хочуць прызнаць, што існуе нейкая Беларусь, не гаворачы ўжо аб яе багатым гістарычным мінулым, то гэта яшчэ больш надавала мне ахвоты абудзіць у людзей забытую імі нацыянальную свядомасць, абудзіць сярод іх любасць да Беларусі, у прыватнасці да беларускае мовы і літаратуры», — пісаў П. Трус**

Там, у Гомелі, Паўлюку Трусу па-іншаму бачацца многія падзеі, што адбываліся у Мінску. Пастаялеўшы, вызваліўшыся ад апекі найбольш актыўных супольцаў «Маладняка» (ці не асноўнай прычынай уцёкаў у Гомель было жаданне вызваліцца ад апекі?), паэт пераацэньвае свае адносіны з «Маладняком». У канцы лістапада 1927 г. ён напіша П. Глебку: *«Цяпер аб «Маладняку». Аб гэтым мне ўжо даўно пісалі. Пісалі, што «Маладняк» рэарганізуецца. Я не ведаю братка, што рабіць. Ты сам добра ведаеш, што я стаю зусім не на платформе «Маладняка». Але мяне прымусілі тады вярнуцца ў «Маладняк». Цяпер я не ведаю, што рабіць. Што я выйду з «Маладняка» -- гэта факт. Але не ведаю аднаго, ці прымуць мяне цяпер ва «Узвышша» пасля таго, як я вярнуўся тады ў «Маладняк». Ты пагавары там з Бабарэкам аб гэтым... І безумоўна, калі я цяпер выйду з «Маладняка», то больш я туды ніколі не вярнуся. Гэта думка была ў мяне і тады, калі мы разам з табою выходзілі. Але мяне прымусілі гэта зрабіць»*. З такой просьбай паэт будзе звяртацца ў лістах да свайго сябра не адзін раз.

З пачатку 1928 г., калі распачалася рэарганізацыя аб'яднання «Маладняк» у Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў, П. Трус, без яго на тое згоды, прызначаецца старшынёй Гомельскай асацыяцыі БелАПП. У лісце да Я. Лімановскага 30 сакавіка 1928 г. ён абуральна напіша: *«Я ніяк не магу пагадзіцца з тым, што я з'яўляюся старшынёй Гомельскае асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Адно тое, што у гэтай асацыяцыі ёсць паэты-гандляры, застаўляе мяне глядзець песымістычна і на ўсю асацыяцыю»*. Яго не пакідае думка вярнуцца ва «Узвышша», ён звяртаецца з лістом да А. Бабарэкі, але адказу не атрымлівае. Зімой 1928 г. ён звернецца і да Я. Пушчы. Пра гэта сведчыць няданя выяўлены ліст Я. Пушчы да А. Бабарэкі, дзе ёсць такія радкі: *"Што тычыцца заявы Труса аб уступленні ў "Узвышша", дык я зараз проста ўстрымліваюся што-небудзь сталае сказаць, — мабыць з гэтага квасу піва не зварыш, — ужо ж раз падвёў, няйначы таму да нас звярнуўся, што ў "Полымя" не папаў. Ва ўсякім выпадку трэба мусіць пачакаць да другой гадавіны, у якую мы толькі паўнамоцны заицвярджаць сяброў"*.

Пара перажыванняў і самоты. У Гомелі П. Трус вычарпаў сябе. Яго зноў кліча Мінск са сваім вірлівым літаратурным жыццём, планаванае паступленне ў Беларускі дзяржаўны універсітэт наспела менавіта цяпер. І зноў да П. Глебкі: *«Я не раз думаў... аб маім паступленні ва «Узвышша». Я лічу больш мэтазгодным (і, па-мойму, гэта будзе зусім правільна), калі я падам заяву ўвосень... Справа ў тым, што, прыехаўшы ў Менск, я думаю як-небудзь з восені залічацца ва універсітэт. Дык вось, каб не было ніякае затрымкі з боку «Маладняка» аб маім залічэнні ва універсітэт, я лічу, што будзе куды мэтазгодней, калі я падам заяву пасля таго, як мяне залічаць у універсітэт. Гэта адно. А другое вось што, калі толькі я цяпер выйду з «Маладняка», то апошні цераз сваіх лідэраў можа павесці такую палітыку, што не дадуць мне дапрацаваць у рэдкадзе да восені»*.

У верасні 1928 г. П. Трус становіцца студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вярнуўшыся ў Мінск, ён атрымаў пасведчанне члена БелАПП і больш не спрабаваў далучыцца да «Узвышша».

Зіма 1929 года была для П. Труса вельмі цяжкай: жыллёвая неўладкаванасць, ускладненне адносінаў з многімі сябрамі, матэрыяльныя цяжкасці... Пасля здачы экзаменацыйнай сесіі за першы курс летам 1929 года Паўлюк Трус, як і ў папярэднія гады, выпраўляецца ў вандроўку, гэтым разам па Магілёўшчыне. (Пра сустрэчу з ім у Клімавічах успамінаў пазней П. Пруднікаў). У Мінск ён вярнуўся ў сярэдзіне жніўня. Яшчэ па дарозе дамоў адчуў: штохвілінна мацнеюць сімптомы нейкай хваробы. Хапіла сіл адведаць сяброў, якія адпачывалі ў Ждановічах пад Мінскам. Аднак неўзабаве адчуў сябе зусім кепска і пехатою адправіўся ў горад. У бальніцу прыйшоў сам, з высокай тэмпературай. Аповедамі пра сябе нікога не патурбаваў, назваў толькі прозвішча і імя, прадставіўся студэнтам. Выратаваць юнака урачам не ўдалося — надта позна звярнуўся па дапамогу. Прычынай быў тыфус. Памёр Паўлюк Трус 30 жніўня 1929 года. Яго смерць цяжкім горам адгукнулася ў сэрцах усіх, хто яго ведаў. У ганаровай варце ля труны паэта стаялі Янка Купала, Якуб Колас, З. Бядуля. К. Крапіва, Ц. Гартны, М. Чарот, А. Александровіч, М. Лынькоў, К. Чорны, М. Гарэцкі, прадстаўнікі ЦК КП(б)Б. Газеты надрукавалі прачулыя некралогі і жалобныя словы ад Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, аб'яднанняў «Узвышша» і «Полымя».

Ён паміраў «не самотным», меў дзве кніжкі: «Вершы» і «Ветры буйныя». У яго асірацелым пакоі ў Мінску застаўся архіў і бібліятэка, самаахвярна збіраная маладым паэтам. Архіў быў немалы: рукапісы твораў, лісты родных і сяброў, фотаздымкі. Быў сярод рукапісаў рыхтаваны П. Трусам і трэці зборнік, які паэт меўся назваць «Чырвоныя ружы»...

Ганна ЗАПАРТЫКА

Адкрыты маладзёжны конкурс

У адпаведнасці з загадам Міністра культуры Рэспублікі Беларусь у 2009 годзе праводзіцца адкрыты маладзёжны конкурс на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы.

Конкурс праводзіцца ў горадзе Мінску. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца паўналетнія грамадзяне, узрост якіх на момант падачы заявы на ўдзел у конкурсе не перавышае трыццаць аднаго года.

Для ўдзелу ў конкурсе аўтары накіроўваюць у Дэпартамент па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск) з пазнакай "На конкурс": заяву па ўстаноўленай форме; літаратурны сцэнарый мастацкага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы, у двух экземплярах; копіі старонак пасведчання асобы заяўніка, нацыянальнага пашпарта грамадзяніна замежнай дзяржавы, якія ўтрымліваюць звесткі аб прозвішчы, уласным імя, імя па бацьку, даце і месцы нараджэння, рэгістрацыі па месцы жыхарства альбо па месцы знаходжання заяўніка.

Літаратурны сцэнарый павінен быць дасланы на папяровым носьбіце ў фармаце А 4 (на адным баку аркуша, шрыфт Times New Roman (Times New Roman Cyr), звычайны, памер не меней як 14 пунктаў, інтэрвал між радкоў — двайны).

Прыём конкурсных заяў — па 30 верасня 2009 года. Заявы, якія прадстаўлены пазней гэтай даты, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца. Днём прадстаўлення конкурсных заяў, якія перасылаюцца па пошце, лічыцца дата іх адпраўлення (па даце паштовага штэмпеля месца іх адпраўлення).

Літаратурныя сцэнарыі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца з 1 кастрычніка па 30 лістапада 2009 года, іх абвяшчэнне і ўзнагароджанне пераможцаў пройдзе 17 снежня 2009 года ў рамках мерапрыемстваў па святкаванні Дня беларускага кіно.

Пераможцам конкурсу ўручаюцца адпаведныя дыпломы і грашовыя прэміі ў памеры: адна першая — 40, адна другая — 30, адна трэцяя — 20 базавых велічынь.

Кантактныя тэлефоны арганізацыйнага камітэта конкурсу:
(017) 204-86-08;
(017) 209-43-86.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3339
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 10.06.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3085

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686